***Да 20-годдзя***
***літаратурнага клуба***
***«Ветліца»***

**Адраджэнне Вера Еднасць**

# ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ АЛЬМАНАХ

**Выпуск 9**

**Мінск БДТУ**
**2019**

Аўтар ідэі, складальнік,
кіраўнік праекта, адказная за выпуск
**Н. Я. САВІЦКАЯ**

**Рэдакцыйная рада:**

Старшыня: Н. Я. Савіцкая, старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі, педагог-арганізатар, кіраўнік літаратурнага клуба “Ветліца”

Члены рады:
Р.В. Міксюк, старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі;
студэнткі факультэта прынттэхналогій і медыякамунікацый:
Когут Дар’я, Прусевіч Валерыя, Пятрова Яўгенія, Самсановіч Дар’я, Трошка Кацярына, Фядосенка Інга, Хваленя Святлана

Набор нот для “Акавіты” зрабіла студэнтка факультэта прынттэхналогій і медыякамунікацый Мінчык Юлія.

Літаратурна-мастацкі альманах “AVE-9” – гэта зборнік твораў розных аўтараў, у якім змешчаны вершы на беларускай, рускай і замежных мовах, пераклады, празаічныя і публіцыстычныя творы і літаратуразнаўчыя матэрыялы, студэнцкі фальклор у якасці рэкламы БДТУ, матэрыялы да 25-годдзя вакальнага ансамбля выкладчыкаў і супрацоўнікаў «Акавіта», з якім літаратурны клуб знаходзіцца ў творчым тандэме, творы, фатаграфіі і хроніка найбольш значных падзей 2015–2019 гадоў, звязаных з дзейнасцю літаратурнага клуба “Ветліца”, заснаванага пры кафедры беларускай філалогіі ў 1997 годзе.

Выпуск прысвечаны 20-годдзю дзейнасці літаратурнага клуба.

Упершыню наладжаны сувязі клуба з Цяньцзіньскім універсітэтам замежных моў (КНР) і пададзены пераклады сучасных кітайскіх празаікаў на беларускую мову.

© УА “Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт”, 2019

# ЗМЕСТ

*АД СКЛАДАЛЬНІКА* ........ *9*

*ПАЭЗІЯ* ........ *12*

**Галіна АБАЛОНІНА**
Малая родина. Времена года. Внуку. Я болею. ***Вершы*** ........ 12

**Анастасія АСТАПОВІЧ**
Она. ***Верш*** ........ 13

*Госць клуба* **Міхась БАШЛАКОЎ**
«Край дзяцінства, ты самы дзівосны!..». «Радзіма…». «Зоркапад…». «У бярозавай бялюткай хаце…». «Яна плыла, як белы лебедзь…». «Які сёння вечар барвовы…». «Мылі дзеўкі ў Іпуці ногі…». Не знікай з небасхілу майго. «Росны ранак. Травы. Сонца…». Іван-чай. Песня. Не роўня. Пракрычала сойка. «Я гэту самотную цішу…». Credo. «Айчыну не кляніце…». «Вечарэе, вечарэе…». Тры лікі любові. ***Вершы*** ........ 13

**Дар'я ГАНЧАРЫК**
«Калі прыйдзе май, зацвітуць сады…». «Дакрануся далонню я да твару твайго…». «Ты заўсёды бяжыш, заўсёды спяшаеш…». «Не хачу без цябе прачынацца…». «Паглядзі мне ласкава ў вочы…». Пасажыр. «Радзіма мая, ты – шлях мой бясконцы…». ***Вершы*** ........ 19

*Госць клуба* **Аксана ГАРАВЕНКА**
«Птица белая крылатая…». «Не вспоминай меня и … не забудь…». «Мне легка моя грусть и знакома…». «У птиц опять прошло собранье…». «Цветы каштана белым садом…». «Дела как пыль, наносит время…». Чудо света. «Из слов сочились капли яда…». «Того, что хочешь – просто нет…». Чаяния человека. Слова. Фитнес-стрейчинг знанье. Муза. «Как недоступность утешенью…». «Ты будь счастливой версией себя…». ***Вершы*** ........ 21

**Аліна ДУДОЙЦЬ**
Что может скрыть любовь? Ураган. Ветер прошептал: «Разлука…». Послушай. ***Вершы*** ........ 26

**Міхаіл ДЗЯДЗЕНКА**
Ящик Пандоры. Потому что есть ты у меня. De amor. Верни мне мечты. Напои меня своей душой. Может быть. Костры любви. Прости… Глаза. Зачем нужна нам всем война? Жить без тебя. ***Вершы*** ........ 29

**Карына КАРАЛЕНЯ**
Сардэчна запрашаем! ***Верш*** ........ 34

**Барыс КАРАСЁЎ**
Вечер длинной в мечту. «Тихий вечер настал незаметно…». «Я устал бояться себя…». «Я хочу потеряться в лесах…». Герой. Мысли. «Хватит говорить, что мне делать…». ***Вершы*** ........ 35

**Вольга КОВАЛЬ**
Батлейка. «Хочацца быць загадкай, трохі непаслядоўнай…». «Нам часта бывае няпроста…». «Дождж не дазволіў рухацца…». Ты мне паказаў Парыж. «Рытмам святло варожыць…». «Неўтаймаваная прага…». «Раблю свае першыя крокі…». «Лета пахне рамонкам…». ***Вершы*** .................................................. 39

**Рэгіна МІКСЮК**
Беларусь. Да роднай мовы. Праз жыццё паэта. Птушынае племя. Зорка-вечарніца. Родной язык. Пухаўніца. Сцяжынкамі Купалы. Палонны. У пііліпаўку. Купальскі дзень. Чаромха. Гаі-гаечкі. Жытніца. Белы туман. ***Вершы, песні***........................ 42

*Госць клуба* **Валерый ПАЗНЯК**
Забралі ў трыццаць сёмым. Давай пасеем жыта. Спадарожны. На футболе. «Цёплы вечар. Акно адчыню…». Прыходзіць час святы. «Асцярожна! Асцярожна!» «І музыкант залётны…». «Прыгожая алея…». «Касцёл чырвоны даўняй забудовы…». «Хай гэта доўжыцца змярканне..». «Пячэ матуля пірагі…». «Пераблытайце вуліцу, горад і век…». «Падары мне Снягурку, зіма…». «Ты ўся з пяшчоты і святла…». «Душа мая затрапятала…». «Цвет залаты цяністай ліпы…». «Нада мною светлы небакарай…». Кветкі. «У краіне цудаў я з табой вандрую…». «Ты мой адзіны абярэг…». ***Вершы***..... 49

**Дзіяна ТАРАСЕНКА**
Устала. Зависть и люди. Красота. Почему бывает жестокою судьба? О том, кого нет. В любви нет главных ролей. ***Вершы*** .... 55

*Госць клуба* **Любоў ЧАРКАСАВА**
Старая хата. Вялікдзень. «Усміхніся вясне, мой каханы…». Забалоцце. «У вёсачцы ціхай…». «Цераз луг шырокі…». «Басаном мы ідзём пад дажджом…». Бадзяга. «Бабулькі ідуць у касцёл…». «Носяцца шпакі за чарвякамі…». У надзейных спадчына руках. Кавалачак шчасця. Крочу я сцяжынкаю лясною. Дзяцел. «Люблю я лясы, бо расла ў Белавежы…». «Коцік сеў пад ёлачку…». «На дзіва сягоння надвор'е…». Зязюля. Вішанька. ***Вершы*** ............ 57

**Арсеній ЧУБАРАЎ**
СМИ. Жажда. Простите. Релаксант. Вдохновение. «Но дай же мне тебя познать!». «Твой нежный голос не даст мне спать…». ***Вершы*** 65

*Госць клуба* **Генадзь ШАРЫ**
Акраверш. Баркулабаўскі лебедзь. Ручнік. Акраверш. Эпілог. ***Вершы*** 69

**Віталія ШЫШКАВЕЦ**
Этажи. «Добрай ночы, сяброўка бяссань…». Вечность не для меня. «Последний снег растаял поневоле…». ***Вершы*** ................. 70

**Кацярына ШЧАСНАЯ**
Ева. Пад абажурам. «У кутках вачэй тваіх…». «Ты ідзеш па вагоне…». «Я бярозка. Расту на ўскрайку лесу…». Мужчынскі грып. Чэхія. Без снегу зіма. Восеньскі кош. «Дзед Антоніа з Сан-Паўлу…». ***Вершы*** .................................................................................. 72

*ПАЭЗІЯ-ПЕРАКЛАД*................................................................ *75*

**Валянціна БАТУРЧЫК** *(Пераклад з нямецкай)*
Долина грёз ........................................................................ 75

**Азіз Хайдар БАХЕД** *(Пераклад з беларускай на арабскую)*
**Якуб Колас** «Краска». **Янка Купала** «Не шукай». **Максім Багдановіч** «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы…» ............ 77

**Мустафа Рыяд Радзі Джабры** (*Пераклад з арабскай)*
Тень призраков ............ 79

**Эджума Гай Роберт ДЭЛАНЕЙ**
*(Пераклад з французскай /Галіна Абалоніна)*
Жизнь – это Одиссея ............ 80

**Мурат КАЯ** *(Пераклад з турэцкай Альпэрэна Чэціна)*
«И ударили барабаны…» ............ 81

**Сергей КАЯНОВІЧ**
«Дзве мовы ёсць славянскія на свеце…». ***Верш***
*(Пераклад на беларускую)* **Антон Дэльвіг** «Раз, адбудзіўшыся ад сну…». «БОГ». «Саваоф». Іван Нікіцін «Ранак». **Аляксандр Пушкін** «Прарок». **Фёдар Цютчаў** «Дзве сілы ёсць» ***Пераклады*** ............ 83

**Джуні РУС** *(Аўтарскі пераклад з французскай)*
Мама ............ 87

**Альпэрэн ЧЭЦІН** *(Пераклад з турэцкай мовы на рускую і з беларускай мовы на турэцкую)*
«Нет даже ни одной…». ***Верш***
**Яўгенія Янішчыц** «Люблю, калі сыдуць marозы».
**Максім Багдановіч** «Я хацеў спаткацца з Вамі на вуліцы…».
***Пераклады*** ............ 88

**Вольга Шахаб** *(Пераклады і вершы)*
«Мамачка. Татка. Братка мой родны…». «Ліпень. Спёка. Жаўрукі ў небе…». «Дождж ідзе, цярушыць дождж…». Калі каліна не цвіла. «Вечар. Цемра. Абрысы згушчаюцца…». «Ветрадуй разгуляўся на славу…». «А ў той час хлапчуковыя вочкі…». «Вясна. Сонейка. Ранак займаецца…». «Ціхую песню матуля спявала…». «Жнівеньскае ржавае нянасце…». Начны роздум. «Мінулага не адпускае памяць…». «Самотны дзень…». «Ценем за цёмным акном…». «Цяжкі подых восені фатальна…». «Як часта мы шануем…». «Падзей калоду нам штодня тасуюць…». «Ядвабным дыванам сняжынкі…». «Хімеры праносяцца ўночы…». «Няцяжка згубіць…». «Стары дзень як змрочны цень …». ***Вершы.*** **Іван Бунін** «Чужая». «За ракой лугі зазелянелі…» ***Пераклады*** ............ 90

***ПАЭЗІЯ-ПЕРАКЛАД-ПРОЗА-ПУБЛІЦЫСТЫКА*** ............ ***98***

**Інэса СКОК**
Ангелы. «Здесь свои законы…». Не смотри в окно.
«Шёпот нежных снов на ушко…». Мне нравится. ***Вершы.***
**Абдул Шахаб «**Природа». ***Пераклад з англійскай***.
Мой асабісты герой вайны. ***Нарыс***
Ангел. Иришка. ***Апавяданні*** ............ 98

## ПАЭЗІЯ-ПРОЗА-ПУБЛІЦЫСТЫКА.......................................105

**Ганна КУМЕЙКА**
У меня есть ты. Мечтай. О важном. Carpediem. Ты цвела, и я расцветал с тобой. Абонент недоступен. ***Вершы***
Мечта. ***Эсэ*** ........................................................ 105

**Анастасія КАЧАМАРАВА**
Не женщина – огонь. К подруге. ***Вершы***
Об огненных птицах. ***Казка*** ........................................ 109

**Паліна НЯХАЙЧЫК**
«Настрой…». «Ці бачыш ты святло, калі ідзеш скрозь цемру?». «Ты бачыў мора?». Маці. ***Вершы***
Обо мне. О Львове и кладбищах. О людях. О Гродно. О Гомеле. О старости. ***Нататкі*** ........................................ 111

**Марыя СЫМОНКА**
«В вечерний сумрак, на заре..». «Всегда, когда мне надо промолчать…». «В ночном полусумраке возле иконы…». «Ты далеко и в тоже время близко…». ***Вершы***
Крёстный. ***Очерк*** ........................................ 119

## СТУДЭНЦКІ ФАЛЬКЛОР.......................................123

*Прадстаўляе* ***Станіслаў Вячаслававіч Грыгарцэвіч***

***Рэклама спецыяльнасцей БДТУ***

ЭКОЛОГИЯ. БИОЭКОЛОГИЯ. Вы планету берегите. Биоэколог. БИОТЕХНОЛОГИЯ. Песня молочного микроба. ХИМИЧЕСКАЯ ТЕХНОЛОГИЯ ПЕРЕРАБОТКИ ДРЕВЕСИНЫ. В мире множество профессий. Бумага. ХИМИЧЕСКАЯ ТЕХНОЛОГИЯ ОБРАБОТКИ МАТЕРИАЛОВ. «Когда мне настала пора…» Песня химика-технолога. ТЕХНОЛОГИЯ ЛЕКАРСТВЕННЫХ ПРЕПАРАТОВ. Мой родной БГТУ. Песня химиков-технологов. О важности резины в жизни человека. ***Вершы***
НЕФТЯНИКИ. МАРКЕТИНГ С ОСНОВАМИ ЛОГИСТИКИ. Реклама краски «ЛКМушка». ***Сцэнар*** ........................................ 123

## ПРОЗА – ПЕРАКЛАД МІЖНАРОДНЫЯ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІЯ СУВЯЗІ 135

**Чжу ЦЗЫЦІН** ........................................ 137
Постаць. ***Апавяданне.***
Пераклад **Фу Мэйянь, Вольгі Шахаб, Юэн Хао**

**Сань МАО** ........................................ 140
Рэстаран у пустыні. ***Апавяданне.***
Пераклад **Лі Мэнья, Вольгі Шахаб, Цуй Шуці**

**Чжан ЦЗЯЦЗЯ** ........................................ 147
Незабыты ліст кахання. ***Апавяданне.***
Пераклад **Фу Мэйянь, Вольгі Шахаб, Хэ Цін**

*ПРОЗА-ПУБЛІЦЫСТЫКА* ........ **156**

**Арцемій МІЦКЕВІЧ**
Ошибки. *Эсэ* ........ 156

**Дзмітрый УЛАСЕНКА**
Запись первая. *Эсэ* ........ 157

*ТВОРЧАЯ АСОБА* ........ **159**

**Вераніка АНДРОСАВА**
«Мне бы звёзды ночные увидеть…» ........ 159

**Вольга ДАНІЛЕВІЧ**
«В отражении снова вижу другую себя…» ........ 165

**Дар'я ЗНАЧОНАК**
Рэдактар як творчая асоба ........ 181

*ВАКАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ БДТУ «АКАВІТА»* ........ **219**

***ДА 25-ГОДДЗЯ «АКАВІТЫ»***

**Надзея САВІЦКАЯ**
Душа просіць песні ........ 219
Душа поет. *Словы* В. Бажыдай. *Музыка* А. Ляха ........ 225
Ах черемуха белая. *Словы* В. Бажыдай. *Музыка* А. Ляха ........ 226
Беларусь мая сінявокая. *Словы* Р. Міксюк. *Музыка* А. Ляха ........ 227
Бывает так. *Словы* А. Станкевіча. *Музыка* А. Ляха ........ 228
Голас Багушэвіча. *Словы* М. Дуксы. *Музыка* А. Ляха ........ 229
Гроздья рябин. *Словы* А. Станкевіча. *Музыка* А. Ляха ........ 230
Грусть по тем глазам. *Словы* А. Станкевіча. *Музыка* А. Ляха ........ 232
Детскому саду № 85 г. Гродно посвящается. *Музыка* А. Ляха ........ 233
Есть имя одно. *Словы* А. Станкевіча. *Музыка* А. Ляха ........ 234
Завадская святочная. *Словы* А. Падгола *Музыка* А. Ляха ........ 235
Красуням Беларусі. *Словы* М. Дуксы. *Музыка* А. Ляха ........ 236
Курсантам ИНБ Республики Беларусь посвящается. *Словы* А. Станкевіча. *Музыка* А. Ляха ........ 237
Милый ангел. *Словы* В. Бажыдай. *Музыка* А. Ляха ........ 238
Рака жыцця. *Словы* М. Дуксы. *Музыка* А. Ляха ........ 239
Яблыня, сонцы, хмурынка, сінічка. *Словы* М. Дуксы. *Музыка* А. Ляха ........ 242

*КРЫТЫКА І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА* .............................. *243*

**Вольга КУЗЬМІЧ**
Паэзія – гэта гаючыя лекі. ***Эсэ*** ............................ 243

***ДА 150-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯДВІГІНА Ш.*** ........................ ***244***

**Надзея САВІЦКАЯ** .............................. 244

Вялікі Беларус ЯДВІГІН Ш. .............................. 244

**Іван ЛЯВІЦКІ**
Успаміны .............................. 245

**Вікторыя ФІЛІПОВІЧ**
Радзіма – ты назаўсёды ў сэрцы маім. ***Эсэ.*** Сучасная беларуская драматургія – брэнд постсавецкай прасторы. ***Артыкул*** ............. 247

*ХРОНІКА* .............................. *250*

**Конкурсы**
Удзел у міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах. Рэспубліканскі конкурс літаратурнай творчасці «Аўтограф-2018». Мы – адны з лепшых у рэспубліцы. Рэспубліканскі конкурс навукова-даследчых і творчых работ «Памяць роду: мінулае вачыма сучаснікаў». Рэспубліканскі конкурс маладых літаратараў «Першацвет». Правядзенне конкурсаў вершаў у БДТУ .............................. 250

**Фестывалі** .............................. 253

**Выставы** .............................. 254

**Навуковыя працы**
Студэнцкія навукова-практычныя канферэнцыі БДТУ .............................. 255

**Канцэртна-прафарыентацыйная дзейнасць** .............................. 256

**Міжнародныя культурна-асветніцкія сувязі**
«Беларусь – Кітай. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт – Цяньцзіньскі ўніверсітэт замежных моў». Беларусь – Польшча...... 257

**Міжуніверсітэцкія сувязі (БДЭУ – БДТУ)** .............................. 257

**Літаратурная гасцёўня** .............................. 258

**Акцыі: «Чытаем разам!»** .............................. 258

**Алімпіяда па беларускай мове** .............................. 263

**Універсітэцкія вечарыны**
Да Міжнароднага дня роднай мовы «Гучы, роднае слова!..». «Моё родны кут, як ты мне мілы…» «Рождественские встречи». Літаратурныя (лірычныя) вечары ў тэхналагічным .............................. 263

**Пасяджэнні літаратурнага клуба «Ветліца», прысвечаныя дню закаханых** .............................. 265

«Не аслабеюць рукі-крылы / Каханне нашае трымаць» .............................. 266

**Публікацыі** .............................. 267

**Рознае** .............................. 268

*ПАСЛЯСЛОЎЕ* .............................. *268*

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Добры дзень, шаноўныя чытачы! Аўтары і выдаўцы рады вітаць Вас новымі творамі. Спадзяёмся, што дзявяты выпуск альманаха “AVE” зацікавіць Вас не толькі сваёй разнастайнай тэматыкай, але і адметнасцю аўтарскага бачання свету, багаццем колераў, адценняў, нюансаў.

Мастацкая літаратура – крыніца эстэтычнай асалоды, магутны сродак выхавання і адзін з самых інтымных відаў мастацтва. Чалавек чытае кнігу часцей за ўсё на адзіноце, калі побач з ім нікога няма: толькі ён і кніга. Кніга будзіць думкі і пачуцці. Застаўшыся сам-насам з кнігаю, хочацца пра многае падумаць, зразумець і сябе, і іншых людзей, асэнсаваць тое, што рабілася вякамі і што зараз робіцца вакол яго. І тут кніга – найлепшы сябар, памочнік і дарадца. Многія гэта адчуваюць інтуітыўна, таму імкнуцца шмат чытаць, а калі пішуць самі, то жадаюць убачыць свае творы надрукаванымі, хочуць паказаць сваё бачанне свету, свае перажыванні, свае гісторыі і прыгоды, свае мары і фантазіі...

Як і ў папярэдніх выпусках, мэта выдання – featuring разнабакова паказаць наш час і нас, такіх розных у гэтым часе і ў той жа час аб'яднаных гэтым часам і месцам пад сонцам – нашым універсітэтам.

Творы, змешчаныя ў дзявятым выпуску “AVE”, – гэта як быццам фотаздымак нашага часу, які застанецца нязменным, а зменлівы час і мы ў ім крочым імкліва наперад у новую цікавую будучыню, якая для кожнага будзе адметнай і непаўторнай, нягледзячы на агульныя ў многім працэсы і ўмовы жыцця. Тое, што было, зменіцца, пачнецца новы адлік часу, а напісанае застанецца.

2019 год – дваццаць другі год дзейнасці літаратурнага клуба “Ветліца”. Гэта дзявятае выданне альманаха, прысвечанае 20-годдзю клуба, як бы падсумоўвае вынікі двадццацігадовай працы, хоць у зборніку змешчаны творы, у асноўным, прэзентаваныя ў клубе за апошнія чатыры гады.

Сталыя аўтары супрацоўнічаюць з клубам амаль 22 гады – гэта Міхаіл Наскавец, Сяргей Каяновіч. Але больш за ўсё дэбютантаў – гэта студэнты 1–4 курсаў, ёсць аспіранты, выкладчыкі, замежныя навучэнцы і госці клуба. Усіх іх аб'яднала любоў да прыгожага слова, жаданне шчыра выказаць свае думкі і пачуцці і падзяліцца імі з людзьмі.

Час змяняецца, змяняемся і мы. Але застаецца вечнае: гэта наша Радзіма, наша мова, наш род. Беларуская мова з'яўляецца гарантам гуманітарнай бяспекі дзяржавы. І шматмільённы беларускі народ мае сакральную рэч – беларускую мову. На жаль, сёння яна не заўсёды з'яўляецца сродкам камунікацыі, а існуе як найважнейшы сімвал нацыянальнай тоеснасці і ідэнтычнасці. Большая частка нашай моладзі так і ўспрымае яе. Таму, у асноўным, студэнты пішуць вершы на рускай мове, але ў многіх ёсць жаданне звярнуцца да беларускай мовы: па-першае, разумеючы неабходнасць у пашырэнні яе выкарыстання, па-другое, адчуваючы яе прыгажосць і мілагучнасць, па-трэцяе, усведамляючы, што яна гарант існавання нацыі і дзяржавы. Гэта разумеюць усе еўрапейцы, ды і не толькі яны. Вельмі шануюць сваю мову і культуру кітайцы і з вялікай пашанай ставяцца да іншых моў, у тым ліку і да беларускай.

У 2017 годзе ў Цяньцзінскім універсітэце (Кітайская Народая Рэспубліка) адкрыты цэнтр вывучэння беларускай культуры імя Якуба Коласа і кафедра беларускай мовы. Выкладчыкі і выпускнікі ўніверсітэта

ўжо працуюць у кірунку міжкультурнага абмену. Наладзіў сувязі з кафедрай і пачаў супрацоўніцтва літаратурны клуб “Ветліца”. У гэтым нумары надрукаваны 3 апавяданні вядомых кітайскіх пісьменнікаў у перакладзе на беларускую мову (”Постаць”, “Рэстаран у пустыні”, “Незабыты ліст кахання”), зробленыя выкладчыкамі, аспірантамі і магістрантамі кафедры беларускай мовы Цяньцзінскага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам Вольгі Васільеўны Шахаб, якая з’яўляецца прафесарам гэтай кафедры і членам літаратурнага клуба “Ветліца”, а раней працавала ў БДТУ.

Вельмі ўразілі выданні літаратурна-мастацкага альманаха “AVE” Аліну Арлоўскую – прарэктара Люблінскага ўніверсітэта Марыі Складоўскай-Кюры (Польшча), якая папрасіла ўсе выпускі альманаха для выкарыстання іх у вучэбным працэсе і выхаваўчай працы.

Міжнароднае супрацоўніцтва наладжана не толькі з Кітаем і Польшчай. Ужо з пачатку свайго заснавання клуб актыўна супрацоўнічае з замежнымі навучэнцамі БДТУ, далучаючы іх да беларускай культуры праз удзелы ў пасяджэннях клуба, выставы, фестывалі, конкурсы, канцэрты, вечарыны, канферэнцыі, акцыі “Чытаем разам!” і інш. Найбольш складанай з’яўляецца праца над перакладамі з родных моў студэнтаў на рускую мову і з беларускай – на нацыянальныя мовы студэнтаў. Вынікам гэтай працы сталі публікацыі уласных вершаў і перакладаў **12 замежных навучэнцаў** у альманахах:

№ 2 (**Аль-Машабех Файсаль з Іарданіі** – уласны верш “Обращаюсь к Вам, Господин Президент”);

№ 5 (**Адэль Хатэм Рашыд з Ірака** – пераклад з арабскай мовы верша Назара Капані “Моей любимой” на англійскую, рускую і беларускую мовы),

№ 7 (**Джон Жолаемі з Нігерыі** напісаў на англійскай і сам пераклаў на рускую мову вершы “Моя родина Нигерия” і “Хорощая женщина”; **Махамід Хамід Кадзім з Ірака** напісаў на арабскай і пераклаў на рускую мову верш “Когда я люблю”; **Лі Сянь Мэй з Кітая** пераклала на рускую мову верш кітайскага паэта Хай Цзы “Лицом к морю на цветущей земле»),

№ 8 (**Джумабаеў Араз з Туркменістана** зрабіў пераклад верша Генадзя Бураўкіна на туркменскую мову; **Хапі Вака Жуніёр з Камеруна** напісаў верш «О женщина, картина на холсте…” на французскай мове, пераклад на рускую мову зрабіла Абалоніна Г. Ф., старшы выкладчык кафедры замежных моў),

№ 9 ( **Азіз Хайдар Бахед з Ірака** пераклаў на арабскую мову вершы Якуба Коласа “Кветка” і Максіма Багдановіча “Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы…”; **Джабры Мустафа Рыяд Радзі з Ірака** напісаў на арабскай і пераклаў на рускую мову верш “Тень призраков”; **Джуні Рус, сапраўднае - Хапі Вака Жуніёр – з Камеруна** напісаў на французскай верш “Мама” і зрабіў пераклад на рускую**; Эджума Гай Роберт Дэланей з Камеруна** напісаў верш на французскай мове “Жизнь – это Одиссея”, пераклад на рускую здзейсніла Абалоніна Г.Ф.); **Мурат Кая з Турцыі** напісаў верш на турэцкай мове “И ударили барабаны”, пераклад на рускую зрабіў Альпэрэн Чэцін; **Альпэрэн Чэцін з Турцыі** напісаў верш на турэцкай “нет даже ни одной…” і пераклаў на рускую мову, з беларускай мовы пераклаў на турэцкую верш Яўгеніі Янішчыц “Калі сыдуць марозы” і Максіма Багдановіча “Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы…”.

Альманах адкрывае рубрыка “Паэзія”, таму што “паэзія – вяршыня мастацкага слова. Веліч народаў вызначаецца веліччу яго паэзіі. Што ёсць у народа самага дасканалага, самага бясцэннага, самага вышыннага? Гэта яго мова. Без мовы народ не існуе. А ў мовы яе вяршыня – паэты” (старшыня Саюза пісьменнікаў Дагестана, народны паэт Магамед Ахмедаў). Каб адпавядаць гэтаму высокаму званню паэта, неабходна многаму

навучыцца. Нашым маладым паэтам цікава слухаць і чытаць старэйшых беларускіх паэтаў, у якіх ёсць узорныя вершы, ёсць высокая паэзія, таму побач са студэнцкімі вершамі ў раздзеле "Паэзія" змешчаны творы вядомых аўтараў, якія могуць стаць прыкладам для пачаткоўцаў.

Тэматыка твораў вельмі разнастайная: гэта тэмы духоўнасці, маральнасці, любові да роднай зямлі і мовы, да маці, многія вызначаюцца высокім эстэтызмам. Безумоўна, тэма кахання – светлага і лірычнага, узаемнага і без узаемнасці, з радаснымі хвілінамі шчасця і адчаем, пакутаю, болем – пераважае ў юных аўтараў. Ёсць творы, прысвечаныя тэмам вайны, родным мясцінам – гарадам і вёскам, дзяцінству, святам, касмічным тэмам і зоркам, анёлам і Богу, пошукам свайго шляху ў гэтым супярэчлівым і, часам, жорсткім свеце. Што больш за ўсё кранае, пра тое і складаюцца радкі вершаваных і празаічных твораў. Некаторыя паэтычныя радкі вызначаюцца яркімі выразамі, думкамі, афарыстычнасцю. Вось некаторыя з іх: **Ганчарык Дар'я** – "Пад тваімі падэшвамі цёплым пяском / Я крокі твае абдымаю; "У жылах тваіх бяжыць маладосць, / За гэта і трэба трымацца"; **Чубараў Арсеній** – "Весь мир – лишь система из многих ситем, / А в этой системе – отсутствие стен!"; **Шышкавец Віталія** – "Скорый поезд покатит тело домой, / Только мысли остались в том месте, / Где, забыв этажи, повидались с тобой. / Были рядом и никогда – "вместе"; "И то ли сердце, то ли мозг вдруг спросит: / А это настоящая любовь?"; **Скок Інэса** – "Не все ангелы белые, / Бывают они и павшие"; "Мне нравится побыть одной, / Лишь так бываю я собой"; **Кумейка Ганна** – "Жизнь – это просто замкнутый круг, / Но в нём есть лекарство от ран"; "И если не хватает сил, / Согрей себя в людских сердцах"; "Живи, пока не зачерствел,/ Лови ярчайшую звезду"; "Не предавай свою мечту!"; "Если ты функция, стану твоим аргументом"; "Ты дарила мне счастье и красоту, / Ты цвела, и я расцветал с тобой"; **Качамарава Анастасія** – "Если сейчас меж нами ледяная вьюга, / Может, потом от пламени бросит в дрожь"; **Няхайчык Паліна** – "Урвіся ў круг заганны, / Сусвету рух паруш!"; **Сымонка Марыя** – "Добро с добром пересечётся – / За всё воздастся всем сполна"; **Андросава Веранікa** – "Мне бы звёзды ночные увидеть"; "Снег – это слёзы ангелов, / Чистые и нежные. / Сыплются градом с облаков / На души наши грешные"; **Данілевіч Вольга** – "Лето застыло осколками, / Воспоминаньями надежд и любви..."; **Караленя Карына** – "В такой простой и милой форме сообщаем, / І хлеб, і соль паклаўшы на ручнік, / Мы ўсіх і кожнага "Сардэчна запрашаем!", / Какой не выберете для себя язык!».

У альманаху змешчаны творы 53 аўтараў (з іх замежнікаў – 11). У раздзелах: паэзія – 18; паэзія-пераклад – 9; студэнцкі фальклор сабраў 1 аўтар; паэзія – пераклад – проза – публіцыстыка – 1; "Акавіта" – 5 аўтараў вершаў і 1 аўтар музыкі; паэзія – проза – публіцыстыка – 4; творчая асоба – 3; проза – пераклад – 5; публіцыстыка – 2; крытыка і літаратуразнаўства – 3; хроніка – 1.

Спадзяёмся, што творы, надрукаваныя ў дзявятым выпуску "AVE", знойдуць водгук у сэрцах і розумах чытачоў, зацікавяць сваёй шчырасцю і разнастайнасцю, прымусяць задумацца над многімі праблемамі нашага часу і шукаць адказы на пастаўленыя пытанні.

Выказваем шчырую падзяку за падтрымку ўсім, хто прымаў удзел у стварэнні гэтага выдання.

Н. Я. САВІЦКАЯ

# *ПАЭЗІЯ*

## *Галіна АБАЛОНІНА*



*Абалоніна Галіна Фёдараўна працавала на кафедры замежных моў звыш 40 гадоў. Выкладала французскую і нямецкую мовы. Зараз на пенсіі. Падтрымлівае кантакты з кафедрай, універсітэтам і літаратурным клубам "Ветліца". Шматразова выязджала ў Германію і Францыю з народным ансамблем "Рунь" у якасці перакладчыка.*

*Цікавіцца тэатрам, літаратурай, музыкай, паэзіяй, піша вершы, займаецца перакладамі.*

### *Малая родина*

Дом не хоромы, скромен, прост.
Цветы, кусты смородины.
Забор, колодец, огород,
Скамейка у родных ворот.
Такая моя родина!

### *Времена года*

*Зима*

Шубкой белою пушистой
Принакрыла всё зима.
И снежинки серебристые
Плетут в небе кружева.

*Весна*

Лес прозрачный, чуть зелёный.
А черёмуха – что хмель.
Первоцветы и фиалки.
А над ними пьяный шмель.

*Лето*

Лето в жёлтенькой косынке
С ароматами цветов,
С земляникою в корзинке,
С свежей зеленью лугов.

*Осень*

Осень в пёстром сарафане
В дрёме сонной замерла.
Паутинки разбросала,
В сердце негу принесла.

### *Внуку*

Что ли он из молока,
А из сливочек бока?
Он такой непрочный,
Этот зуб молочный!

### *Я болею*

Я болею – это минус.
Не учусь – нежданный плюс.
Я реально подчиняюсь.
С новым вирусом борюсь.
Что хочу – всего навалом.
Только маму всё достало.

*Анастасія АСТАПОВІЧ*



*Астаповіч Анастасія Сяргееўна нарадзілася 14 чэрвеня 1999 года ў Мазыры. У 2016 годзе скончыла СШ №5 г. Мазыра. У тым жа годзе паступіла ў БДТУ на спецыяльнасць "Фізіка-хімічныя метады і прыборы кантролю якасці прадукцыі". Яшчэ ў школьныя гады прымала ўдзел у раённых алімпіядах, займалася даследчай дзейнасцю, цікавілася дэкаратыўна-прыкладной творчасцю. Упершыню пачала пісаць вершы ў пятым классе. З кожным годам усё больш і больш удасканальвае свае здольнасці.*

### *ОНА*

Осень. Дождь. Погода не блещет.
Она всё мечтает о нём.
В её сердце чувства всё плещут,
А душа пылает огнём.

Вечера холодные, грустные,
Она всё мечтает о нём.
Настроение у неё стало гнусное,
Чувства над ней провели ход конём.

Читает стихи она несуразные.
И мечтает она всё о нём.
А мечты эти стали опасные,
Но не знает она тот приём,

Что помог бы тот час же избавиться
От нахлынувшей грусти и бед,
От ежедневной тоски оправиться,
Своё счастье найти в обед.

Осень. Сыро. Жёлтые листья.
А она всё мечтает о нём.
Помнит даже как выглядят кисти
И прически небрежной объём.

Осень. Мокро. Гроза. Понедельник.
А она всё мечтает о нём.
Он тот самый любимый бездельник,
Который живёт в сердце моём.

## *Госць клуба*

*Міхась БАШЛАКОЎ*



*Башлакоў Міхась Захаравіч – знакаміты беларускі паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Нарадзіўся 27 красавіка 1951 года ў пасёлку Станцыя Церуха Гомельскага раёна. Закончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, працаваў настаўнікам у Чачэрскім раёне, Расіі, Гомельскім раёне і ў Гомелі. Выкладаў нямецкую і беларускую мову, беларускую і рускую літаратуру.*

*З 1990 года жыве ў Мінску. Працаваў у Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі, у Дзяржаўным камітэце па друку, у Міністэрстве інфармацыі, дзе займаўся падрыхтоўкай і выданнем 145-томнай гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць" гарадоў і раёнаў Беларусі.*

*Шмат падарожнічаў па Беларусі, Украіне, быў у Польшчы і Германіі. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС – не раздумваючы кінуўся ў гушчыню тых сумных падзей. Многа ездзіў, сустракаўся з людзьмі, аказваў маральную падтрымку. Ва ўсіх творах – вершы, паэмы, араторыя – паэт уздымае вострыя і балючыя праблемы нашай рэчаіснасці: лёс Айчыны, народа, роднай мовы, горыч і боль чарнобыльскай трагедыі, пытанні маралі, духоўнасці, гістарычнай памяці. Піша і лірычныя акварэльна-празрыстыя вершы, напоўненыя пранікнёным лірызмам, эмацыянальнасцю, шчырасцю і задушэўнасцю.*

***

Край дзяцінства, ты самы дзівосны!
Сосны. Студня. За жэрдкамі стог.
Гэты кут, што мне дадзены лёсам,
Памяняць бы на іншы не змог…

Дым над комінам пахне Айчынай,
І святочна бялеюць снягі.
Як з крыніцы, з маленства сцяжыны
Выцякаюць мае ўсе шляхі…

***

Радзіма…
Калі ёсць, то назаўжды:
Не знікне,
Не растане шызым дымам.
Яна для нас –
Нібы глыток вады
Для зморанага смагай
Пілігрыма…

Радзіма…
Гэта светлая любоў
Да родных гоняў
За бялюткім гаем.
Яна, як крык
Самотных жураvоў,
Што аж да слёз
Да самых
Працінае…

***

Зоркапад,
За акном зоркапад…
Зоркі падаюць прама ў сад,
Дзе цяжкія вісяць налівы…
Даспявае яблыкам жнівень…

Лістапад,
За акном лістапад…
Жоўтым лісцем засыпаны сад.
Ах, якая пара залатая!..
Восень светлая дагарае…

Снегапад,
За акном снегапад…
Белы-белы заснежаны сад.
Але цепліцца ў сэрцы надзея:
Сад вясною зазелянее…

Так бяжыць,
Так змяняецца час…
Час змяняе прыроду і нас.
Зоркапад…
Лістапад…
Снегапад…
Як цвіце за акном гэты сад…

***

Ў бярозавай бялюткай хаце
Прачнецца песня салаўя.
І будзіць, будзіць мяне маці:
“Схадзі, мой сынку, па каня…”

І я іду, крыху заспаны,
Іду Сярка свайго шукаць,
На лузе пасвяцца туманы,
Каня вось толькі не відаць.

“Сярко, Сярко, – крычу з узгорка, –
Куды ты дзеўся, конік мой?”
Сярко ў траве шукае зоркі,
Што сталі сонечнай расой…

***

Яна плыла, як белы лебедзь,
Над стомай восеньскіх дарог.
Не мог вачам сваім паверыць,
Паверыць я вачам не мог.

Павольна, неяк нават горда
Яна, таемная, плыла.
Здаецца, ўсё паслаў бы к чорту,
Каб за сабою павяла…

У музыку ўплятала рукі,
Пяшчотна, быццам у туман.
Як хвалі, плёскаліся гукі
І песцілі дзявочы стан.

І раптам з гікам лёгкі танец
Рвануў баян на ўсе мяхі…
Закалыхалася дыханне
Грудзей дзявочых, маладых.

Імклівa віхрам, тонкім ценем,
То плаўна і спакойна зноў
Пад гукі стан яе струмніў,
Хмяліў,  як добрае віно…

Яна плыла, як лебедзь белы,
Плыла няведама куды.
І маё сэрца занямела,
Відаць, на доўгія гады…

***

Якi сёння вечар барвовы.
У небе круты маладзік.
І ў гомане светлай дубровы

Губляецца радасны крык.

Гукаю,
гукаю,
гукаю
Ўсё тое, што ў сэрцы бярог.
Ды толькі туман праплывае
Над стомай вясковых дарог.

Крычаць недзе белыя гусі,
З пакосу жанчыны ідуць.
Над белай маёй Беларуссю
Жаданыя зоркі ўстаюць.

***

Мылі дзеўкі ў Іпуці ногі.
Я глядзеў,
З асалодай глядзеў.
Калыхаўся адбітак,
Трывожыў,
Плыў у завадзь
Туманных надзей.

Пагукаць?
Толькі гусі гагочуць…
Пераплысці?
Цячэннем знясе…
А спакусныя дзеўкі
Рагочуць
На пясчанай
Бялюткай касе…

### *Не знікай з небасхілу майго*

Не знікай з небасхілу майго,
Не знікай, мая ясная зорка…
Між самоты, хлусні і трывог
Без цябе адзінока і горка…
Не знікай з небасхілу мойго…

Шэрай птушкай на схіле начы
Ты трапечашся сполашна крыламі.
Не крычы, не крычы, не крычы,
Не палохайся, мая мілая…
Шэрай птушкай на схіле начы…

На світальнай азёрнай вадзе
Серабрыцца твая лілея.
І гайдаецца побач цень,
Як мой лёс і мая надзея…
На світальнай азёрнай вадзе…

Як квітнеюць навокал сады…
Паглядзі… Ты мяне дакараеш,
Што нічога ў жыцці я не маю…
Што ты, любая, ты ў мяне, ты…
Як квітнеюць навокал сады…

На крыжы нашых горкіх дарог
Ты і грэшная, і святая.
Не знікай з небасхілу майго,
Не знікай, я цябе заклінаю…
На крыжы нашых горкіх дарог…

***

Росны ранак. Травы. Сонца.
Птушак, птушак галасы.
Дзяцел стукае. На донцы
Засталіся дзве слязы.

Не для плачу, не для смеху.
Гэта слёзы чысціні.
І вылушчваю арэхі –
Лета выспелыя дні.

### *Іван-чай*

Іван-чай…
Як цвіце іван-чай,
Бы жыцця на выгарах свяча,
На выгарах між соснаў гарыць.
Колькі фарбаў
На гэтай мяжы
Паміж смерцю
І кветным жыццём..
Побач існасць
І небыццё.
Клікну.
Рэха.
Кругі на вадзе.
Скіну смутак,
Як клунак, з пляча.
На выгарах цвіце
Іван-чай…

## *Песня*

За чыгункай, дзе бор залаціцца,
Дзе сунічны настоены пах,
Як самотна пяюць маладзіцы,
Ажно слёзы блішчаць на вачах.

У глушы, у цішы запаветнай,
Ад турбот і маны ўдаліні,
Нібы лёгкі і ласкавы ветрык,
Песціць песня світальныя дні.

Анямелы, з зацятым дыханнем,
Я стаіўся, на ўзгорку прыціх.
Прагрукоча цягнік дальні-дальні,
Заглушаючы песню на міг.

А яна узляціць над дарогай,
Ірванецца услед, нібы птах,
І, напэўна, затым доўга-доўга
Будзе мне саланець на губах…

## *Не роўня*

Цвіцення час…
Ды што табе
Цвіценне?
Пазбаўленая
Розных летуценняў
Ты ганарыста
Профіль свой нясеш…
Халодная праз меру,
Як лядоўня,
Ты кажаш мне,
Што я табе не роўня…
Вядома ж, так.
Я птах,
Я вольны тах…
А ты – ланцуг
Прыгожы
На руках…
Не для цябе
Гучаць мае радкі,
І не цябе
Гукаюць цягнікі…
Твая краса растане,
Нібы дым…
Мае ж радкі
Спатрэбяцца
Другім…

## *Пракрычала сойка*

Пракрычала сойка,
Сойка пракрычала
У асеннім лесе,
Лесе нада мной.
А лісток пажоўклы,
А лісток апалы
Зіхаціць на сонцы,
Свеціцца расой.

Ці ўначы дажджынка
На лісток упала?
Ці  твая гарчынка
Капнула слязой?
У асеннім лесе
Сойка пракрычала,
А пра што, не знаю,
Ў лесе нада мной.

Помніш, як блукалі
У асенніх далях?
І крычала сойка
Ў соннай цішыні.
Мы яшэ не зналі,
Мы з табой не зналі,
Што мінаюць нашы
Залатыя дні…

Вось і ты, як восень,
Зноў засумавала.
Не была даўно ты,
Не была такой…
У асеннім лесе
Сойка пракрычала,
На лісток апалы
Капнула слязой…

***

Я гэту самотную цішу
І гэты нязвыклы спакой
Схаваю ў душу, як у нішу –
Ніхто не крануў каб рукой…

Хоць знаю, што ў шуме і гаме
Нядоўга я іх пранашу,
Калі амаль кожны рукамі
Штодня ў маю лезе душу…

## *Credo*

Не прашу ні пасады, ні славы,
Ні багацця на грэшнай зямлі…
Божа светлы, прашу так замала –
Запаветныя словы пашлі…

Каб шчымелі яны і балелі,
І душу праціналі да слёз.
Каб вятры над шляхамі іх пелі,
Асыпаючы лісце бяроз.

Каб жанчыны ўначы іх шапталі,
Каб на крылах іх птушкі няслі
У чужыя няўтульныя далі
Напамінам аб роднай зямлі.

Зіхацелі каб гронкай рабіны
Тыя словы – пазнаць бы здалёк…
Божа светлы, хай лёс Айчыны
Пасвятлее на мой радок…

***

Айчыну не кляніце,
Не ганьце задарма.
Якая ёсць – любіце…
Другой у нас няма…

І не ламайце рукі,
І не патрэбна слёз.
Радзіма – не прынука,
Радзіма – гэта лёс…

***

Вечарэе, вечарэе…
Сонца коціцца за бор.
Між ялін пацíху тлее
Непагашаны касцёр

Пахне юшкай з свежай рыбы.
Жарты. Смех. Гармонь хрыпіць.
Над вадою чайкі ўсхліпы.
Поўня ў возера глядзіць.

І так добра мне і светла,
Бы крануў крылом анёл…
І чуваць, як у паветры
Лісце падае на дол.

## *Тры лікі любові*

Тры лікі любові –
Тры лікі зямныя:
Матуля,
Жанчына,
Айчына мая…
І Божая маці
Святая Марыя,
Прад лікам якое
Малюся штодня.

Матуля –
Пачатак жыццёвай дарогі.
Каханая –
Мроі і наша вясна.
Як кожнаму доля
Даецца ад Бога,
Радзіма таксама даецца адна.

Тры лікі любові,
Тры лікі спагады
У радасці хмельнай
І горкай бядзе.
І дзе б ні былі мы,
Да родных прысадаў,
Дарога дахаты
Заўсёды вядзе…

Тры лікі любові –
Тры светлыя лікі:
Жанчына,
Айчына,
Матуля мая…
Званоў перазвоны
І кнігаўкі крыкі,
Нібыта маленне
У водсветах дня…

Тры лікі любові,
Як родныя песні,
Што гэтак шчымліва
У змроку гучаць.
Тры лікі –
Тры зоркі
Ў начным паднябессі,
Якія так ярка
Над шляхам гараць…

### *Дар'я ГАНЧАРЫК*



*Ганчарык Дар'я Юр'еўна. Нарадзілася 19 мая 1998 года ў палескім гарадку Ганцавічы. Там жа скончыла сярэднюю школу №3 і ў 2015 годзе паступіла ў БДТУ, на факультэт ТАР. З дзяцінства захаплялася танцамі, спевамі, у тым ліку напісаннем вершаў на роднай мове. Але любоў да роднай мовы з'явілася не адразу, яе памагла прывіць настаўніца ў школе, падчас падрыхтоўкі да абласной алімпіяды, дзе Дар'я атрымала дыплом 3 ступені. У БДТУ актыўны ўдзельнік мерапрыемстваў літаратурнага клуба "Ветліца", чытала свае вершы на вечарынах, конкурсах, літаратурных сустрэчах.*

***

Калі прыйдзе май, зацвітуць сады,
Цёплы дождж у акно заляскоча,
Будучы дзень – гэта будзеш ты,
І ў ім усё будзе так, як мы захочам

І мы будзем гарэць, нібы ўвосені клён,
Будзем марыць, кахаць, усміхацца.
І я буду здавацца к табе, любы, у палон –
Кожны дзень абяцаю здавацца.

Я хачу для цябе стаць апошнім глытком,
Прыгажуняй-вясёлкай у маі.
Пад тваімі падэшвамі цёплым пяском
Я крокі твае абдымаю…

*01.05.2017*

***

Дакрануся далонню я да твару твайго ,
З тваіх вуснаў сарвецца усмешка.
Ты хаваеш у сэрцы жыцця мару майго,
І спрыяеш збыццю так няспешна.

Ты быццам сонейка свеціш мне ноччу,
Я цябе адчуваю заўсёды і ўсюль.
Хвіліна – і ўжо да цябе ціха крочу
Праз цемру і вецер, што побач, паўсюль.

Здаецца, што ты для мяне як світанак,
Ты мой па жыцці надзейны маяк.
Я мару дзяліць з табой кожны сняданак,
Я знаю, што ты самы родны сваяк.

І той, хто бязмежна цябе разумее,
Ніколі не стане чужым, ніяк.

*26.03.2017*

***

Ты заўсёды бяжыш, заўсёды спяшаеш,
Не спыняеш жыццё і не спіш.
Столькі думак, ты вочы свае закрываеш
І ў цемры бязгучна сядзіш.

Пастой і прыслухайся, сціш свае крокі,
Падумай, убач прыгажосць.
Адчуй у грудзях тваіх ціхія скокі –
Так скача твая маладосць.

Спыні на імгненне ўвесь свет, прыглядзіся,
Ты бачыш, як час твой цячэ?
І ў гэтым жыцці, ты глядзі, не згубіся,
Плыві  ў той бяздоннай рацэ.

Пакуль ты гатовы аддаць усё, што ёсць,
Гатовы за шчасце змагацца,
У жылах тваіх бяжыць маладосць,
За гэта і трэба трымацца.

*20.10.2017*

***

Не хачу без цябе прачынацца,
Без цябе мне не адпачываць.
Калі трэба з табой развітацца –
Сэрца тут жа бяжыць сумаваць.

Чым жа ты прыцягнуў мяне, любы?
Чым жа сэрца маё прывязаў?
Пачуцці сплятаюцца ў шлюбы,
Калісьці так хтосьці казаў.

І я веру, што будзем мы разам
Ціхім ранкам пад спевы душы.
Будзем шчаслівыя  тут і адразу,
Пакуль побач цвітуць сады.

***

Паглядзі мне ласкава ў вочы
І заб’ецца ў грудзях мацней сэрца.
Мне так добра бывае ўночы,
Калі  побач любоў твая б’ецца.

Паглядзі мне пяшчотна ў вочы,
І адразу табе я паверу.
Шмат цябе ўспамінаю ўночы,
Вельмі многа між намі даверу.

Паглядзі закахана ў вочы,
Я цябе і без слоў зразумею.
І ў жыцці зраблю так, як ты хочаш.
Я кахаю цябе, як умею.

### *Пасажыр*

Песня колаў у вушах зачаруе,
Позірк у цемру, у далі памкнецца.
Пасажыр той самотны марнуе
Час, што ў сэрцы ягоным заб'ецца.

І яму не знайсці там спакою,
Што ў акне ён адчайна шукае.
І ўсё думае: "Быць мне з табою?
Падкажы..." – ён адказу чакае.

Калі выбар зрабіць ён не можа –
На душы той адны снегапады.
І калі яму хто дапаможа,
Ён бясконца таму будзе рады...

*06.03.2018*

***

Радзіма мая, ты – шлях мой бясконцы,
Ты – у небе крычаць журавы.
Ты – дзе заўсёды свеціць сонца,
Дзе ніколі не знойдзеш зімы.

Тут адпачываю заўжды душою,
Тут адліга ў сэрцы маім.
Заўсёды чакаю сустрэчы з табою,
А потым сумую зусім.

Расплятаеш косы вясною цудоўна,
Пускаеш кругом матылькі.
І промнямі свеціш у твар мой пяшчотна,
І ён тут вясёлы такі.

Матуля, бацькоўскі куток, разумееш
Ты ў сэрцы маім пачуццё?
Я люблю цябе, кожны дзень, як умею.
Назаўсёды тваё я дзіцё...

# *Госць клуба*

## *Аксана ГАРАВЕНКА*



*Гаравенка Аксана Валянцінаўна – кандыдат эканамічных навук, дацэнт, выкладае міжнародную эканоміку ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Яна мае больш за семдзесят публікацый у навуковых выданнях аб праблемах пазнання сутнасці сацыяльна-эканамічных з'яў ва ўмовах глабалізацыі сусветнай эканомікі, аб фарміраванні і развіцці нефармальнай эканомікі і эксапалярных структур, артыкулы па методыцы выкладання міжнарожнай эканомікі ў вышэйшай школе.*

*Кніга «Про Свет» – шостая паэтычная кніга аўтара. Ужо выйшлі ў свет выданні «Наедине», «Встреча», «Шанс», «К лучшему», «В радость», а таксама публікацыі ў часопісах «Неман», «Новая Немига литературная», «Алеся» і ў літаратурна-мастацкім альманаху «AVE». Акрамя таго, на вершы аўтара напісаны шэраг музыкальных цыклаў і сольных музыкальных твораў.*

*Вершы адлюстроўваюць імкненне аўтара да спасціжэння багацця свету ва ўсёй яго разнастайнасці, да прыдбання святла і радасці нашага зямнога быцця.*

***

Птица белая крылата,
Горделива и легка,
И в полете величава,
И в покое велика.

Паучок труслив и тонок,
Неприметен и липуч,
Но, однако же, не жалок
И по-своему везуч.

Он плетет – и в том наука,
И в науке той – секрет:
Много мелкого в природе,
Без чего – и птицы нет.

***

Не вспоминай меня и … не забудь:
Мы не расстались, живы мы с тобою,
Мы где-то рядом продолжаем путь,
Путь, уготованный обоим нам судьбою.

Мы встретимся ещё, иль – здесь, иль – там,
В нас время что-то рушит, что-то – строит,
Жизнь втайне соответствует мечтам,
Пусть говорят, что поздно, что – не стоит…

Не вспоминай меня и… не забудь!
Пускай – как есть: ни дальше и не ближе,
Но только чаще приходи ко мне во сне,
Во сне я многое гораздо лучше вижу.

***

Мне легка моя грусть и знакома,
Мне понятны её тревоги,
Грусть меня ожидает дома,
Когда я нахожусь в дороге.

Грусть меня на пороге встречает,
Лишь заслышав мое приближенье,
Грусть с собою меня сближает,
Находя для меня прощенье.

С ней уместна моя усталость,
Пустота потухшего взгляда,
От неё ни обид, ни жалость –
Ничего мне скрывать не надо.

С ней свободнее льются слёзы,
Облекая в туман печали,
Только с ней отпускаю я грёзы
В недоступные дальние дали.

Грусть поможет, когда ругают,
Не оставит, когда осудят,
С нею сердце моё оттает,
Когда мне ещё хуже будет.

В моей грусти – моё спасенье,
В ней – и горечь моя, и – отрада,
Принесёт она мне прозренье,
Что судьбу мне ругать не надо…

***

У птиц опять прошло собранье
Поверх одной из дальних крыш,
Но всех оставив без вниманья
Там не присутствовал малыш.

Он мрачно не столбе томился,
Комком грустил на проводах,
Но всё же не соединился
Он с теми, кто уж был в годах.

Его в них что-то угнетало,
Он чах  вослед тоске своей,
В нём что-то вовсе не летало,
И не имел он там друзей.

Он даже не искал подруги,
Один подолгу мёрз, сидел,
Он не исследовал округи
И дальних рейсов не хотел.

Он лишь испытывал желанье
Встряхнуть крылами, и в тоске
Вновь погружался в созерцанье,
И стыл, как слёзы на песке.

Его предчувствия томили,
Но в шуме птичьих голосов
Его окликнуть позабыли,
А он хотел лететь на зов.

А он, прищурясь, жаждал света,
Но не хотел спешить к весне.
Не так ли в поисках ответа
Мы замираем в полусне?..

***

Цветы каштана белым садом
Поверх листвы вздымались ввысь,
Им выше листьев было надо
И они вверх неслись, неслись…

Резные ярусы парили
Над бренной вечной суетой,
Не спорили, не говорили,
Не заслоняли мир собой.

Им всем дано было пространство
По одному цвести, взлетать,
И хрупко-белое убранство,
Что оставляет стройной стать.

Они согласной белой стаей
В молчанье холили мечту,
И каждый находил места ей,
И возносил на высоту.

Над каждым цветом свет струился,
Не бередя ничей поток,
Как в храме каждый здесь молился
И воскресал. А ты бы смог?

***

Дела, как пыль, наносит время,
Слоями множатся листы,
И нас самих, и наше бремя
Кто-то наносит на холсты,

Где мы едва видны вначале,
Потом являем свою суть,
Но будем ли видны в финале,
Нам не дано на то взглянуть.

Едва ль мы можем цвет добавить
В то буйство линий, но резон
Нам всё же там свой след оставить,
Вместив его в диапазон

Чужого блеска, в недрах ткани
Окрасить тоненькую нить,
Излить своей крупицу дани
На том листе и окропить

Своим стремленьем бисер пыли,
Его раздвинув по углам.
Мы наяву живём и жили,
Чтобы тот холст  представить Вам.

### *Чудо света*

Мы насыщаем свою жизнь
Толпою, шумом, городами,
Мы проживаем свою жизнь,
Едва поняв, живём ли сами.

Едва ли нас пронзает свет,
Что сквозь глаза стремится в душу,
Мы не стремимся в ряд планет, –
Мы мнём и мнём ногами сушу.

Преодолеть и превозмочь
Мы все стремимся расстоянья,
Но могут ли всерьёз помочь
Чужие лица, звуки, зданья?

Мы страстно рвёмся где-то зрить
Уже восьмое чудо света!
Мы сами чудом можем быть,
Но мысль нам не приходит эта.

***

Из слов сочились капли яда,
Мигал точёно-острый взгляд,
И было что-то явно надо
Достать, исторгнуть. Наугад

Слова дорогу пролагали
В пространстве моего пути
И исторгали, исторгали
Все яд на камни – не пройти.

Но я всё шла, нога ступала
На острый щебень меж камней
И потом яд тот растворяла.
Дорога делалась длинней,

И силы тратились безбрежно,
И жажда догоняла, жгла…
Но знала я – бывает нежно,
За тем, что нежно, я и шла.

Так я слова лишала яда,
С которым слышать их не надо.

***

Того, что хочешь – просто нет,
Но жизнь и без того случилась,
Свой крест никем не был воспет,
Крест – ноша, кара, но – не милость!

Даже любовь, как волшебство,
У нас креста не отнимает,
Кто ж без любви несёт его –
Тому дорогу удлиняют,

Чтобы успел он ощутить,
Как это: долго не любить…

### *Чаяния человека*

Кому-то – ты порой звонишь,
Кого-то – даже навещаешь,
А с кем-то ты в кафе сидишь
И чашку кофе выпиваешь.

Идёшь ты в мир искать людей,
Но – в ветви ты вплетаешь руки,
Чтоб устоять среди затей,
Что люди делают от скуки.

Готов плескать остатки дня
И тратить денежные знаки:
«Признайте вы свои меня!
Своих – чтут кошки! и собаки!»

Вы в свой студёный разговор
Внесите ложечку Гольфстрима,
Вы погасите ею спор
И жажду буйную экстрима.

Позвольте рядом жить и – петь!
Произносите в голос звуки,
Что позволяют посидеть
Не напрягая к схватке руки.

Ужель у дерева стоять
Шепча коре свои признанья?
И от ветвей защиты ждать?
От шума ветра – пониманья?

Нет! Людям надо говорить!
Но – всё труднее кофе пить…

### *Слова*

Словами можно прикасаться –
Слова медлительней, нежней.
Словам не трудно оставаться –
Звучать подолгу, много дней.

Слова – они воспроизводят
Объёмы, запах, вкус и цвет,
Они – сказавшись – не уходят,
Когда сказавшего их – нет.

Слова уменьшить могут бремя,
Слезою могут окропить,
И могут зримо вызвать время,
В котором помогли любить.

Слова – слова, их звуки – звуки,
Но ты протягиваешь руки
И их безмолвно излагаешь,
Ты вдруг их пишешь и – читаешь!

И ощущаешь силу жажды
Без слов оставшись вдруг однажды.
Как влага слово насыщает,
Неназванное – исчезает.
Идут лишь те, кого позвали
Словами! Вы – слова сказали?

### *Фитнес-стрейчинг знанье*

Искрился свет в зеркальном зале,
Чуть слышно музыка плыла,
И жизнь, как будто бы в начале,
Творила души и тела.

Покой продумывал движенья,
Мысль уходила в полусвет,
И в средоточье напряженья
Ты уж не знал – ты есть иль нет…

Рука порой держала стены
И – иногда – пласты земли,
А ноги – зримо откровенны –
Вдруг вверх подняться не могли…

Ты тяжесть ощущал до звона!
Собою ты теснил простор!
Но … молчаливо и без стона
Ты слушал мышц горячий спор.

Они: «Уймись!» – тебя просили
И куда ты хотел – не шли,
Но … в твоём тебе они были…
И вы друг к другу снизошли.

Ты стал ценить своё дыханье
И позы поперёк ковра,
Обрёл ты фитнес-стрейчинг знанье,
Теперь – добавь к нему добра.

### *Муза*

*«Я стал доступен утешенью»*
*Александр Пушкин «Птичка»*

Она приходит из печали,
Подолгу грусть во мне храня,
Даёт описывать те дали,
Куда зовет, ведя меня.

Она приходит из разлуки,
Куда, с собой наедине,
Я ухожу в слова и звуки,
В раздумия: что нужно мне.

Она приходит из вниманья
К проблемам у получерты,
Быть может, вне, помимо знанья
Дарует благость красоты.

Она – в себя переселяет,
Воспламенит – и отпускает…

***

Как недоступность утешенью
Нас угнетает и саднит,
Как призывает душу к мщенью,
Как сердце камнем тяжелит.

Словами кто-то призывает,
Немолчно долго говорит,
Но … смыслом нас не достигает –
Лишь чуть губами шевелит.

Мы – как в ограде – не свободны,
Нам труден к людям даже шаг,
И мы – незримо сумасбродны –
Не утешаемся… никак…

Уж не манит вперёд дорога,
Уж в пустоту ведут пути,
Уж мы оставлены для Бога,
Но… тяжело к нему идти…

Никто как будто не встречает,
Лишь некий демон мир венчает…
Что делать? Что тебе сказать…
Тебя не надо утешать!

Тебе, как Божьему творенью,
Не утешенье – к исцеленью!
Чтоб неутешно путь искать –
Себя обресть и сосоздать.

И восклицать, придя к прозренью:
«Я стал доступен утешенью!»

***

Ты будь счастливой версией себя,
Ты будь смелее в чувствах для других,
Проникнись каплями идущего дождя –
Ты без зонта открой себя для них.

Ты сопричастья ради позволяй
Сказать кому-то то, что говорит,
Контекст «больших вопросов» расширяй
Словами тех, кто их сказать спешит.

Ты восприми живительный поток
Из всех тобою обозримых дел,
И даже, если сделать их не смог –
Признай, что – не сейчас, что – не хотел.

Досоверши несовершённое любя
И стань счастливой версией – себя.

## *Аліна ДУДОЙЦЬ*



*Дудойць Аліна Віктараўна – студэнтка 2 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій.*

*Член літаратурнага клуба "Ветліца", актыўная ўдзельніца мерарыемстваў, якія праводзяцца клубам, удзельніца рэспубліканскага конкурсу чытальнікаў вершаў, член журы конкурсу вершаў у БДТУ і інш.*

### *Что может скрыть любовь?*

Кто может скрыть любовь?
Кто может спрятать скуку?
Биение сердца не услышать вновь,
И страдать под казнью муки.

А мучаешься от того,
Что просто совершил ошибку,
Обрушив стены мира моего,
Навеки погасив мою улыбку.

И нет твоей вины ни в чём:
Ведь ты был добрым, верным другом,
А реки боли, маленьким ручьём,
Омоют душу каменным испугом.

Как я могла скрывать любовь?
Зачем давила в себе чувства?
Когда от слов его вскипает кровь...
Другая стала его музой.

Мне не хватает тех ночей...
Я вынужден скрывать, что скучно!
А голос той, что в памяти моей,
Звучит как песня, но беззвучно.

Ведь слово может, лучше холодов,
Лишить живое сердце стука.
Всё потому, что кто-то может скрыть любовь.
Всё потому, что кто-то может спрятать скуку.

## *Ураган*

Однажды твои спокойные дни
Дикий, как зверь, ураган потревожит.
Добро или зло? Попробуй, пойми –
Дорогу к желаниям найти он поможет.

И если внезапно ты душу находишь,
С ключом от двери в твоё состояние,
В забытьи как будто ты бродишь,
Настолько кажется всё нереальное.

Ты ищешь подвох, не веришь ни слову.
Мысли кричат: «Не верь! Уходи!»
Желанье прислушаться к тихому зову,
Но что-то внутри умоляет – «Рискни!»

И ты вместе с ним ту дверь открываешь,
Становится светлым сознанье твоё.
Он не ураган, и ты понимаешь,
*Вершы пачала пісаць ў юнацтве пад уплывам паэмы Янкі Купалы "Тарасова доля". Пасля выхаду на пенсію знайшоўся час на паэтычную творчасць. Ужо падрыхтаваны зборнік вершаў "Якое шчасце жыць…"*

## *Старая хата*

Стары месяц майскай ноччу
Выставіў дазор.
З белых лёгкіх аблачынак
І халодных зор.

Сам падаўся ў Белавежу,
Ночку ўсю свяціў –
Над хацінай, сярод вёскі,
Ў роспачы застыў.

Паваліўся ля дарогі
Пачарнелы плот,
І заглядвае у вокны,
Бы дзяцюк, асот.

Бэз накінуў на хаціну
Майскі свой вянок.
І вісіць вялікі, ржавы
На дзвярах замок.

Ўспомніў ясны, што калісьці
Тут ўдава жыла,
Вельмі хораша спявала,
Тоненька вяла.

Ды хаціна апусцела,
Удавы няма.
У зямельцы, ля царквы што,
Спіць даўно яна.

Дочкі з Мінска прыязджаюць,
Ды няблізкі свет.
За хацінай прыглядае
Малады сусед.

Месяц трохі апусціўся,
Ў вокны зазірнуў.
І хаціне адзінокай
Быццам падміргнуў:

Не сумуй, старая хатка,
Майскаю парой,
Я часцей буду заглядваць
На падворак твой.

Будзем гутарыць з табою
Ночку, да зары,
Як была ты маладою,
А я быў не стары.

## *Вялікдзень*

– Як звонка сягоння пяюць ручаі!
І сонейка ярка як свеціць!
Вялікадзень хутка. Вясна на зямлі –
Прыбраць трэба хатку нам, дзеці.

А голас матулі ласкавы такі,
Нібы ручаёк той вясновы:
– Ці чуеце, славяць Хрыста жаўрукі,
Я шыць пачала вам абновы.

Сягоння хаціну, дасць Бог, пабялю,
Вы ж, дзеткі, памыйце падлогу,
А заўтра ранютка мукі намялю –
Вялікдзень ужо ля парога.

Мы рады матулі ва ўсім памагаць,
Пасцілкі трасём гэтак лоўка,
Бо знаем: нялёгка ёй нас гадаваць:
Матулечка наша – удоўка.

Сяннік набіваем вялікі, тугі
Аўсянаю мяккай саломкай,
А ночкаю сніцца мне сон дарагі:
Матуля пашыла абноўкі.

Ах, як мы чакалі Вялікага дня,
Каб выбегчы ў новых суконках!
Прыедзе ў госці, напэўна, радня
І здзівіцца: бач ты, паненкі.

У чацвер наша хата, бы церам які:
Пабелена, чыста прыбрана,
На покуці, сценах вісяць ручнікі,
На ложку – дыван саматканы.

Ў суботу зусім не хацелася спаць,
Лічыла з сястрою хвіліны,
Калі ж мама яйкі пачне фарбаваць
Ў цыбульніку, ў колер любімы.

І вось настае той жаданы дзянёк,
Вяскоўцы вяртаюцца з храма,
Прагледзеўшы вочкі, я бачу здалёк:
Спускаецца з горачкі мама.

У хату ўваходзіць, глядзіць на абраз,
Дачушак сваіх абдымае,
Вітаецца тройчы: – Хрыстос уваскрос!
Здароўя і шчасця жадае.

Паціху малітву чытаем усе,
Садзімся за столік паволі
І следам за мамай бяром пакрысе
Свянцонага яйка і солі.

Ніколі не ела смачнейшай яды,
Чым тыя ў Вялікдзень каўбасы,
Вяндлінка і студзень, і сыр малады –
Ці злічыш матулі прыпасы.

Ад Масленкі самай, як усе у сяле,
Пасцілася мама заўзята,
Квас з бульбай, звычайна, былі на стале,
Скаромнае – толькі на свята.

– Вялікдзень! Вялікдзень! – пяюць жаўрукі
Над нашай пустою хацінай…
Праз сэрца маё, бы Хрыстос праз вякі,
Ідуць і ідуць успаміны.

***

Усміхніся вясне, мой каханы,
Не лічы за зязюляй гады,
Зацвілі сёння ў Мінску каштаны,
Чаму ў сэрцы тваім халады?

Маразы і мяцелі-завеі
Не даюць твайму саду квітнець,
Ты ў абдымках зімовае феі,
Як жа сэрца тваё мне сагрэць?

Нібы Герда, любоўю сваёю
Растаплю чарадзейчыны льды,
І аднойчы, хоць позняй вясною,
Расцвітуць ў тваім сэрцы сады.

Снег на скронях тваіх не загана,
Толькі ў сэрца зіму не пускай.
Усміхніся вясне, мой каханы.
Хай квітнее ў душы тваёй май.

### *Забалоцце*

Ля Бялыніч, што бліз Магілёва,
Недалёка ад шумнай шашы,
За балотам, стаіць Забалоцце,
Дажывае свой век у глушы.

Журавы любяць гэту мясціну,
Ды і людзям быў рай на зямлі,
Ганарыліся родным куточкам
І для ўнукаў яго берaглі.

Журавіны увосень каралі
Рассыпаюць усім на агляд…
Толькі жаль, што няма ў Забалоцці
Больш ні хлопцаў, ні модніц дзяўчат.

А калісьці жыццё тут квітнела,
Бы вясною за хатаю сад,
Быў у кожнай хаціне Мікола,
Мар'яў, Лёксаў, Анют было шмат.

Зараз вёска амаль апусцела:
Ні душы на сяле не відаць,
Толькі хаты пустымі вачыма
На балота са смуткам глядзяць.

Можа, хутка чарга іх настане
І бульдозер зраўняе з зямлёй…
І тады журавы пракурлычуць
Развітальны ім вечны пакой.

***

У вёсачцы ціхай,
Што век дажывае,
Песню ля хаты
Бабулька спявае.
Голас бабулі
Прыгожы, высокі,
Спыніліся нават у небе аблокі,
Слухаюць поле
І хаты пустыя,
Згадала ім песня
Гады маладыя,
Як звонка спявалі
Тут хлопцы, дзяўчаты,
Гулялі вяселлі,
Хадзілі у сваты,
Як на Купалле
Пускалі вяночкі,
Купальскі агонь
Асвятляў іх ўсю ночку.
Цяпер не шукаюць
Тут папараць-кветку.
У вёсачцы ціха
Зімою і ўлетку
Стаю я ля весніц,
А песня лунае.
Жнівеньскі вечар
На скрыпачцы грае…
Песню ля хаты
Бабулька спявае.

***

Цераз луг шырокі,
Дзе травы высокі,
Пайду да крыніцы,
Бы ў госці к сястрыцы.

На беражку сяду,
К вярбе прыхінуся,
З гаманкой крынічкай
Думай падзялюся.

Бягуць хмаркі-думкі
Адна за другою,
Адпускаць іх буду
З быстраю вадою.

Крынічка лясная,
Мае думкі знае,
То пажурыць трошкі,
То паспачувае.

***

Басанож мы ідзём пад дажджом
Цераз пушчу да роднае хаты,
Пракаціўся лагодны дзесь гром,
Быццам голас той нашага таты.

Пушча помніць татулі сляды,
Ды на тое была Божа воля,
Каб навекі спачыў малады
Ля царквы, што ў сяле Дабраволя.

Многа планаў было ў яго,
Як любіў ён сваіх дарагусек…
Тры гадочкі было мне ўсяго,
Толькі годзік маленькай Марусі.

На пясочак магільны яго
Сухавейкі мы сёння садзілі,
Хоць не помнім татулю свайго,
Пра бацькоў мы з сястрой не забылі.

Пра магілку у вёсцы лясной
Знаюць ўнукі і праўнучак Янка…
Прыпыніся, сястрыца, пастой –
Недзе бліснула побач маланка.

***

Маладая матуля
Трымае сыночка
І цалуе, цалуе
У пухлую шчочку.

А тралейбус грыміць,
У ім і душна, і цесна,
Ды глядзіць на людзей
Анялочак нябесны.

Усміхаюцца ўсім
Яго сінія вочкі.
– Як завуць цябе, любы?
– Зваць яго Васілёчкам.

І шчаслівая маці
Прыціскае сыночка,
Хоць не спала, відаць,
Яна гэтую ночку.

Усміхаюцца людзі,
І глядзяць на дзіцятка –
За акном шэры будзень,
А ў тралейбусе свята.

### *Бадзяга*

Снежаньскі вечар. У бляску метро.
Між елачак стройных, прыгожых,
Бадзяга аброслы, ў старым паліто,
Просіць дзвесце рублёў у прахожых.

Ён нешта бармоча, хоць ясна і так:
Душа яго прагне пахмелкі.
Я з думкай падходжу: дажыўся, бядак,
І моўчкі даю тры цукеркі.

Здзіўленне і радасць ў патухлых вачах,
Знічкай, пэўна, мільгнула дзяцінства:
Святочная ёлка у яркіх агнях
І Дзеда Мароза гасцінцы.

Няспешна ў газету бядак загарнуў
З дзяцінства свайго падарунак,
І хтосьці з прахожых яму працягнуў
Святы абразок як ратунак.

***

Бабулькі ідуць у касцёл,
Нялёгка даецца дарога,
І светлы нябесны анёл
Вядзе пад руку іх да Бога.

Яму толькі з чыстай душой
Раскажуць пра ўсё, што хвалюе,
Гасподзь Усявышні любоўю сваёй
Грахі ім зямныя даруе.

Малітву чытае святар,
Душа іх да зорак ўзлятае,
І мудрасць кладзецца на твар,
Прыгожая мудрасць, святая.

І скінуўшы цяжар грахоў,
Палёгку адчуўшы у целе,
З касцёла святога дамоў,
Яны, бы на крылах, ляцелі.

***

Носяцца шпакі за чарвякамі
Па траве зялёнай у двары.
Спрыт іх, адшліфованы вякамі,
Радасць выклікае ў дзетвары.

Хочацца дасціпнаму дзіцяці
За шпаком пабегчы па траве,
За руку трымае яго маці:
– Ты наб'еш сіняк на галаве.

Усё жыццё наперадзе ў малога,
Не пражыць яго без сінякоў,
Жорсткая жыццёвая дарога
Надае нямала тумакоў.

Адпусці свайго сыночка, мама,
За руку так моцна не трымай.
Хай бяжыць і твой шпачок таксама
Па траве зялёнай ў ясны май.

## *У надзейных спадчына руках*

Сядзяць на лавачцы бабулі.
У небе – месяц малады.
І спяць, напэўна, ўсе зязюлі,
Што лічаць іхнія гады.

Чуваць Купалля адгалоскі,
Бабулі песню завялі –
І над палямі, соннай вёскай,
Нібы іх лёсы паплылі.

Спявалі ціха пра “Каліну”
І пра разлуку маладых –
У кожнай песні – лёс жанчыны,
Нібыта лёс бабулек тых.

Лілася плаўна “Купалінка”,
Нібы крынічка ля сяла,
І непрыкметна у вяночку
Да іх дзяўчына падышла.

Прыгожым голасам дзявочым
Ім падцягнула ў самы раз,
Каб сярод казачнае ночы
Агонь Купалля не пагас.

І голас той даваў надзею,
Што не загіне у вяках
Агонь той дзіўны, не сатлее –
Ў надзейных спадчына руках.

## *Кавалачак шчасця*

Летняй ночкаю плакала Насця:
За кароткі курортны сезон
Адшчыпнула кавалачак шчасця,
Ды растала яно, нібы сон.

Добра знала, што шчасце чужое,
Што яго дзесь чакае сям’я,
І што жонкай не будзе другою…
Дык чаго ціха плача яна?

Ці жаночае мудрасці мала,
Хоць нямала гадоў пражыла?
Ці таму, што чужое шчыпала,
А сваё зберагчы не змагла.

## *Крочу я сцяжынкаю лясною*

Крочу я сцяжынкаю лясною,
А вакол – ва ўсёй красе вясна:
Чаромха умываецца расою,
І шэпчацца з бярозкаю сасна.

Напэўна, ў іх таемная размова,
Як ветрык ўчора з поўдня прылятаў,
Ласкавы, цёплы, радасна-вясновы,
І косы у бярозкі расплятаў.

Нясмела прызнаваўся у каханні,
Бялюткі стан пяшчотна абдымаў,
Яна стыдліва сцішыла дыханне,
Калі лісточкі мякка цалаваў.

Ды ненарокам шчырае прызнанне
Падслухаў, пэўна, звонкі салавей.
Ліецца песня, нібы гімн каханню,
Дзе ты схаваўся, сціплы чарадзей?

Якое шчасце жыць,ісці сцяжынай роснай,
Калі ў гаях спяваюць салаўі,
Ўсміхацца сонцу, ветрыку, бярозцы –
Тварцу схілюся нізка да зямлі.

### *Дзяцел*

Дзяцел сасновы агледзеў сучок.
Ці не схаваўся там шкодны жучок?
Можа, згубіць ён задумаў сасонку,
Каб не віталася раніцай з сонцам?
Дзяцел намеры жука разгадаў,
Дзюбай пастукаў – і злыдня дастаў.
Як ні стараўся ўцячы караед,
Трапіў ён дзятлу усё ж на абед.
Дзяцел – лекар лясны, невялікі, стракаты,
Бо белага доктар не мае халата.
Ёсць браты у яго: дзяцел чорны й зялёны,
Ды дзяцел стракаты нам болей вядомы.
Лечаць дрэвы браты і не знаюць спачыну:
То ёлку старую, то цётку асіну.
Дубы і бярозкі братам вельмі рады –
Усім дапамогуць, дадуць ім парады.
Пачуеш стук дзятла – і ты прыпыніся,
Як лепшаму сябру яму пакланіся.
Яго не палохай, яго беражы,
Пра доктара-дзятла сябрам раскажы.
Ён лекар вядомы ў лясах Беларусі,
А хто з іх галоўны – казаць не бяруся.

*28.02.–1.03.2014.*

***

Люблю я лясы, бо расла ў Белавежы,
Дзе з небам гаворыць славутая вежа.
З дзяцінства мне лес, нібы родная хата,
Матуля другая і родненькі тата.
Карміў нас грыбамі, салодкай малінай,
Суніцамі спелымі, ўзімку калінай.
Даваў нам і дровы, каб печ не астыла,
Каб смачнаю бульбай нас, сірат, карміла.
А як не сказаць добрых слоў пра чарнічкі:
Здавалі мы іх і куплялі спаднічкі.
А перш за ўсё кнігі, каб добра вучыцца.
Лясам беларускім хачу пакланіцца.

***

Коцік сеў пад ёлачку,
Колюцца іголачкі,
Колюць лапкі, колюць носік,
Коцік ёлку шчыра просіць:
– Ты схавай свае калючкі,
Вельмі ж колюцца, балюча.
Кажа ёлачка катку:
– Бачыш ранкі на суку?
Ты тачыў учора кіпці,
Пэўна, думаў не баліць мне?

Сорам коціка ўзяў,
Ёлку лапкай ён абняў
І прамовіў: – Вінаваты,
Больш цябе не буду кратаць.
Толькі ёлачка не плач,
Ты даруй мне, ты прабач.
Давай лепей сябраваць,
Кіпці буду я хаваць.
Сон твой буду сцерагчы
Ад ўсіх мышак уначы.

***

На дзіва сягоння надвор'е:
Не вечар – вясны благадаць.
Тры зорачкі, пэўна, сузор'е,
Міргаюць, бы хочуць сказаць:
– Такой прыгажосці ў Сусвеце,
Нідзе больш, павер нам, няма:
На вашай адзінай планеце
Ёсць цуда такое – вясна.
Нідзе не кукуюць зязюлі,
Нідзе не звіняць ручаі,
Пяюць калыханкі матулі
На грэшнай прыгожай зямлі.
Ў халодным бясконцым Сусвеце
Брыльянт ваш маленькі адзін.
Яго зберажыце вы дзецям, –
Тры зорачкі шлюць напамін.

### *Зязюля*

Кукуе зязюля ля гаю,
Бы ніжа гады на шнурок,
Спынюся і ціха спытаю:
– А можа, накінеш гадок?

Салоўка так слаўна спявае
У хоры лясным на суку,
А я ўсё стаю і чакаю
Твайго з ціхім жалем "ку-ку".

Ты дзетак шукаеш, я чую:
Гукнеш раз-другі – і маўчыш,
Паслухаеш цішу лясную –
І ў вёску з надзеяй ляціш.

Таму твая песня, зязюля,
Кранае душу мне здаўна...
Бы голас ласкавы матулі,
Гучыць ў маім сэрцы яна.

### *Вішанька*

Ўся ад квецi белая
Вішня за акном,
Бы нявеста мілая
Поруч з жаніхом.
Вэлюм з белых кветачак
Ахінуў касу,
Заглядзеўся месячык
На яе красу.
Ды не знае месячык:
Заўтра раніцой
Вецер злосны з поўначы
Прыйдзе за красой.

## *Арсеній ЧУБАРАЎ*



*Чубараў Арсеній Раманавіч нарадзіўся 9 чэрвеня 2000 года ў горадзе Салігорску.*

*У 2017 годзе закончыў школу і паступіў у БДТУ на факультэт хімічнай тэхналогіі і тэхнікі. Вершы пачаў пісаць з пятага класа. Акрамя паэзіі, займаецца спортам.*

*Удзельнік і пераможца літаратурна-мастацкага конкурсу БДТУ і рэспубліканскага літаратурнага конкурсу "Аўтограф", з поспехам выступіў на заключным мерапрыемстве "Аўтографа" ў горадзе Брэсце (20–21 лютага 2019 г.), атрымаў сертыфікат удзельніка.*

### *СМИ*

Они закрывают наши глаза!
Чужие жизни, не наши проблемы!
И вечно живёт этой лжи полоса,
Не каждый заметит те серые схемы…

Далеко за границей, за морем, горами
Началась эпидемия – страшный недуг…
А что же до нас, что сейчас с нами?
И доживём мы до завтра? А вдруг…

Они давят на жалость, бьют по больному!
И многие верят им, слушают их…
Начните же мыслить вы по-иному,
Не забывайте проблемы свои!

### *Жажда*

Кислородоводород
Льётся в мой рот,
Жажда не ждёт,
Сухость в горле жжёт.
Мне нужно напиться,
Хочу насладиться
Полётом птицы,
Запахом пиццы,
Напряжением в спицах
Моей колесницы.
Толкаем границы
Немыслящих лиц мы!
Сознанья убийцы,
Такие девицы,
Что им удивиться –
Оказаться в больнице,
А позже взмолиться
Тому, что приснится
Неспящей глазнице
И очутиться
В чужой колеснице
Немыслящих. Спицы
Загонят в границу,
И смерти грибница
В голове поселится.
И что же, молиться

Тому, чего нет?
Клянётся скелет,
Забравший стиллет
Всех твоих бед,
Лишь для побед,
Чужих нести свет.
Мысли иных,
Знание их,
Даёт перерыв
На сознанья разрыв,
Падение вниз,
Идейный кризис.
Твои успевания
С труда желанием
Не знают нарастания.
И одно мечтание –
Гамет слияние.
Эта пошлость, не ври,
Проела твои мозги!
И в жажде – ни зги!
В мечтаньях виски
Тощеют, остынь!

## *Простите*

Я согрешил, создал страшную вещь.
Но мне было сложно не пересечь
Эту черту между нормой, добром,
И безумием, чистым злом.

Все мы грешны, все мы делаем плохо
В буре эмоций и глупости лет.
Но если вы согрешили хоть кроху,
То ничего здесь отвратного нет.

Пускай вас ругают, не держите обиды.
Пусть даже хвалят – забудьте про смех.
Их наставленья – они ваши гиды,
Ощутите раскаяние за свой грех.

И если вам встретится тот человек,
Который не ведает чувства вины,
То не вступайте с ним в споры вовек,
Обернуться они вам лихом должны.

Мы все жить учились,
И учимся дальше.
В любой жизни есть
Хоть капелька фальши.

С неё нам лишь нужно
Опыт собрать,
И лицам нечуждым
Его передать.

## *Релаксант*

Расслабься, браток,
Всё нормалёк,
Пей свой чаёк,
Сглуши косячок.

Пусть ты на мели,
В бюджете нули,
Расслабься, здесь ли
Проблемы твои?

И пусть каждый знает,
Какой кайф бывает,
Когда забивает,
Потом выпивает,
И дым тот глотает
Парниша, что варит.

Никто не поймёт,
Какой это мёд –
Твой сладкий туман,
Газ-дурман…

Пусть он несёт смерть,
Несчастий – несчесть!
Пусть он будет злом,
Твоей жизни огнём!
Ты себя убиваешь,
Интеллект свой сжигаешь!
Остановись!
Смерти остерегись!

### *Вдохновение*

Огонь идёт, огонь мчится,
Я улетаю за границы,
И я не знаю, что случится,
Зато свободен я, как птица!

Адреналин, он течёт во мне,
От него я словно в огне,
Я могу разбить все горы,
В крупице песка разглядеть просторы!

Я вижу все чувства на лицах всего!
Я чувствую всё там, где нет ничего!
Весь мир – лишь система из многих систем,
А в этой системе – отсутствие стен!

Решенье проблем, делить «моно» на доли…
Вот он ответ – у меня на ладони!
Мой разум способен всё объяснить!
И нереально его остановить!

Свободно пространство, и пуст весь эфир,
Как чистый холст, чтобы выдумать мир!

***

Но дай же мне тебя познать!
С которой мир весь расцветает,
С которой хочется делиться,
О ком мне хочется мечтать…

Цветы деревья распускают,
Лишь стоит тебе появиться.
И я хочу тебе отдать
Свою душу всю, до крупицы.

***

Твой нежный голос не даст мне спать,
Как эликсир жизни он для меня…
И ангельской арфы волшебная стать
Кроется в нём, словно луна,

Что свет серебристый льёт через небо…
Волшебно перо начертило
Витраж твоих слов, что мягче хлеба,
И губ, что сочнее плодов…

Мир весь застыл, дав тебе слово.
Птицы умолкли и шелест листвы.
И тишина… для мира то ново,
Он знает: сейчас молвишь ты.

И ветер играет в твоих волосах,
И солнцем светят твои глаза,
И жарким пламенем горит сердце
И сердцебиения повышаются герцы…

И весь твой стан – он манит и манит…
И хочется лишь подойти и обнять,
Когда уж момент тот прекрасный настанет?
Когда я смогу вновь поцеловать?
Я устал ждать…

Как Земля, меня тянет твой запах,
Лишь им я хочу и дышать, и мечтать…
И, упиваясь, как кошка на лапах,
Тебя к себе взять, и убежать…

И без разбору, лишь в счастье, лишь в плюс,
Я по жизни с тобою несусь.
Нет тех врагов, что мы не одолеем,
И нет таких скал, коих мы не сильнее.

Ты словно птица, паришь в небесах!
Будто бы чудо, не с этого света.
Прекрасна как утром под солнцем роса,
Мне жарко, словно ты моё лето.

# *Госць клуба*

***Генадзь ШАРЫ***



*Шары Генадзь Міхайлавіч нарадзіўся ў 1941 годзе ў вёсцы Каравацічы Васілевіцкага раёна Гомельскай вобласці. Архітэктар. Пасля заканчэння ў 1966 годзе Беларускага політэхнічнага інстытута працаваў галоўным архітэктарам г. Салігорска. З 1975 года ўдзельнічаў у распрацоўцы генеральных планаў гарадоў Беларусі з калектывам спецыялістаў Беларускага дзяржаўнага інстытута горадабудаўніцтва.*

*У 1995 годзе ўзначаліў Дзяржаўную экспедыцыю па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС.*

*Намаганнямі Экспедыцыі выратаваны і даследаваны шэраг помнікаў археалогіі, архітэктуры, этнаграфіі, фальклору, выяўленчага мастацтва, на аснове якіх пры Музеі старажытнабеларускай культуры быў створаны спецыяльны фонд з выставачнай галерэяй.*

*Аўтар публікацый па гісторыі і этнарафіі Беларусі, пра паэтаў і дзеячаў культуры эпохі Сярэбранага веку. Зараз займаецца грамадска-асветніцай дзейнасцю.*

## *ЭКСПЕДЫЦЫЯ*

### *Нізка вершаў*

*Прысвячаю руплiўцам, што самаахвярна*
*працавалі падчас экспедыцыйных*
*збораў на тэрыторыі Беларускага Палесся.*

### *Акраверш*

*Андрэю Варатнікову*

**А**ддаць усё і знікнуць у Прыродзе.
**Н**ам так наканавана. Так і будзе.
**Д**ары сакральныя Прыроды
**Р**азбурыць час, разбурыць і народы.
**Э**похі колісьніх культур у вечнасці заснулі…
**Ю**піцер. Месяц. Марс. Зямля. Меркурый.

*Краснапольскі раён, вёска Выдранка, 1966 год, чэрвень*

### *Баркулабаўскі лебедзь*

*Міколу Мельнікаву*

Лёгкім травеньскім ветрам,
Акурат на Міколлле,
Рассякае паветра
Над прапішанскім полем.

І ў суладдзі з Прыродай,
Бліскавіцай і громам
Не спужаўся нягоды –
Не вярнуўся дадому.

Белы, стромкі і моцны –
Ці не бачыў хто-небудзь? –
Ён плыве па затоцы,
Баркулабаўскі лебедзь.

*Быхаўскі раён, вёска Баркулабава, 1979 год, травень*

### *Ручнік*

*Марыі Віннікавай*

Ток усланы трастой ільняною,
Журавы адлятаюць у вырай.
А на небе – зямною, прастою –
Нарадзілася Дзева Марыя.

Тварык светлы, як зорачкі, вочкі,
Постаць зграбная вабіць паэтаў,
І звініць серабрыстым званочкам
Наваколле ад постаці гэтай.

Абароніць анёл твой ад гора,
І малітва сягае да Бога,
Вышывай жа квяцістым узорам
Ільняны ручнічок на дарогу.

*Лельчыцкі раён, вёска Прыбылавічы, 1997 год, кастрычнік*

### *Акраверш*

*Аксане Варатніковай*

**А**хвярай ружы белай
**К**раменьчык брамы вострай,
**С**малістай вішняй спелай
**А**гонь стагоддзя жорсткі
**Н**а вусны сыпле мілай
**Ё**н белыя пялёсткі.

Хойніцкі раён, вёска Уласы, 1998 год, ліпень

### *Эпілог*

*Віктару Шматаву*

Яблынька мая скараспелая,
Чаму ж не цвіцеш?
Накукавала  зязюлечка
Мне долю такую.
Словы зязюлі дагэтуль
У чорных галінах трымцяць.

*Мінск, 2000 год, красавік*

## *Віталія ШЫШКАВЕЦ*



*Шышкавец Віталія Уладзіміраўна нарадзілася ў горадзе Бабруйску 28 верасня 1999 года ў сям'і хімікаў. Маці настаўніца хіміі, бацька – хімік-тэхнолаг. У 2014 годзе закончыла музыкальную школу №2 імя У. У. Алоўнікава. Аднак па-сапраўднаму займацца музыкай стала ўжо пасля вучобы. У 2017 годзе закончыла СШ № 10 і паступіла ў БДТУ на факультэт хімічнай тэхналогіі і тэхнікі.*

### *Этажи*

Объяснить тяжело то, что гложет внутри,
Позабыть про печали и страхи.
Как-то встретились мы, потеряв этажи.
В том весеннем цветочном взмахе.

И пролёт за пролётом, каждый этаж
Был наполнен моими словами.
За окном был расписан солнцем пейзаж,
А внутри дышит всё холодами.

Скорый поезд покатит тело домой,
Только мысли остались в том месте,
Где, забыв этажи, повидались с тобой.
Были рядом и никогда "вместе".

Тонут мысли в запахе белых цветов,
Плечи тонут не в тех объятиях.
Объясни интонации всех поездов,
Или тех, кто умеет прощаться.

Лично я, никогда не хочу отпускать,
Никогда не хочу забываться.
Не хотела, правдивее будет сказать,
До того, как не стала влюбляться.

***

Добрай ночы, сяброўка бяссань,
Пашкадуй мяне, адпусці.
Вельмі цяжка  ў самотную рань
Услед за целам ногі нясці.
Абмываючы белы твар,
Цяжка вочы адкрыць на хвіліну.
Забірай за сабой і свой дар:
Ноччу вершы пісаць пра судзьбіну.
Цёмны месяц у акно зазірае,
У напамін аб адстунасці сну.
Ён даўжэй за ўсіх нас чакае,
Каб лета змяніла вясну.
Кожны вечар глядзіць ён трывожна
На людскія радасць і сум.
І спрабуе даць асцярожна
Хоць надзею скрозь зорны штурм.

### *Вечность не для меня*

На кусочках старого разбитого стекла
Написали маркером "С Тобой навечно".
Собирали по осколкам до утра,
Без сомнений, наше "Бесконечно".

Но ладонь порезав, отступил назад,
Голову и руки опустив к земле.
Было жалко, вечность нарасхват.
Кто-то соберёт её уже к весне.

Посмотрев в солёные мои глаза,
Всё сказал. Без слов мне всё сказал.
Знаю, ты не веришь в чудеса.
Не для меня ты вечность разбивал.

***

Последний снег растаял поневоле,
И каплями стекая с крыш домов,
Напомнил мне о роковом проколе,
О множестве несделанных ходов.
Скорей бы птицы петь мне начинали,
Скорей бы солнце проскочило из-за штор.
И к черту всё, забудем о печали,
Пора платить за внутренний террор.
Пора наказывать себя за глупость,
Настало время счастья и тепла.
Пора понять: лишь чувственная скупость –
Его поступки и слова.
Хочу смотреть влюбленным взглядом,
Хочу, чтоб звёзды падали с небес.
И кто-то вечность находился рядом,
Воткнув в себя моей любви эфес.
Но много страхов жизнь нам преподносит.
Волна сомнений накрывает вновь.
И то ли  сердце, то ли мозг вдруг спросит:
А это настоящая любовь?

## *Кацярына ШЧАСНАЯ*



*Шчасная Кацярына Дзмітрыеўна нарадзілася ў 1984 годзе у горадзе Баранавічы. Піша вершы і прозу, журналісцкія артыкулы. Друкуецца ў часопісах “Маладосць”, “Бярозка”, “Верасень”. Працуе ў Інстытуце мовазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Мовазнаўца, кандыдат філалагічных навук. Выкладала рускую мову для замежных студэнтаў у БДТУ (2017 г.).*

### *Ева*

Навошта знайшла яго, Ева?
Жыў бы без кветак на целе,
Без белых крылаў за спінай,
Плямкі на ўвесь лоб.

Не будзь наіўнай, Ева:
У гэтым Раі тонкія сцены,
І Адама, як манекена,
Не паставіш за шкло.
Ева, Ева, паглядзі налева:
Там Апалонаў пантэоны,
Кругі і белыя мішэні,
Чакаюць твой патрон.
Крыўдліва знікаеш ў садзе,
Пішаш на лісцях парады,
І замест развітання
За дваіх вырашаеш ізноў.

### *Пад абажурам*

Так бывае:
Рана-рана, восень, дождж.
Дала табе ў дарогу
Свой парасон.
У кропінку, у карункі.
Ну і што?
Хай сабе тыя мокнуць
Без нічога ці ў капюшонах,
Ці штурхаюць каго
Дзідамі строга чорнымі.
А ты "ў ажуры",
Пад абажурнай апекай маёй.

***

У кутках вачэй тваіх
Павуцінкі,
Узоры цацачнай скрынкі,
Дзе леў і лісіца
Надумалі біцца
У карты.
На кану каханне –
Не жарты.

***

Ты ідзеш па вагоне –
Дзяўчына без рукі –
І не хапаеш турнікет,
Бо моцная.
А табе пераступіць лесвіцу –
Подзвіг балючы.
Але наперадзе – уступны эзамен,
Бо мара.
А на тваім твары вогенны апёк:
Аплявуха дзяцінства.
А ты купіў ружу,
Бо рыцар.
А я лячуся ад вечнага юнацтва,
Перхаці ў вачах
І боязі заўтра.
Кажуць: ёсць надзея.

***

Я бярозка. Расту на ўскрайку лесу.
Мяне называюць прынцэсай,
Я ж лью слёзкі. Бо ў камлі маім ножык.
Адзіны сябра – вожык.

### *Мужчынскі грып*

Вясна, а ты хварэеш, і я
Вяду сваю вахту строга:
І каву ў ложак, і ласку, і аспірын –
Усё на карысць нямоглага.
Амаль трыццаць сем – які жар!
І ў носе сабраліся слізкі.
Страшней за Эбалу пэўна ён –
Нягодны грып мужчынскі.
Ты пад коўдру залез, бы ў танк,
Не выйдзеш адтуль аж да лета.
От закрыўся ад усіх турбот –
Капрызулька гэткі!
А тут уратаванне – званок,
І я адным скокам
З тыдня палону хвароб
Збіраюся ў трэнажорку.
Ускочыў адразу і прынц,
Забыўся на слёзкі і болькі.
Прэч кашаль, лянота – прэч!
Ён пасябруе са спортам!

### *Чэхія*

Краіна Залюстэр’я…
*Ovoce* растуць на вярбе,
Пралескі зацвітаюць
На дзве гадзіны раней,
Трамвай шыбуе з завода
На абед хутка ў лес.
Вымаўляем пяшчотна
*vlna, srdce, prst, krst.*
Пад гатычнымі шпілямі
Пад дыктоўку Скарыны
Са смакам пеннай алхіміі
Пішацца славянскі верш.

### *Без снегу зіма*

Без снегу зіма…
Да ранку не спіцца
Без мяккага хрусту,
Без казачных бліскаў.
Лепш мінус трыццаць,
Чым надакучлівы нуль.
Сняжынкі на вокнах
Лепяць малыя шаманы
Ў спадзяванні на цуд.
Дарослыя па крамах
Хапаюць закупы:
Ці да снегу тут?
Санкам ды лыжам
За паварот бы і бегчы,
А не падпіраць кут.
Перадайце па FM
Святочную песню –
Пра мароз навіну!
Калядная казка
Без галоўнай дзеі.
Лістапада N-нага.
Спі, Снягурка, пакуль.
Лепш бы вылі завеі,
Чым гэты бясконцы нуль.

### *Восеньскі кош*

Нясе горда восень у кашы
Грыбы мокрыя, журавіны…
Смяецца: “Ты лету даруй,
Як птушкам услед памашы!
Павер, і з апалых лістоў
Таксама пішуць карціны!”
Спаўзае дзень, быццам вуж,
Па шкле ручайком даждлівым.
Нясе важкі восеньскі кош
Першы мароз сарамлівы.

***

Дзед Антоніа з Сан-Паўлу
Неверагодную бачыў з’яву:
У ноч на сваё стагоддзе
Прысніў вясковыя Каляды.
Злазіць ён з печы ранкам,
Туляць яго мама і татка.
А на стале аладкі, кілбаска,
Елка ў кутку ўся ў яблыках.
І за парогам – а гурбаў!
Не відаць суседскія хаты.
І, як з бярлогу, з буды
Вылазіць здзіўлены Шарык.
Антоніа аж падхапіўся,
Бачыць: за вокнамі – бела…
Сенсацыя – за стагоддзе
Не было ў Бразіліі снегу!
Дзед сам сабе не паверыў,
Хацеў выгукнуць “nossa!”
Ды вырвалася простае
Век знаёмае “уга!”

# ПАЭЗІЯ – ПЕРАКЛАД

*Валянціна БАТУРЧЫК*



Батурчык Валянціна Андрэеўна – студэнтка 2 курса факультэта тэхналогіі арганічных рэчываў. Перакладае з нямецкай мовы.

*Edgar Allan Poe*

*Traumland (оригинал)*

Dieser Weg war seltsam und verlassen,
nur von bösen Engeln heimgesucht,
wo ein Trugbild namens Nacht als König, stolz auf einem schwarzen Thron regiert.
Diesen Landstrich habe ich vor kurzem erst erreicht,
vom düsteren Thule her.
Eine wilde wundersame Gegend,
außerhalb der Macht von Raum und Zeit
Tiefe Täler, grenzenlose Fluten, Klüfte, Höhlen, ewig weite Wälder,
Formen, die sich nicht entdecken lassen,
weil die Tränen das Gesicht bedecken.
Berge stürzen immer wieder in die Meere ohne Küste.
Meere, die beständig wogen und zu Feuerhimmeln streben.
Grenzenlose Seen verbreiten leise unaufhaltsam stilles, totes Wasser.
Wasser, das so einsam, still und kalt unterm Schnee der Wasserlilien liegt.
An den Seen, die ihre Wasserfluten ewig wachsen lassen, still und tot.
Ihre Wellen liegen kalt und trostlos unterm Schnee der weißen Wasserlilien.
Bei den Bergen, gar nicht weit vom Fluss, dessen Fluten wie geknebelt murmeln.
Bei den grauen Wäldern und beim Sumpf,
darin Molch und Kröte Obdach finden.
Bei den trüben Seen und tiefen Löchern,
wo die Leichengeister gerne hausen.
Bei dem Ort der nur dem Unheil dient
und in jedem angstgefüllten Winkel,
da trifft nun der bleiche Reisende die verblassten Bilder der Vergangenheit.
Leichentuch verhüllte Formen seufzen,
als sie ihn mit ihrem Hauch berühren.
Weiße Formen, die vor langer Zeit und mit Schmerzen freigelassen wurden.
Für das Herz, das ohne Ende leidet
ist dies eine sanfte schöne Gegend.
Für den Geist, der stehts im Schatten geht,
ist es – oh – es ist ein goldenes Land.
Aber wer dies dunkle Land bereist, fürchtet sich es offen zu betrachten.
Und so werden seine vielen Rätseln niemals einem schwachen Menschen auge offenbart.
So sagt es der König, der verbot, dass die Wimpern von den Augen weichen.

Und so sieht die Seele, die vorübergeht
alles nur wie hinter Eisengittern.
Diesen Weg, so seltsam und verlassen,
nur von bösen Engeln heimgesucht,
wo ein Trugbild namens Nacht als König
stolz auf einem schwarzen Thron regiert,
bin ich aus dem dunklen Thule kommend
kürzlich voller Freude heimgewandert.

### *Долина грёз*

(перевод с немецкого)

На том пути, что Бог забыл и чудным назвал,
Узришь те муки, какие лишь Дьявол знал;
Здесь призрак ночи на троне тёмном восседает,
Нос кверху подняв и честь оставив.
Достиг того места, не долог был путь.
Шёл от родины Таула (легенд полно тут).
Не видал той загадки и дикости племени,
Что существует вне Космоса и вне Времени…
Глубинны долины, бескраен поток,
Пустыня, ущелье, и лес так широк –
Всё скрыто от нас, потому и слеза
Так и катится на лицо, прямо из глаз.
Здесь гор не видать, а море так вовсе
Свой берег к тому пламени, что в небе, просит.
А тихие воды столь быстры и покойны,
Что, глядя на них, на душе спокойно.
Те воды бесшумны, холодны, загадок полны,
Кувшинки хранят цвета горя и пустоты,
А от моря в пару шагов водопад прекрасный,
Но вечно один и до боли мрачный,
И волны так тихо, уныло ложатся,
Чтобы подольше святыми казаться.
Защитник сидит неподалёку от моря,
Следит за приливом, ведь нет у него горя.
Весь ужас  хранят лес и болото,
Где змеи кишат, а жабы ищут кого-то.
Но море лежит, не замечая той дали,
Где разум страдает от тоски и печали.
Те волны мне, страннику, не дадут покоя,
Каждый всплеск так спокоен, но страха полон,
А те, кто мимо проходят, навек забывают свой путь –
Вот проклятия суть!
В заточении саванна, она плачет и стонет,
Вдох-выдох – и печаль твоя тонет.
Здесь Время без формы также болью страдает,
А сердце в нём от страха покоя не знает –
Таково это дикое, странное место.
Для Духа, что скрыт и в тени обитает,
Полна золота лишь эта земля, другой он не знает.
Все люди, прошедшие путь столь тайный и мрачный,
Не могут узнать, насколько они несчастны –
Наложен Вашим Величеством запрет, да такой,

Что глаз отдать рад, лишь бы не быть здесь слугой.
Душе моей не по себе – так страшно и жёстко,
Всё словно закрыто под железной решёткой…
Узришь те муки, какие лишь Дьявол знал,
Здесь призрак ночи на троне тёмном восседает,
А замок его не знает счастья. Ничего он не знает…

## *Азиз Хайдар Бахед*



*Бахед Хайдар Азиз – гражданин Ирака. Учился в БГТУ на курсах русского языка. Сейчас является магистрантом второго года обучения. Член литературного клуба “Ветлица”, активный участник многих мероприятий клуба. Участвовал в конференциях, фестивалях, акциях “Чытаем разам!”. Перевёл на арабский язык стихи Янки Купалы, Якуба Коласа, Максима Богдановича.*

### *Якуб Колас*

### *Flower*

Hello, dear my flower
Summer visitor spring!
How beautifully you bloomed
All for a surprise.
Smile breeze
And plays with you.
All you Fun caresses

### *Краска*

*(Урывак з верша)*

Краска, мілая мая,
Госця веснавая!
Як ты хараша цвітеш
У глушы любая!

З ціхім усмехам з табой
Вецярок жартуе,
І цябе ў вясёлы дзень
Сонейка цалуе.

### الـورد

*Перевод на арабский Хайдара Азиза*

مرحبا، يا عزيزتي زهرة،
الصيف هو ضيف الربيع
كيف جميلة ازدهرت
الجميع مندهش.
ابتسامة النسيم
وانه يلعب معك.
الشمس هي اليوم كله بالنسبة لك
متعة المداعبات

### *Янка Купала*

*Не шукай*

Не шукай ты шчасця,-долі
На чужым, далёкім полі,
Гэт, за шумным лесам-борам,
За шырокім сінім морам
Не шукай ты шчасця, долі!

لاتبحث عن السعادة

لا تبحث عن السعادة باجزاء •
في الغربة الحقل بعيد
الصخب او الضجيج من غابة الصنوبر
للبحر يوجد فضاء واسع.

### *Максім Багдановіч*

***

Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы
У ціхую сінюю ноч
І сказаць:
"Бачыце гэтыя буйныя зоркі,
Ясныя зоркі Геркулеса?
Да іх ляціць наша сонца,
І нясецца за сонцам зямля.
Хто мы такія?
Толькі падарожныя, – папутнікі сярод нябёс.
Нашто ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горыч,
Калі ўсе мы разам ляцім
Да зор?"

***

**اتمنى ان القاك باحد الشوارع**

**في لليله هادئه قمراء**

**لاقول لك**

**هل ترين هذه النجوم الساطعه**

**كوكبه هرقل المبهره**

**شمسنا تسبح بينها**

**وكوكبنا يتتبع خطواتها**

**من نكون نحن**

**مجرد عابرو سبيل في هذا العالم**

**والخلافات والالام في عالمنا فلماذا هذه النزاعات**

**مادمنا جميعنا نحلق**

**نحلق با تجاه النجوم**

## *Мустафа Рияд Ради Джабри*



*Меня зовут Джабри Мустафа Рияд Ради. Я гражданин Республики Ирак. Родился 06.07.1988 года в городе Вавилоне. Окончил Вавилонский университет, факультет бизнеса и менеджмента. Работаю бухгалтером в государственном органе.*

*Начал писать стихи, когда исполнилось 15 лет. В 2018 г. я поступил в БГТУ на подготовительные курсы русского языка. Я изучаю русский язык, чтобы поступить в магистратуру на специальность «Банковские операции». Я член литературного клуба «Ветлица» БГТУ. Участвовал в мероприятиях клуба, сделал подстрочный перевод своего стихотворения с арабского языка на русский.*

### *Тень призраков*

### طيف اشباح.

Любимая осветила, как утреннее солнце.
حبيبتي اشرقت شمس الصباح.
Ликует голубое небо, всё прощая.
لتبهج زرقة السماء بالسماح.
На своей кровати я оставил подушку,
على سريري تركت وسادتي.
С лёгкостью открыл окно в комнате
فتحت شباك الغرفة بارتياح.
И посмотрел на мир влюблёнными глазами.
نظرت الى الكون من نافذتي.
На мгновение открылось моим глазам:
فتسارع الى بصري القداح.
Вспомнил каждый подаренный тебе цветок,
تذكرت بها كل زهرة اهديتني.
Каждую встречу, когда раскрывалась моя душа.
لعلي سمعت صوت اعرفه.
Мне чудится – слышу я голос, мне очень знакомый.
نعم انها همساتك والجراح.
Да. Он томный... Раненый. Кричит.
ينادني الا كفى بعك عني.
Хватит! Ты так далеко от меня…
الان قد حان وقت الافراح.
Но как будто время радости пришло…
صوت شجي ملأ الحقل حبا.
Мелодичный голос заполнил поля любовью,
جعل الطيور تغرد بالاصداح.
Заставил птиц петь песни.
سريعا رسمت بركانا ذكراك.
Я быстро рисовал вулкан воспоминаний о тебе,
فانهار قلبي وتفجرت الالواح.
Моё сердце оборвалось,
استيقضت من غفوتي مضطربا.
И стены взорвались …
واذا بي حلمت بطيف اشباح.

Оказалось, это сон наяву о тени призраков.
انها اشباحك قد سكنت روحي
Твой призрак живёт в моей душе.
وسحرت قلبي الى يوم الفلاح.
Ты очаровала моё сердце навсегда!

*Эджума Роберт Гай Делоней*



*Эджума Гай Роберт Делоней учился на курсах русского языка и на подготовительном отделении в 2016 – 2017 годах. Знает французский, испанский, русский и некоторые африканские языки. Переводчик, поэт, литератор. Переводит на французский, с испанского и на испанский и др.*

### *La vie est une Odyssé*

«La vie est belle» ,  disait Chill .
Le destin s'en écarte.
Personne ne joue aux memes cartes.
Le berceau lève le voile .
Multiples sont les routes ,
Qu'il dévoile,
Comme un long périple,une Odyssée
Au quotidien à plusieurs péripéties
Avec ou sans bagage
Que tu partes ou que tu restes ?
QUE TU AVANCES OU QUE TU TRAINES ?
L'air du temps se dresse, comme le chant des Sirènes .
Les heures, les jours, les ans s'éloignent.
Les sillages s'éffacent
A l'instant les souvenirs qui se pèrdent
Comme du sucre dans le café.
Seul le gout  qui reste nous les remémoire..
Vivre aussi longtemps que l'on veut
C'est voyager aussi loin que l'on peut
Du berceau à la tombe .
Tout commence sur les dunes
Puis s'étend  au large
Plus on s'éloigne des rivages
Plus on prend de l'àge
Emportè par les flots
On  avance sans savoir
Si Le ciel sera bleu ou gris,
Si la mer sera houleuse ou calme,
Malgrè nos haines et nos inquiétudes
Tout prend fin un jour.
Mais l'Odyssée suit son cours.

Tempus fugit. / Lat./

### *Жизнь – это Одиссея*

*Перевод с французского языка Галины Оболониной*

«Прекрасна жизнь!» – так говорил
Мой друг давнишний верный Чил.
Перечить – глупая затея.
Добавлю: жизнь, как Одиссея,
Полна забот и приключений.
Где испытанья и напасти,
Сладкоголосый звук Сирен
Манит в мир призрачного счастья.
Одна дорога есть у жизни –
От колыбели и до тризны.
Но жизнь у каждого своя,
Хоть начинается с порога.
Кому – простая колея.
Кому – широкая дорога.
Хоть карт в колоде тридцать шесть,
Играют той, какая есть.
Бег времени неотвратим.
И вот былое как в тумане.
Исчезло всё, как лёгкий дым.
Так сахар в кофе растворим.
И мы вкус прошлого храним.
Жизнь – это вечное движенье.

Спускаясь с дюн и по волнам
Через потери, достиженья
Стремимся к новым берегам.
(Моё такое представленье).
И вдруг конец, увы – кончина.
Неважно, в чём её причина.
Но в дюнах жизнь опять рождается,
И Одиссея продолжается.

## *Мурат КАЯ*



*Кая Мурат гражданин Турции. Родился в 1972 году в городе Мерзифон. Компьютерный инженер и профессиональный фотограф. Очень любит искусство, теннис и плавание, все виды спорта на природе и все виды фотографий. Стихи начал писать в детстве.*

***

**Ve davullar vurdu**
*И ударили барабаны*
**Dansına başladı büyücü**
*И волшебница начала танцевать*
**Binlerse insan sustu**
*Тысячи людей молчали*
**Ölüm hazzı verdi ritmin gücü**

*От наслаждения умирали ритм сила давала*
**Akbabalar uçuştu**
*Стервятники пролетали*
**Sunağın tepesinde**
*Над пиком алтаря*
**Belli ki kana susamışlar**
*Видно крови они желали*
**Birisi alçak uçuş yaptı**
*Кто-то из них опускался*
**Kurbanın üzerine**
*На жертвенник божий*
**ürküttü ritmin gücü**
*Но сила жуткого ритма испугала его*
**Döndü çöplüğüne**
*И вернулся он на свалку свою*
**Devam etti dansına büyücü**
*А волшебница танцевала и танцевала…*
**Gökyüzü griydi**
*Небо стало серым*
**Dört kişi geldi tapınağın içinden**
*Четыре человека прошли через храм*
**Vücutları yoktu gözleri gri**
*У них – сероглазых – не было тел*
**Ateşe verdiler dört bir yandan kurbanı**
*Они зажгли жертвенный огонь, который полыхал во все стороны…*
**Çığlık et kan duman**
*Крики… дым… кровь… мясо…*
**Seyretti binlerce insan**
*А тысячи людей смотрели…*
**Davullar susmadı**
*Барабаны не молчали*
**İnsanlar konuşmadı**
*Люди не говорили*
**Büyücü dansına doymadı**
*Волшебница вошла во вкус танца*
**Çıkardı hançerini vurdu**
*Выхватила кинжал и ударила…*
**Bir damla kan akmadı**
*Капля крови не потекла*
**İnsanlar gri gri baktı**
*Люди выглядели серыми-серыми*
**Davullar sustu**
*Барабаны замолчали*
**Sessizce dağıldı topluluk**
*И люди тихо разошлись*
**Birkaç akbabayı doyurdu**
*Несколько грифов наелись*
**büyücünün leşi**
*От тела убитой ведьмы…*
**Ne insanların**
*Ни люди*
**ne büyücünün**
*Ни волшебница*

**gri gözleri**
*Ни серые глаза*
**Hiç ama hiç**
*Никогда*
**görmedi güneşi…**
*не увидят света солнца…*

*08.01.1997*



*Сяргей КАЯНОВІЧ*

*Каяновіч Сяргей Сяргеевіч нарадзіўся 01.01.1947 года ў Чарнаўцах. Дзяцінства і школьныя гады прайшлі ў Расіі, хаця бацька з-пад Хоцімска Магілёўскай вобласці. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Пасля яго заканчэння ў 1971 годзе прыехаў у Мінск, дзе раней закончыў універсітэт яго бацька. З гэтага часу пастаянна жыве ў Мінску, апроч двух гадоў службы ў Савецкай Арміі.*

*У БДТУ працаваў з 1990 па 1997 год старшым выкладчыкам на кафедры вышэйшай матэматыкі. Дацэнт кафедры матэматыкі Мінскага дзяржаўнага радыётэхнічнага вышэйшага каледжа. Падтрымлівае пастаянныя сувязі з літаратурным клубам "Ветліца".*

***

Дзве мовы ёсць славянскія на свеце,
Што пураўнальны між сабой па глыбіні.
А калі думаеш, пляту я з дуба вецце,
У пераклады з рускай зазірні.

Таксама загляні і той, хто згодны
З радкамі, што знаходзяцца вышэй;
Сустрэча лішні раз з прыгожым родным –
Як дыфірамб для стомленых вушэй.

Што я сказаў?!... Ды не бывае лішняй
Сустрэча з родным, толькі так пішы,
Як зерні-костачкі ад спелых вішняў,
Каб словы падалі на чарназём душы

І прарасталі … Падыходзячая глеба
Ёсць хоць у аднаго – не ўсе мы муляжы;
Душа не можа жыць адзіным хлебам –
Яна паэзіяй… і хлебам можа жыць!

*Пераклады*

*Антон Дэльвіг*

*Раз, абудзіўшыся ад сну…*

Раз, абудзіўшыся ад сну,
Бог, як калісьці ў даўніну,
Паліў цыгару ля акна
І кажа з сумам: "Даўніна …
Ствараў тады такія штукі!"

Трубу ў стваральныя ўзяў рукі –
Відаць Зямлю ўдалечыні.
“Цяпер жа для яе ані
Я не пасуну рук ці ног,
Хай возьме чорт Мяне, дальбог.”
У гэты час гарэлкі штоф
Прыклаў да вуснаў Саваоф:
“О людзі! Мне глядзець забаўна,
Як вамі я кірую слаўна.
Я даў вам дзевак і віно,
Адсоткі, зброю, казіно,…
І вы, бязмозгія клеўрэты,
За іх, нібы за парапеты,
Схаваліся … Прыемна мне,
Што жывяце заўжды ў вайне –
Люблю стан войнаў і трывог,
Гасподзь, вазьмі мяне, дальбог”

*Бог*

Між вамі карлікі-цары
Сабе зрабілі алтары,
І думаюць яны, буфоны,
Што Я надзеў на іх кароны
І права даў душыць людзей,
Што Я, прабачце, іудзей.
Я разганю ўвесь гэты смог,
Хай возьме чорт Мяне, дальбог.

*Саваоф*

Папы спяваюць мне рулады,
Паляць пад маім носам ладан,
Вам байкі аб скончэнні свету
Даюць за чыстую манету.
Не слухайце вы іх хлусні;
Хай вашы будучыя дні
Бягуць у святах і вяселлях,
Каб вашы рукі не віселі,
Як на шыбеніцах вяроўкі.
Будзь вы хоць чэрці, хоць чартоўкі,
У Божы рай ёсць шмат дарог,
Гасподзь, вазьмі мяне, дальбог.

*Іван Нікіцін*

*Ранак*

Зоркі блякнуць і гаснуць. Аблокі ў агні.
Густа пара ў лугах рассцілаецца.
Па люстранай вадзе, па лясной гушчыні
Ад Аўроры святло разліваецца.
Дрэмле чуткі чарот – тут прытулак для мар.
Ледзь прыметна сцяжынка расістая.

Куст зачэпіш плячом, – і адразу на твар
З лісцяў пырсне раса серабрыстая.
Ветрык вось пацягнуў, – рабаціць ён ваду.
Качкі зніклі з яе, бы прыснііліся.
Тс,… далёка званочак звініць на хаду,
Рыбакі ў будане абудзіліся,
Сеткі з жэрдак знялі, вёслы ў лодкі нясуць…
Ну, а ўсход паміж тым разгараецца.
Птушкі сонца чакаюць і песні пяюць,
І стаіць сабе лес, усміхаецца.
Вось і сонца ўзыходзіць і ззяе з-за ніў:
За лясамі начлег свой пакінула,
На палі, на лугі, на люстраны заліў
Залатымі патокамі хлынула.
Едзе хлопец з касой, едзе – песню пяе…
Каб касою яму не параніцца,
Кінь турботу, душа! Адпачні ад яе!
Ну, здарова, чароўная раніца!

*Аляксандр Пушкін*

## *Прарок*

Духоўнай прагай змардаваны,
Валокся я ў пустыні змрочнай.
Наўкол барханы і барханы …
Як ключ у шчыліне замочнай,
Так я пакручваўся між імі,
Пакуль мой погляд не застыў
На шасцікрылым серафіме.

Кудысь схавацца б у кусты.
Сярод барханаў? … Скажаш ты!...
І пальцам лёгкім быццам сон
Да зрэнкаў дакрануўся ён.
Яны расплюшчыліся мігам:
Свет ёсць разгорнутая кніга
Цяпер для іх… І да вушэй
Даткнуўся ён… І шаст мышэй,
Нябесны херувімаў лёт,
У моры гадаў ціхі ход –
Усё пачуў я… і таксама
Гібенне ўчуў далінных лоз,
Увасабленне далай-ламы
І зык, які нясе хаос…

Яшчэ я чуў выразны зык,
Як вырваў грэшны мой язык
Той шасцікрылы серафім,
Язык шматслоўны, хітраваты.
І абышоўшыся так з ім,
Каб замяніць язык узяты,
Запхнуў ён джала змея жвава
Ў мой рот разяўлены, крывавы.
Ён грудзі мне рассек мячом

І выняў сэрца трапяткое,
І вугаль, што гарэў агнём,
Замест яго сваёй рукою
Змясціў. Закончыўшы прыём,
Даў час жаданага спакою.

Ляжаў я трупам у пустыні,
Загублены іспытаў лікам,
Мозг плыў, як быццам рыба ў ціне,
І Бог тады мяне заклікаў:

“Прарок! Ты маеш вочы-вушы,
Каб чуць і бачыць ход падзей,
І вугаль-джала душы ўзрушыць –
Стань носьбітам маіх ідэй:
Іх несучы праз моры, сушы,
Шлі ў сэрцы спячыя людзей”.

### *Фёдар Цютчаў*

### *Дзве сілы ёсць…*

Дзве сілы ёсць – дзве ракавыя сілы,
Уюць што з нас вяроўкі, як з пянькі,
Ад дзён калыскавых і да магілы, –
Адна ёсць Смерць, другая – Суд людскі.
І той і тая роўна неадольны,
Будзь ты хоць велікан, хоць ліліпут –
Заўсёды перад імі паднявольны,
І стульвае ўсім вусны іх прысуд.
Смерць больш сумленна, бо непрадузята:
Вяршкі грамадства перад ёй або шпана,
Сустрэне еўрапейца, азіята –
Сваёй касой раўнуе ўсіх яна.
Свет не такі,… бо таленту, красы –
Раўнівы валадар – не зносіць ён,
І лепшыя за іншых каласы,
І толькі іх,… ён вырывае вон.
І гора ёй, на жаль, ужо прадбачу,
Той гордай сіле, горда-маладой,
Ступае што з надзеяю на ўдачу
Ў няроўны, цяжкі, непасільны бой,
Калі яна, у спешцы даўшы фору,
Пры разуменні суджаным правоў,
Ідзе сама насустрач абгавору,
Не бачачы ні церняў, ні равоў,
Ілба не прыкрывае лжывай маскай,
Хаця скланяецца яна на ўсе лады,
Пагрозы, пагарджаючы апаскай,
Як пыл здзімае з пасмаў маладых, –
Ды, гора ёй – чым больш яна сардэчна,
Больш вінаватай лічыцца яна …
Такі ўжо свет: ён больш бесчалавечны,
Дзе больш чыстасардэчная віна.

## *Джуни РУСС (Хапи Вако ЖЮНИОР)*



*Хапи Вако Жюниор приехал из Камеруна. Русский язык изучал на курсах в БГТУ в 2012–2013 учебном году. Закончил факультет технологии органических веществ. Сейчас учится в магистратуре.*

*Прекрасно владеет французским и немецким языками и многими языками народов Камеруна. Профессионально играл в футбол. Сейчас играет в футбольной команде БГТУ. Пишет стихи на французском языке. Член литературного клуба «Ветлица», активный участник многих мероприятий, проводимых клубом.*

### *Maman*

Pour toi maman qui m'a donne la vie
Pour toi qui a toujours ete la pour moi
Pour toi qui t'es toujours battue pour moi
Elle est mon ame, elle est mon souffle
Elle est ma flamme, et mon bonheur
Celle la qui m'a donne la vie
Elle fait partie de moi, elle est mon sang
Elle est mon bijou le plus precieux
Elle est ma plus grande richesse
A cote d'elle je serai jusqu'a la derniere seconde
Sans toi je suis vide comme un recipiant sans eau
Maman,merci pour  ton amour inconditionnel pour moi
Maman tu es celle qui ne ferme pas les yeux quand je rentre tard
Tu es celle qui est toujours de mon cote, meme quand j'ai tort
Oh maman, je suis desole pour  toutes nuits sans
sommeil, toutes ces migraines a cause de mes betises
sans toi, ma vie serait si durep, tu me console
et me raisonne, je t'ame maman, sa te fait mal
de me voir malheureux, tu resteras la femme de ma vie
malgre la distance, et les probleme de la vie, tu es toujours avec moi

### *Мама*

О, женщина, которая дала мне жизнь,
О, женщина, которая всегда была рядом.
Она моя душа, моё дыхание,

Она моё пламя, и моё счастье.
Она часть меня, она моя кровь,
Она – моя самая драгоценная драгоценность,
Она – моё самое большое богатство.

Рядом с ней я буду до последней секунды.
Без тебя я пустой, как море без воды,
Мама, спасибо тебе за бесконечную любовь ко мне,
Мама, ты та, кто не смыкает глаз,
Пока я домой не приду,
Ты та, кто всегда на моей стороне,
Даже если я ошибаюсь.
О, мама, я прошу прощения за все ночи бессонные,
За все эти мигрени из-за моих глупостей.

Без тебя, моя жизнь была бы такой тяжелой,
Ты утешишь меня и рассудишь меня,
Я люблю тебя, мама, и знаю:
Тебе больно будет увидеть меня несчастным,
Ты останешься женщиной моей жизни,
Несмотря на расстояния и проблемы жизни,
Ты всегда со мной.

## *Альперен ЧЕТИН*



*Я Альпэрен Четин. Мне 19 лет. Самый красивый и неэгоистический поэт в истории. Я родился в Турции в городе Манисе. Начал учиться в школе в городе Ялове, но окончил учёбу в городе Измире. Окончив лицей в 2017 году, я переехал в город Эскишехир, чтобы поступить в университет Анадолу на факультет русского языка и литературы. Там я изучал русский язык на подготовительном факультете 1 год. И в следующем году в Турции я буду продолжать учёбу в университете на первом курсе. Недавно я приехал в Минск, чтобы углубить изучение русского языка и приобрести русскоговорящих друзей.*

***

sevginden başka ilmik bağım yok yaşamla
gecenin sessizliğinde
kafamda gürültülü bir orkestra çalıyor
içini böceklerin kemirdiği
yerine bir gökdelen dökülmemiş
yıkık binalar kadar uzağım
diğerlerinin kurduğu şehire
peki ya kavuştuktan sonra?
sevmediğinde beni

### *Авторский перевод на русский язык*

***

нет даже ни одной
ниточки маленькой
с жизнью меня связавшей
кроме вечной любви твоей

слушаю против воли
в ночной тишине
играет шумный оркестр
только в моем голове

я как руины
города далёкого
я руины далекого города
предками созданого

если меня не станет
никто меня не вспомнит
пусть лучше меня забудут
и плакать перестанут

### *Яўгенія Янішчыц*

### *Люблю, калі сыдуць марозы*

Люблю,
калі сыдуць марозы:
Бясконцы раздольны прастор –
Зялёная радасць бярозак
І сіняя радасць азёр.

Я сінюю радасць
вітаю,
Гукаю зялёную ў сны…
І словы з душы вылятаюць,
Як ластаўкі з гнёздаў вясны.

### *Пераклад на турэцкую мову*

Seviyorum,
Buzların uzaklaşmasını
Uçsuz bucaksız sonsuzluklardan.
Yeşil huzurunu huş ağaçlarının,
Ve mavi göllerin

Mavi mutluluğu selamlıyorum
Rüyalarımda yeşili çağırıyorum
Ve bahar gelince,
Yuvalarından uça kuşlar gibi
Kelimeler de yüreğimden uçuyor.

### *Максім Багдановіч*

***

Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы
У ціхую сінюю ноч
І сказаць:
"Бачыце гэтыя буйныя зоркі,
Ясныя зоркі Геркулеса?
Да іх ляціць наша сонца,
І нясецца за сонцам зямля.
Хто мы такія?
Толькі падарожныя, – папутнікі сярод нябёс.
Нашто ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горыч,
Калі ўсе мы разам ляцім
Да зор?"

### *Пераклад на турэцкую мову*

Sessiz lacivert bir gecede
Tanismak isterdim sizinle
Ve soylemek:
Goruyor musunuz,
Su buyuk yildizlari?
Parlak herkul yildizlarini
Ardindan dunyayi da cekerek
Ona dogru ucar gunesimiz
Sadece gezginler, yolcular goklerin arasindaki
Ne icin dunya ustunde kavga ve surtusme?
Aci ve yangin?
Peki ya biz, hepimiz…
Ucsak yildizlara?



*Вольга ШАХАБ*

*Шахаб Вольга Васільеўна (у дзявоцтве Кузьміч; нар. 30 жніўня 1969 года) – беларускі філолаг, перакладчык. (Звесткі аб аўтару ў раздзеле ПРОЗА-ПЕРАКЛАД МІЖНАРОДНЫЯ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІЯ СУВЯЗІ).*

***

Мамачка. Татка. Братка мой родны.
Домік бабулі. Дзядуля лагодны.
Печка. Спякота. Азёрны абшар.
Лілеі. Каханне. Куслівы камар.

Поле. Валошкі. Вакол – канюшына.
А каля хаты – смарода, ажына.
Воддаль – аер, плёскат рыбы, бабёр,
Розгалас птушак і конікаў хор.

Брамка. Вяргіні. Ліпавы пах,
Пчолак гудзенне, бярозавы гмах.
Поўня. Трывога. Маланка. Нянасце.
Любы куточак! Суцэльнае шчасце!

*28.06.2016*

***

Ліпень. Спёка. Жаўрукі ў небе.
І духмяная, п'янлівая трава...
Маніць думкі, мой спакой бярэдзіць
Шэпт бярозы, колас, мурава.

Ці не тут дзяўчынай маладою
Спазнавала я любоў сваю
Да зямелькі-маці, што слязою
Паліла гаротную сям'ю.

Вось мае бабулі і дзядуля,
Цётухна, што здраду прыняла,
Маміны сястрычкі і татуля...
Не схавала ўсіх, не зберагла.

*Старшы выкладчык факультэта рускай мовы Цяньцзіньскага ўніверсітэта замежных моў, навуковы кіраўнік магістрантаў па кірунку «вусны і пісьмовы пераклад». Аспірант па спецыяльнасці «Пераклад партыйных і важных дзяржаўных дакументаў на замежныя мовы (руская)». Скончыла магістратуру факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 2010 г. З 2009 года – член Кітайскай асацыяцыі перакладчыкаў.*

*Удзельнік перакладчыцкай калегіі манаграфіі «Агляд кітайскай культуры» (на рускай мове), «Ключавыя словы Кітая» (2-ая частка, рыхтуецца да выдання), «Зборнік выступленняў і артыкулаў Сі Цзіньпіна» (2-ая частка, рыхтуецца да выдання). Сінхраніст (моўная пара – руская і кітайская мовы).*



*Юань ХАО*

*Аспірант Цяньцзіньскага ўніверсітэта замежных моў па спецыяльнасці «Пераклад партыйных і важных дзяржаўных дакументаў на замежныя мовы (руская)». Скончыў магістратуру філалагічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта ў 2017 г. Перакладчык-сінхраніст (моўная пара – руская і кітайская мовы). Заняў трэцяе месца на Усекітайскім конкурсе па вусным перакладзе з кітайскай мовы на замежныя мовы. Рабіў сінхронны пераклад на Урачыстай цырымоніі з нагоды дзесяцігоддзя Інстытута Канфуцыя і на Першым медыя-саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.*



*Цуй ШУЦІ*

*Нарадзілася 23 красавіка 1995 года ў вёсцы на поўначы Кітая. У 2013 г. пасля заканчэння школы паступіла ў Цяньцзіньскі ўніверсітэт замежных моў на факультэт рускай мовы і літаратуры. Зараз вучыцца ў магістратуры па кірунку “вусны пераклад”.*



*Хэ ЦІН*

*Нарадзілася 5 чэрвеня 1996 г. ў горадзе Тунлін правінцыі Анхой. У 2018 годзе скончыла Цяньцзіньскі ўніверсітэт замежных моў. У 2016-2017 годзе вучылася ў Дзяржаўным інстытуце рускай мовы імя А. С. Пушкіна.*

*Чжу ЦЗЫЦІН*

## *Постаць*

*Апавяданне*

***Чжу Цзыцін*** *(22 лістапада 1898 – 12 жніўня 1948) – кітайскі эсэіст, паэт, навуковец.*

*Нарадзіўся 22 лістапада 1898 года ў павеце Дунхай правінцыі Цзянсу. У 1901 годзе пераехаў у павятовы горад Шаобо, а затым у 1903 годзе – у Янчжоу. Там ён ідзе ў сярэднюю школу, якую скончыў у 1916 годзе. У тым жа годзе паступіў ў Пекінскі ўніверсітэт. Пасля ажаніўся. У 1920 годзе выкладае ў школах гарадоў Ханчжоу, Янчжоу, Шанхай і Нінбо. Актыўна займаецца літаратурнай дзейнасцю, становіцца вядомым паэтам. У 1925 годзе атрымлівае пасаду прафесара ў Пекінскім універсітэце. Пасля смерці жонкі (26 лістапада 1929 года) на некаторы час адыходзіць ад спраў. Потым, у 1932-1933 гадах, жыве ў Лондане, дзе вывучае англійс-*

*кую літаратуру. Тут ізноў пабраўся шлюбам (4 жніўня 1932 года). Па вяртанні становіцца выкладчыкам ва ўніверсітэце Цінхуа (Пекін). З пачаткам у 1937годзе Другой японска-кітайскай вайны Чжу Цзыцін далучаецца да ўрада Чан Кайшы. Разам з ім адступае на захад. Жыў у гарадах Чанша, Куньмін і Чэнду. Адначасова працягваў выкладанне ў розных вну краіны. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны вярнуўся ў Пекін. Тут ён быў прызначаны старшынёй Дэпартамента кітайскай мовы ва ўніверсітэце Цінхуа. У 1948 годзе Чжу стаў пакутаваць ад праблем са страўнікам. 18 чэрвеня таго ж года ў знак пратэсту супраць палітыкі ўрада ЗША адмовіўся ад ежы. 12 жніўня 1948 года ў выніку перфарацыі страўніка памёр у бальніцы ўніверсітэта Цінхуа. Яго галоўныя творы – «Постаць», «Запіскі пра падарожжа ў Еўропе», «Ты і я», «Вывучэнне мовы паэзіі», «Трошкі пра новую паэзію», «Крытэрыі і меры». Самая вядомая паэма Чжу Цзыціна – «Руіны».*

## 背影

## 作者：朱自清

（Zhu Ziqing）

我与父亲不相见已二年余了，我最不能忘记的是他的背影。那年冬天，祖母死了，父亲的差使也交卸了，正是祸不单行的日子，我从北京到徐州，打算跟着父亲奔丧回家。到徐州见着父亲，看见满院狼藉的东西，又想起祖母，不禁簌簌地流下眼泪。父亲说，“事已如此，不必难过，好在天无绝人之路！”

回家变卖典质，父亲还了亏空；又借钱办了丧事。这些日子，家中光景很是惨淡，一半为了丧事，一半为了父亲赋闲。丧事完毕，父亲要到南京谋事，我也要回北京念书，我们便同行。

到南京时，有朋友约去游逛，勾留了一日；第二日上午便须渡江到浦口，下午上车北去。父亲因为事忙，本已说定不送我，叫旅馆里一个熟识的茶房陪我同去。他再三嘱咐茶房，甚是仔细。但他终于不放心，怕茶房不妥帖；颇踌躇了一会。其实我那年已二十岁，北京已来往过两三次，是没有甚么要紧的了。他踌躇了一会，终于决定还是自己送我去。我两三回劝他不必去；他只说，“不要紧，他们去不好！”

我们过了江，进了车站。我买票，他忙着照看行李。行李太多了，得向脚夫行些小费，才可过去。他便又忙着和他们讲价钱。我那时真是聪明过分，总觉他说话不大漂亮，非自己插嘴不可。但他终于讲定了价钱；就送我上车。他给我拣定了靠车门的一张椅子；我将他给我做的紫毛大衣铺好坐位。他嘱我路上小心，夜里警醒些，不要受凉。又嘱托茶房好好照应我。我心里暗笑他的迂；他们只认得钱，托他们直是白托！而且我这样大年纪的人，难道还不能料理自己么？唉，我现在想想，那时真是太聪明了！

我说道，“爸爸，你走吧。”他望车外看了看，说，“我买几个橘子去。你就在此地，不要走动。”我看那边月台的栅栏外有几个卖东西的等着顾客。走到那边月台，须穿过铁道，须跳下去又爬上去。父亲是一个胖子，走过去自然要费事些。我本来要去的，他不肯，只好让他去。我看见他戴着黑布小帽，穿着黑布大马褂，深青布棉袍，蹒跚地走到铁道边，慢慢探身下去，尚不大难。可是他穿过铁道，要爬上那边月台，就不容易了。他用两手攀着上面，两脚再向上缩；他肥胖的身子向左微倾，显出努力的样子。这时我看见

他的背影，我的泪很快地流下来了。我赶紧拭干了泪，怕他看见，也怕别人看见。我再向外看时，他已抱了朱红的橘子望回走了。过铁道时，他先将橘子散放在地上，自己慢慢爬下，再抱起橘子走。到这边时，我赶紧去搀他。他和我走到车上，将橘子一股脑儿放在我的皮大衣上。于是扑扑衣上的泥土，心里很轻松似的，过一会说，“我走了；到那边来信！”我望着他走出去。他走了几步，回过头看见我，说，“进去吧，里边没人。”等他的背影混入来来往往的人里，再找不着了，我便进来坐下，我的眼泪又来了。

近几年来，父亲和我都是东奔西走，家中光景是一日不如一日。他少年出外谋生，独力支持，做了许多大事。那知老境却如此颓唐！他触目伤怀，自然情不能自已。情郁于中，自然要发之于外；家庭琐屑便往往触他之怒。他待我渐渐不同往日。但最近两年的不见，他终于忘却我的不好，只是惦记着我，惦记着我的儿子。我北来后，他写了一信给我，信中说道，“我身体平安，惟膀子疼痛利害，举箸提笔，诸多不便，大约大去之期不远矣。”我读到此处，在晶莹的泪光中，又看见那肥胖的，青布棉袍，黑布马褂的背影。唉！我不知何时再能与他相见！

*1925年10月在北京。*

*Пераклад Фу Мэйянь, Вольгі Шахаб, Юэн Хао*

Прайшло ўжо больш за два гады з таго часу, як я апошні раз бачыў бацьку. Але я заўсёды помню яго выгляд са спіны. Узімку два гады таму памерла мая бабуля, а мой бацька толькі што страціў працу. Як кажуць, бяда адна не ходзіць. Я паехаў з Пекіна ў горад Сюйчжоў і спяшаўся разам з бацькам на пахаванне бабулі. Пабачыўшы мітуслівы сямейны двор, я ўспомніў бабулю і заплакаў. Бацька мяне суцяшаў: «Яна ўжо сышла, не сумуй. ...»

На радзіме бацька прадаў усю маёмасць, каб выплаціць доўг. Але каб справіць памінкі, давялося зноў пазычаць грошы ў сяброў. І пахаванне бабулі, і беспрацоўе штурхнулі нашу сям'ю ў фінансавую пастку. Пасля пахавання бацька павінен быў паехаць у Нанкін шукаць працу. А я – у Пекін працягваць вучобу. Нарэшце разам з бацькам мы выправіліся ў дарогу.

Калі мы прыехалі ў Нанкін, адзін сябра запрасіў мяне пагуляць па горадзе, і я спыніўся там на дзень. На другі дзень ранкам мне трэба было пераплыць раку Янцзы на параходзе і пасля абеду паехаць у Пекін на цягніку. Бацька сказаў, што ён вельмі заняты і, напэўна, не зможа правесці мяне. Таму ён даручыў знаёмаму афіцыянту ў рэстаране пры гатэлі правесці мяне на вакзал. Ён доўга шматразова паўтараў яму ўсе дробязі, але ўсё ж не мог супакоіцца. Ён баяўся, што афіцыянт не здолее так паклапаціцца пра мяне, як ён. Запомнілася, што бацька зашмат гаварыў і даваў розных парад! Мне на той час ужо споўнілася дваццаць гадоў, і я ўжо неаднаразова ездзіў у Пекін. Пасля доўгіх ваганняў ён вырашыў сам суправаджаць мяне на вакзал. Я спрабаваў адгаварыць яго ад гэтага, але ён толькі сказаў: «Гэта няважна. Будзе лепей, калі я сам паеду з табой».

Мы з бацькам пераправіліся праз раку і ўвайшлі ў памяшканне вакзала. Я пайшоў па білет, а ён сачыў за багажом, якога ў мяне было досыць многа. Давялося наняць насільшчыка. І бацька пачаў таргавацца з ім. На тыя гады я лічыў сябе самым разумным. Мне падалося, што бацька размаўляе нетактоўна. Але яны нарэшце дамовіліся пра кошт. Правёўшы мяне ў вагон, бацька заняў месца каля ўваходу. Я паклаў фіялетавае футравае паліто на сваё месца. Бацька загадаў мне быць пільным і асцярожным у дарозе і хваляваўся, каб я не прастудзіўся ўначы. Ён таксама па-

прасіў праваднікоў паклапаціцца пра мяне. Я ўсміхаўся з-за непрактычнасці бацькі. Дарма ён дае ім даручэнні. Яны цікавяцца толькі грашыма. Да таго ж, я ўжо дарослы. Хіба не магу я паклапаціцца пра сябе? Эх! Які ж "разумны" я быў у той час!

Я сказаў бацьку: "Тата, ідзі дахаты". Але ён, глянуўшы ў акно, прамовіў: "Я іду па мандарыны. Чакай мяне тут. Не адыходзь". Я ўбачыў, што за другой платформай стаяць некалькі латочнікаў, якія чакаюць пакупнікоў. Але каб дайсці да яе, бацька павінен быў саскочыць з нашай платформы, перайсці чыгуначнае палатно і падняцца на другую платформу. Для такога таўстуна, як мой бацька, гэта было даволі цяжка. Я памкнуўся пайсці сам, але бацька быў настойлівы і не пагадзіўся. Тата ў чорнай цюбецейцы, цёмна-сінім ватным халаце і чорнай кітайскай куртцы зверху ішоў, перавальваючыся, па чыгуначных рэйках. Ён павольна злез з платформы. Гэта было яму яшчэ не вельмі цяжка. Але падняцца на другую платформу было нашмат складаней. Ён абедзвюма рукамі схапіў край платформы, а ногі закідваў угару. Яго поўнае цела злёгку нахілілася ўлева. Відаць было, што ён стараўся падняцца з усяе сілы. Убачыўшы гэта, я больш не змог стрымаць слёз. Але хутка выцер іх, каб ні ён, ні іншыя не заўважылі, што я плачу. Калі я зноў паглядзеў у акно, бацька ўжо ішоў назад з аранжавымі мандарынамі ў руках. Ідучы праз чыгуначнае палатно, ён спачатку паклаў мандарыны на зямлю, павольна спусціўся, потым зноў падняў іх. Калі ён падышоў да цягніка, я паспяшаўся падтрымаць яго пад руку. Пасля мы вярнуліся ў вагон, ён паклаў усе мандарыны на маё паліто і, пахлопваючы па кішэнях, стаў абтрасаць бруд са сайго адзення. Ён выглядаў вельмі бесклапотна. Праз некаторы час ён сказаў: "Мне трэба ісці. Не забудзься пісаць мне!" Я ўважліва глядзеў яму ў спіну, калі ён выходзіў з вагона. Зрабіўшы некалькі крокаў, бацька павярнуўся тварам да мяне і сказаў: "Вяртайся на сваё месца. Не пакідай свае рэчы без нагляду". Я, аднак, не выканаў яго просьбу, пакуль яго постаць не згубілася сярод мітуслівага натоўпу. Мае вочы зноў былі мокрымі ад слёз.

У апошнія гады мы з бацькам жылі вандроўніцкім жыццём. І яно становілася ўсё горшым і горшым. У маленстве ён ўжо пакінуў бацькоўскую хату, каб зарабіць на жыццё. Ён зрабіў шмат вялікіх спраў. У той час ніхто не мог падумаць, што яму так дрэнна будзе ў старасці. Разгублены стан нарадзіў нясцерпную глыбокую тугу, і яго нерэалізаваныя эмоцыі павінны былі знайсці выхад. Вось чаму нават дробязі часта злавалі яго, і тым часам адносіны яго да мяне станавіліся ўсё горшымі і горшымі. Тым не менш, наша расставанне ў апошнія два гады зрабіла яго больш спагадлівым да мяне. Ён пачаў клапаціцца пра мяне, свайго сына, як і раней. Пасля майго прыезду ў Пекін ён напісаў мне ў пісьме: "У мяне ўсё добра, толькі моцна баліць плячо. Таму не магу карыстацца палачкамі і пэнзлікамі для пісьма. Магчыма, мне засталося нядоўга жыць". Праз слёзы, што паліліся ад гэтых слоў, я зноў уявіў шырокую спіну бацькі ў цёмна-сінім ватным халаце і чорную цюбецейку з тканіны. О Божа, ці магу я быць упэўненым, што ўбачу бацьку зноў?!

*Сань МАО*

## *Рэстаран у пустыні*

*Апавяданне*

***Сань Мао** (26 сакавіка 1943 – 4 студзеня 1991) – вядомая кітайская пісьменніца, нарадзілася ў 1943 годзе ў Чунцыні. У 1948 годзе яна разам з бацькамі перасялілася на Тайвань. У 1964 годзе паступіла на філасофскі*

*факультэт Кітайскага культурнага ўніверсітэта. З 1967 і на працягу наступных трох гадоў вучылася ў Іспаніі ў Мадрыдскім гуманітарным універсітэце. Пасля вучылася ў Германіі, адначасова працавала ў прававой бібліятэцы Ілінойскага ўніверсітэта ў Амерыцы. Атрыманыя за гэты час вопыт і моўныя навыкі сталі важнай базай для яе далейшага жыцця. У 1970 годзе вярнулася ў Кітайскі ўніверсітэт культуры, дзе стала выкладаць філасофію, але пасля раптоўнай смерці будучага мужа ад сардэчнага прыступу накіравалася ў Іспанію. Там яна сустрэла Хасэ Мар'яна Куэра, які на той час працаваў вадалазам і кахаў яе ўжо шэсць гадоў. У 1973 годзе ў маленькім паселішчы Эль-Аюн у Заходняй Сахары яна пабралася з ім шлюбам.*

*У гэты перыяд у Сань Мао раскрываецца яе пісьменніцкі талент. Атрымліваючы падтрымку галоўнага рэдактара Аб'яднанай газеты, яна стала выдаваць уласныя творы. У 1979 Хасэ нечакана загінуў падчас чарговага падводнага пагружэння. Пасля смерці мужа Сань Мао вярнулася на Тайвань. У 1984 годзе па стане здароўя сыходзіць з універсітэта і займаецца пісьменніцкай дзейнасцю. У 1990 годзе піша сцэнарыі. Першы з іх – «Мірская мітусня» на кітайскай мове. На жаль, ён стаў яе апошняй працай. Пісьменніца пакончыла з сабой 4 студзеня 1991 года, але загадка яе смерці да гэтага часу не разгадана.*

*Сань Мао любіла сваю радзіму. Ужо ў раннім узросце выказала меркаванне, што «два берагі нельга раз'ядноўваць». У 1985 годзе яна, выступаючы перад шматлікай аўдыторыяй, праспявала Дзяржаўны гімн КНР «Добраахвотніцкі марш». Яна была першай на Тайвані, хто адкрыта праспяваў гэтую песню. Сань Мао была звязана цеснай дружбай з культурнымі дзеячамі Кітая, у тым ліку з такімі, як Чжан Лэпін, Яо Сюеінь, Цзя Пінва, Ван Лобінь.*

*Сярод самых вядомых яе твораў – «Апавяданні Сахары», «Журботны вярблюд».*

## 沙漠中的饭店

作者：三毛
（San Mao）

我的先生很可惜是一个外国人。这样来称呼自己的先生不免有排外的味道，但是因为语文和风俗在各国之间确有大不相同之处，我们的婚姻生活也实在有许多无法共通的地方。

当初决定下嫁给荷西时，我明白的告诉他，我们不但国籍不同，个性也不相同，将来婚后可能会吵架甚至于打架。他回答我："我知道你性情不好，心地却是很好的，吵架打架都可能发生，不过我们还是要结婚。"于是我们认识七年之后终于结婚了。我不是妇女解放运动的支持者，但是我极不愿在婚后失去独立的人格和内心的自由自在化，所以我一再强调，婚后我还是"我行我素"，要不然不结婚。荷西当时对我说："我就是要你'你行你素'，失去了你的个性和作风，我何必娶你呢！"好，大丈夫的论调，我十分安慰。做荷西的太太，语文将就他。可怜的外国人，"人"和"入"这两个字教了他那么多遍，他还是分不清，我只有讲他的话，这件事总算放他一马了。（但是将来孩子来了，打死也要学中文，这点他相当赞成。）

闲话不说，做家庭主妇，第一便是下厨房。我一向对做家事十分痛恨，但对煮菜却是十分有兴趣，几只洋葱，几片肉，一炒变出一个菜来，我很欣

赏这种艺术。

母亲在台湾，知道我婚姻后因为荷西工作的关系，要到大荒漠地区的非洲去，十二分的心痛，但是因为钱是荷西赚，我只有跟了饭票走，毫无选择的余地。婚后开厨不久，我们吃的全部是西菜。后来家中航空包裹飞来接济，我收到大批粉丝、紫菜、冬菇、生力面、猪肉干等珍贵食品，我乐得爱不释手，加上欧洲女友寄来罐头酱油，我的家庭“中国饭店”马上开张，可惜食客只有一个不付钱的。（后来上门来要吃的朋友可是排长龙啊！）

其实母亲寄来的东西，要开“中国饭店”实在是不够，好在荷西没有去过台湾，他看看我这个“大厨”神气活现，对我也生起信心来了。第一道菜是“粉丝煮鸡汤”。荷西下班回来总是大叫：“快开饭啊，要饿死啦！”白白被他爱了那么多年，回来只知道叫开饭，对太太却是正眼也不瞧一下，我这“黄脸婆”倒是做得放心。话说第一道菜是粉丝煮鸡汤，他喝了一口问我：“咦，什么东西？中国细面吗？”“你岳母万里迢迢替你寄细面来？不是的。”“是什么嘛？再给我一点，很好吃。”我用筷子挑起一根粉丝：“这个啊，叫做‘雨’。”“雨？”他一呆。我说过，我是婚姻自由自在化，说话自然心血来潮随我高兴，“这个啊，是春天下的第一场雨，下在高山上，被一根一根冻住了，山胞札好了背到山下来一束一束卖了米酒喝，不容易买到哦！”荷西还是呆呆的，研究性的看看我，又去看看盆内的“雨”，然后说：“你当我是白痴？”我不置可否。“你还要不要？”回答我：“吹牛大王，我还要。”以后他常吃“春雨”，到现在不知道是什么东西做的。有时想想荷西很笨，所以心里有点悲伤。第二次吃粉丝是做“蚂蚁上树”，将粉丝在平底锅内一炸，再洒上绞碎的肉和汁。荷西下班回来一向是饿的，咬了一大口粉丝，“什么东西？好像是白色的毛线，又好像是塑胶的？”“都不是，是你钓鱼的那种尼龙线，中国人加工变成白白软软的了。”我回答他。他又吃了一口，莞尔一笑，口里说道：“怪名堂真多，如果我们真开饭店，这个菜可卖个好价钱，乖乖！”那天他吃了好多尼龙加工白线。第三次吃粉丝，是夹在东北人的“合子饼”内与菠菜和肉绞得很碎当饼馅。他说：“这个小饼里面你放了沙鱼的翅膀对不对？我听说这种东西很贵，难怪你只放了一点点。”我笑得躺在地上。“以后这只很贵的鱼翅膀，请妈妈不要买了，我要去信谢谢妈妈。”我大乐，回答他：“快去写，我来译信，哈哈！”

有一天他快下班了，我趁他忘了看猪肉干，赶快将藏好的猪肉干用剪刀剪成小小的方块，放在瓶子里，然后藏在毯子里面。恰好那天他鼻子不通，睡觉时要用毛毯，我一时里忘了我的宝贝，自在一旁看那第一千遍《水浒传》。他躺在床上，手里拿个瓶子，左看右看，我一抬头，哗，不得了，“所罗门王宝藏”被他发现了，赶快去抢，口里叫着：“这不是你吃的，是药，是中药。”我鼻子不通，正好吃中药。”他早塞了一大把放在口中，我气极了，又不能叫他吐出来，只好不响了。“怪甜的，是什么？”我没好气的回答他：“喉片，给咳嗽的人顺喉头的。”“肉做的喉片？我是白痴？”第二天醒来，发觉他偷了大半瓶去送同事们吃，从那天起，只要是他同事，看见我都假装咳嗽，想再骗猪肉干吃，包括回教徒在内。（我没再给回教朋友吃，那是不道德的。）

反正夫妇生活总是在吃饭，其他时间便是去忙着赚吃饭的钱，实在没多大意思。有天我做了饭卷，就是日本人的“寿司”，用紫菜包饭，里面放些唯他肉松。荷西这一下拒吃了。“什么，你居然给我吃印蓝纸，复写纸？”我慢慢问他，“你真不吃？”“不吃，不吃。”好，我大乐，吃了一大堆饭卷。“张开口来我看？”他命令我。“你看，没有蓝色，我是用反面复写纸卷的，不会染到口里去。”反正平日说的是唬人的话，所以常常胡说八道。“你是吹牛大王，虚虚实实，我真恨你，从实招来，是什么嘛？”“你对中国完全不认识，

我对我的先生相当失望。”我回答他，又吃一个饭卷。他生气了，用筷子一夹夹了一个，面部大有壮士一去不复返的悲壮表情，咬了半天，吞下去。“是了，是海苔。”我跳起来，大叫：“对了，对了，真聪明！”又要跳，头上吃了他一记老大爆栗。

中国东西快吃完了，我的“中国饭店”也舍不得出菜了，西菜又开始上桌。荷西下班来，看见我居然在做牛排，很意外，又高兴，大叫：“要半生的。马铃薯也炸了吗？”连给他吃了三天牛排，他却好似没有胃口，切一块就不吃了。“是不是工作太累了？要不要去睡一下再起来吃？”“黄脸婆”有时也温柔。“不是生病，是吃得不好。”我一听唬一下跳起来。“吃得不好？吃得不好？你知道牛排多少钱一斤？”“不是的，太太，想吃‘雨’，还是岳母寄来的菜好。”“好啦，中国饭店一星期开张两次，如何？你要多久下一次‘雨’？”

有一天荷西回来对我说：“了不得，今天大老板叫我去。”“加你薪水？”我眼睛一亮。“不是——”我一把抓住他，指甲掐到他肉里去。“不是？完了，你给开除了？天啊，我们——”“别抓我嘛，神经兮兮的，你听我讲，大老板说，我们公司谁都被请过到我家吃饭，就是他们夫妇不请，他在等你请他吃中国菜——”“大老板要我做菜？不干不干，不请他，请同事工友我都乐意，请上司吃饭未免太没骨气，我这个人啊，还谈些气节，你知道，我——”我正要大大宣扬中国人的所谓骨气，又讲不明白，再一接触到荷西的面部表情，这个骨气只好梗在喉咙里啦！

第二日他问我，“喂，我们有没有笋？”家里筷子那么多，不都是笋吗？”他白了我一眼。“大老板说要吃笋片炒冬菇。”乖乖，真是见过世面的老板，不要小看外国人。“好，明天晚上请他们夫妇来吃饭，没问题，笋会长出来的。”荷西含情脉脉的望了我一眼，婚后他第一次如情人一样的望着我，使我受宠若惊，不巧那天辫子飞散，状如女鬼。

第二天晚上，我先做好三道菜，用文火热着，布置了有蜡炬的桌子，桌上铺了白色的桌布，又加了一块红的铺成斜角，十分美丽。这一顿饭吃得宾主尽欢，不但菜是色香味俱全，我这个太太也打扮得十分干净，居然还穿了长裙子。饭后老板夫妇上车时特别对我说：“如果公共关系室将来有缺，希望你也来参加工作，做公司的一份子。”我眼睛一亮。这全是“笋片炒冬菇”的功劳。

送走老板，夜已深了，我赶快脱下长裙，换上牛仔裤，头发用橡皮筋一绑，大力洗碗洗盆，重做灰姑娘状使我身心自由。荷西十分满意，在我背后问，“喂，这个‘笋片炒冬菇’真好吃，你哪里弄来的笋？”我一面洗碗，一面问他：“什么笋？”今天晚上做的笋片啊！”我哈哈大笑：“哦，你是说小黄瓜炒冬菇吗？”“什么，你，你，你骗了我不算，还敢去骗老板——？”“我没有骗他，这是他一生吃得最好的一次‘嫩笋片炒冬菇’，是他自己说的。”

荷西将我一把抱起来，肥皂水洒了他一头一胡子，口里大叫：“万岁，万岁，你是那只猴子，那只七十二变的，叫什么，什么……。”我拍了一下他的头，“齐天大圣孙悟空。这次不要忘记了。”

*Пераклад Лі Мэнья, Вольгі Шахаб, Цуй Шуцi*

Мой муж, на жаль, іншаземец. Выходзіць, што, называючы так свайго мужа, я быццам бы па-варожы стаўлюся да ўсіх іншаземцаў, але ў нашым сумесным сямейным жыцці насамрэч ёсць шмат незразумелага, бо філасофія і традыцыі нашых краін зусім розныя.

Калі я вырашыла выйсці замуж за Хасэ, выразна ўсведамляла, што ў нас не толькі рознае грамадзянства, але і неаднолькавыя характары, таму

ў будучым сямейным жыцці мы можам сварыцца і нават біцца. Ён адказаў: "Я ведаю, што ты часта злуешся, але ў цябе добрая душа. Можа, і будуць сваркі і бойкі, але нам неадкладна трэба пабрацца шлюбам". Таму праз сем гадоў з часу нашага знаёмства мы нарэшце ажаніліся. Я не прыхільніца фемінізму, але зусім не хачу губляць свой уласны характар і душэўную свабоду, таму не раз падкрэслівала, што пасля вяселля ў любым выпадку буду "рабіць тое, што хачу", інакш лічыла б за лепшае не выходзіць замуж. Хасэ ў той час сказаў мне: "Менавіта гэтага я хачу. Навошта мне шлюб з табой, калі ў цябе не будзе свайго характару і стылю?" Выдатна, ён паводзіў сябе як сапраўдны мужчына, і мяне гэта суцяшала. Стаўшы жонкай Хасэ, я патурала яму ў моўных пытаннях. Бедны іншаземец, колькі б разоў я ні вучыла яго бачыць адрозненне паміж іерогліфамі «人» і «入», ён ніяк не мог іх адрозніць. Мне давядзецца размаўляць на яго мове. У гэтым пытанні я ўсё ж адступіла. Але калі ў нас будзе дзіця, абавязкова трэба вучыць яго кітайскай мове, і Хасэ цалкам згодны з гэтым).

Без лішніх слоў, каб быць добрай хатняй гаспадыняй, патрэбна ўмець гатаваць ежу. Я заўсёды ненавідзела выконваць хатнія абавязкі, але што тычыцца гатавання ежы, то гэты працэс мне цікавы. Бяру некалькі цыбулін, трошкі мяса, пасмажу трохі – і страва гатовая. Мне падабаецца гэта мастацтва. Мая маці (на той час) знаходзілася на Тайвані, і яна ведала, што пасля вяселля з-за працы Хасэ нам патрэбна ехаць у Афрыку, дзе пяскі і пустыня. Ёй было балюча на душы. Але грошы зарабляў Хасэ, таму мне давялося ехаць за мужам, выбару не было. Пасля вяселля, як толькі я пачынала гатаваць, мы елі толькі еўрапейскія стравы. Пазней бацькі дасылалі нам пэўныя прадукты для гатавання ежы, такія, як фунчозу, сушаныя водарасці, кітайскія чарнушкі, локшыну хуткага прыгатавання, вяленую свініну і іншае. Я была вельмі рада такім пачастункам. Пры гэтым мая еўрапейская сяброўка дасылала нам кансервы і соевы соус. І вось мой хатні "кітайскі рэстаран" адкрыўся. Але, на жаль, у мяне быў толькі адзін кліент – мой муж. Пазней перад нашым домам была агромністая чарга з нашых сяброў, якія хацелі ежу, прыгатаваную мной, паспытаць.

На самой справе тых прадуктаў, якія дасылала маці, далёка не хапала для адкрыцця "кітайскага рэстарана". Добра, што Хасэ ніколі не быў на Тайвані. Ён бачыў, што я як "шэф-повар" з вялікім апломбам, і ў яго з'явілася перакананне ў маіх здольнасцях. Першы раз я прыгатавала курыны булён з фунчозай. Пасля працы, калі Хасэ вяртаўся дахаты, ён заўсёды гукаў: "Хутчэй накрывай на стол! Я памру з голаду!" Быццам бы кахае мяне шмат гадоў, а, вяртаючыся дахаты, толькі і ведае, што крычыць "хачу есці" і нават не гляне на жонку. А я ж павінна быць бездакорнай жонкай, якая разумее свайго мужа і яго патрабаванні. Сведчаннем таму стаў эпізод, калі я ўпершыню прыгатавала мужу курыны булён з фунчозай. Ён трохі з'еў і запытаўся ў мяне:"Ого, гэта што? Кітайская тонкая локшына? Мая цешча даслала табе тонкую локшыну праз такі доўгі шлях? Не-а. Што гэта такое? Дай мне яшчэ, вельмі смачна".

Я сціснула палачкамі адну локшыну з крухмалу: "Вось гэта называецца дожджык". "Дожджык?" – ён анямеў. Я ж імкнулася быць вольнай і нязмушанай пасля вяселля, таму казала ўсё што заўгодна, тое, што першым прыйшло ў галаву. Я фантазіравала: "Вось гэта першы веснавы дождж. Дажджы ішлі на высокай гары, замярзалі адзін за адным, затым сяляне, што жывуць там, завязвалі гэтыя замарожаныя дажджы, прадавалі ахапкамі для таго, каб набыць рысавую гарэлку. Нялёгка купіць гэты "дожджык"!"

Хасэ пільна паглядзеў на мяне, затым на "дажджы" і запытаўся:"Ты лічыш мяне дурнем?" Я нічога не адказала. "Хочаш яшчэ?" "Канешне хачу".

Пасля таго ён часта еў “веснавы дожджык”, але дагэтуль не ведае, з чаго ён зроблены. Мімаволі ўзнікаюць думкі, што Хасэ часам абмежаваны, таму ад гэтага трохі сумна на душы.

Другім разам елі фунчозу, калі я прыгатавала страву пад назвай “мурашы лезуць на дрэва”. Пасмажыла фунчозу на патэльні, потым рассыпала фарш і мясны соус. Пасля працы Хасэ, як заўсёды галодны, схапіў вялікі кавалак фунчозы: “Што гэта? Падобна на белую поўсць, яшчэ і быццам з пластмасы”. “Не, гэта як твая нейлонавая леска, кітайцы апрацавалі яе, і леска стала белай і мяккай,” – так я адказала. Ён з’еў яшчэ, усміхнуўся і сказаў: “Ты вялікая фантазёрка. Калі б мы, мая дарагая, сапраўды адкрылі рэстаран, то атрымалі б за гэтую страву шмат грошай!” У той дзень ён з’еў шмат белай апрацаванай лескі. Трэці раз я пакрышыла мяса, шпінат і фунчозу як начынне, затым фаршыравала “яечныя піражкі”, якія паўднёва-ўсходнім кітайцам вельмі падабаюцца. Ён запытаўся::

– Ты дадала плаўнікі акулы ў гэтыя піражкі, так? Я чуў, што такія плаўнікі вельмі дарагія, нездарма ты дадала іх ў невялікай колькасці (я рассмяялася). Далей хай мама больш не купляе гэтыя дарагія плаўнікі акулы, я зараз напішу пісьмо і падзякую ёй”. Я ад душы парагатала і адказала яму: “Ідзі пішы, я перакладу, ха-ха!”.

Аднойчы перад тым як ён павінен быў вярнуцца з працы, я скарыстала момант, калі Хасэ забыўся на вяленую свініну, хутка парэзала яе на маленькія кубікі, паклала іх у бутэльку і схавала яе пад коўдру. Менавіта ў гэты дзень у яго заклала нос і коўдра была яму патрэбна. Я зусім забылася на “мой скарб”, сама ў тысячны раз чытала “Рачныя затокі” ( кітайскі раман пятнаццатага стагоддзя, аўтар Шы Найань). Хасэ ляжаў на ложку, трымаў у руках бутэльку і пакручваў яе туды-сюды. Я падняла галаву і ўбачыла, што ён знайшоў мой скарб! Я паспяшалася адабраць і крыкнула:” Гэта не для цябе, гэта лекі, кітайскія лекі!”. “У мяне закладзены нос, кітайскія лекі якраз спатрэбяцца”, – сказаў ён і запіхнуў жменю ў рот. Я вельмі раззлавалася, але не магла прымусіць яго выплюнуць, давялося замаўчаць. “Салодкае нейкае, гэта што?” Я адказала нядобра: “Лекі ад кашлю”. “Лекі ад кашлю? Я што ідыёт?”. На наступны дзень я прачнулася і заўважыла, што ён скраў больш за палову бутэлькі і падзяліўся змесцівам з калегамі. З таго часу яго калегі, у тым ліку мусульмане, заўважыўшы мяне, пачыналі кашляць, каб мой муж падзяліўся вяленай свінінай (я больш не давала сябрам-мусульманам, бо гэта было амаральна).

У сямейным жыцці заўсёды ёсць тэма ежы. А ў астатні час неабходна спяшацца зарабляць грошы на ежу. Сапраўды нецікава. Аднойчы я прыгатавала ролы з рысу, як “сушы” ў японцаў. Закруціла рыс у норы, дадала мяснога парашку. Хасэ ў гэты раз адмовіўся есці: “Што? Ты дала мне капіравальную паперу?” Я павольна запыталася ў яго: ”Ты сапраўды не будзеш есці?” “Не, не буду”. Я ўзрадавалася і з’ела сама шмат ролаў. “Адкрый рот, дай паглядзець”, – загадаў ён мне. “Глядзі, няма сіняга колеру, я выкарыстала адваротны бок капіркі, таму мой язык падфарбаваўся”. Усё роўна я ўвесь час несла лухту. “Ты манюка, часам хлусіш, часам кажаш праўду. Што гэта?” Я адказала мужу, што ён зусім не ведае Кітай. І для пацвярджэння з’ела яшчэ адзін рол. Ён раззлаваўся, узяў палачкамі рол і з патэтычным выразам твару, быццам не шкадуючы сябе самога, смакаваў доўгі час, затым праглынуў:”Так, гэта норы!” Я падскочыла і закрычала:”Правільна! Разумнік!” Хацела яшчэ падскочыць, але па лбе атрымала моцную пстрычку.

Кітайскія прадукты скончыліся, і мне было шкада падаваць ежу ў мой “кітайскі рэстаран”. На стале зноў з’явілася еўрапейская кухня. Пасля працы Хасэ ўбачыў, што я прыгатавала стэйк з ялавічыны, і гэта быў для яго

прыемны сюрпрыз, ён гучна закрычаў: ”Хачу не самы прапечаны. А бульбу ты таксама пасмажыла?” Цэлыя тры дні карміла яго стэйкам з ялавічыны, але Хасэ быццам страціў апетыт, адразаў кавалак біфштэксу і тут жа пераставаў есці. “Ты стаміўся на працы? Хочаш спачатку паспаць, потым паесці?” “Немаладая жонка” часам таксама бывае ласкавая. “Не захварэў, проста я дрэнна пад’еў”. “Дрэнна пад’еў? Дрэнна пад’еў? Ты ведаеш, колькі каштуе паўкіло біфштэксу?” “Не, дарагая, хачу есці “дожджык”. Усё адно тыя прадукты, што цешча даслала, смачнейшыя”. “Так, “кітайскі рэстаран” працуе два разы на тыдзень, добра? Колькі разоў ты хочаш, каб на тыдзень ішоў “дождж”?”.

Аднойчы Хасэ вярнуўся дахаты і сказаў мне: ”Нішто сабе, сёння наш начальнік выклікаў мяне”. “Ён хоча даць табе прыбаўку?” – мае вочы заблішчэлі. “Не! – я схапіла яго, і мае пазногці ажно ўпіліся ў яго цела. – Не? Усё страчана! Цябе звалілі? Божа, як жа мы…” “Слухай, мой начальнік сказаў, што мы ўсіх запрашалі да сябе, акрамя яго і яго жонкі. Ён чакае, калі ты прыгатуеш яму кітайскія стравы”. “Бос патрабаваў, каб я прыгатавала яму стравы? Не, не, я яго не запрашаю! Я ахвотна запрашаю калег і сяброў, але запрасіць начальніка – гэта надта беспрынцыпна. Я чалавек з гонарам, ты ведаеш, што я…” Я хацела заявіць пра так званую “прынцыповасць” кітайцаў, але дрэнна растлумачыла мужу сваю пазіцыю. Затым пабачыла яго выраз твару і мне давялося замаўчаць і забыцца на “пачуццё гонару”.

На другі дзень ён запытаўся ў мяне:”Слухай, а ў нас ёсць бамбук?” “У нас дома так многа палачак, і яны ўсе з бамбуку”. Муж аж заплюшчыў вочы. Начальнік хоча парасткі бамбуку з шампіньёнамі”. Божа мой, які вытанчаны кіраўнік. Ніколі не варта недаацэньваць іншаземцаў. “Добра, заўтра ўвечары мы запросім іх павячэраць, без праблем, парасткі бамбуку абавязкова вырастуць”. Хасэ глядзеў на мяне з замілаваннем. Пасля вяселля гэта быў першы раз, калі ён глядзеў на мяне закахана, я была збянтэжана яго нечаканай міласцю, але сама я, на жаль, выглядала як здань.

На другі дзень увечары я раненька прыгатавала тры стравы і трымала іх на павольным агні. Упрыгожыла стол падсвечнікамі, разаслала белы абрус і яшчэ дадала чырвоны абрус зверху па дыяганалі, атрымалася цудоўна. Госці і гаспадары прыемна павячэралі, стравы не толькі выглядалі добра, але і мелі цудоўны смак і пах; я як гаспадыня таксама была прыгожа апранута, нават у доўгай сукенцы. Пасля вячэры, калі начальнік і яго жонка садзіліся ў машыну, яны звярнуліся да мяне:”Калі ў будучым у аддзеле сувязі з грамадскасцю будзе вакансія, мы спадзяемся, што вы далучыцеся да нас і станеце часткай кампаніі”. Мае вочы заблішчэлі (гэта ўсё – заслуга парасткаў бамбуку з шампіньёнамі).

Праводзілі начальніка, калі была ўжо позняя ноч. Я хутка зняла доўгую сукенку, пераапранулася ў джынсы, завязала касу ў вузел і старанна вымыла посуд. Зноў стала папялушкай, і гэта вызваліла не толькі маё цела, але і душу. Хасэ быў задаволены і запытаўся: ”Слухай, парасткі бамбуку з шампіньёнамі былі надта смачнымі! Дзе ты ўзяла парасткі бамбуку?” Я працягвала мыць посуд і цяпер ўжо я запыталася ў яго: ”Якія парасткі бамбуку?” “Вось гэтыя парасткі, што ты прыгатавала сёння ўвечары!” Я засмяялася: ”Ой, ты маеш на ўвазе гуркі з шампіньёнамі?” “Што? Ты, ух ты, ты не толькі мяне падманула, але і здолела падмануць начальніка!”. “Я яго не падманула, гэта былі самыя смачныя “свежыя парасткі бамбуку з шампіньёнамі”, якія ён паспытаў у жыцці, гэта ён сам сказаў”.

Хасэ, радасны, узняў мяне ўгару, мыльная вада трапіла яму на галаву і бараду, а ён крычаў: ”Ура, ура! Ты такая ж малпа, якая магла ператварацца ў семдзесят два віды, як завуць яе? Здаецца…” Я абтрэсла яго галаву: “Роўны небу цар малпаў Сунь У-кун. Толькі на гэты раз не забудзься”.

*Чжан ЦЗЯЦЗЯ*

## *Незабыты ліст кахання*

*Апавяданне*

*Арыгінал перакладу «Старое любоўнае пасланне» абраны са зборніка апавяданняў сучаснага кітайскага пісьменніка Чжан Цзяцзя «Я належу табе». Чжан Цзяцзя нарадзіўся ў Наньтуне, правінцыя Цзянсу. Ён скончыў Нанкінскі ўніверсітэт. Пасля заканчэння ўніверсітэта ён стаў сцэнарыстам і рэжысёрам. У 2011 годзе ўпершыню быў намінаваны на лепшы адаптаваны сцэнар 48-й Тайванскай прэміі «Залаты конь» у якасці сцэнарыста за фільм «Мяснік, кухар і мечаносец». У 2013 годзе ён апублікаваў кнігу «Я належу табе». У 2015 годзе Чжан Цзяцзя зняў фільм «Убачымся заўтра» і быў сцэнарыстам і прадзюсерам фільма «Я належу табе».*

## 老情书

**张嘉佳（**
**Zhang Jiajia）**

老太太拄着拐杖，站在酒吧里，痛骂年轻人一顿，抖出张发黄的字条说：“这是老头儿写给我的，读给你们听。哎哟呆逼，拿错了，这是电费催缴单。”

你会不会说话？

会说话的人分两种。第一种会说话，是指能判断局势，分门别类，恰好说到对方心坎里，比如蔡康永。第二种会说话，是指话很多，但没一句动听的，整个就像弹匣打不光的 AK47，比如胡言。

胡言是我朋友中最特立独行的一位，平时没啥存在感，嘴巴一张就是发核弹，“乓”，炸得大家灰头土脸。

一哥们儿失恋，女朋友收了他的钻戒跟别人跑了。狐朋狗友齐聚 KTV，都不敢提这茬儿，有人悠悠地说：“此情可待成追忆。”角落里传来胡言的声音：“此情可待成追忆，贱货喜逢大傻逼。”

包厢里鸦雀无声。大家面无表情，我能听见众人心中的台词：哈哈哈哈太机智了哈哈哈哈。

又一哥们儿结婚，迎亲队伍千辛万苦冲进新娘房间，最后一道坎儿是找新娘的一只鞋。一群爷们儿翻遍房间，就是找不到，急得汗流浃背。

胡言踱步进来，皱着眉头说：“藏得真好啊。丑货，一看就是丑货干的好事，丑货别的不行，藏东西最内行。水獭一生长得丑，但人家吃了睡不捣鬼。海狗喜欢藏东西，但人家也不去坑乌贼。本来图个吉利，她非得破坏婚姻。国人不立个《击毙丑货法》，就得重修《婚姻保护法》。人家说有些女的表面上对你好，其实巴不得你跟她一样，一辈子嫁不出去，今天看来果然是真的。”

刚说完，一个小个子姑娘“哇”地痛哭出声，连滚带爬钻进床底，从床架里摸出一只鞋，号啕奔走。

大家面面相觑，猛地欢呼。新郎擦擦汗，感激地递杯酒给胡言说：

“多谢哥们儿，今儿多亏你，说两句!”

我在外围惨叫：“不要啊!”

已经迟了，胡言举起酒杯激动地说：“今朝痛饮庆功酒，明日树倒猢狲散。”

我劝他去学学蔡康永，于是他看了几集《康熙来了》，跟我说：

“哈哈哈哈小 S 真好玩，像一块活蹦乱跳的毛肚，比我还不要脸。”

妈的毛肚怎么就不要脸了？

胡言嘴巴可怕，但为人孝顺讲义气。他父亲很久前去世，母亲快七十了，相依为命。老太太精神矍铄，嘉兴人，隔三岔五包粽子给我们吃。网上叫嚣着甜粽党咸粽党，党个毛，只有嘉兴的才叫粽子，其他只能算有馅儿的米包。老太太送粽子那不得了，谁家还剩几个，大家一定晚上杀过去吃光。

一天黄昏胡言火急火燎打电话给我，让我快去他家。他自己加班走不开，老太太玩命催回家帮忙。我气喘吁吁地赶到，胡言家端坐着三位老太太，围着麻将桌，一脸期待看着我。

算了那就打几圈。结果老太太团伙精明得不得了，指哪儿打哪儿，输得我面红耳赤呻吟连连，一直打到十一点。散伙了，老太太跟我说：

“小张，胡言是不是跟女朋友分手了？”

我一愣：“完全不知道啊。”

老太太说：“我送你俩粽子，你赶紧讲。”

我说：“哦那姑娘是长沙的，回老家了，两地距离太远，你说再在一块儿也不合适。”

老太太斜着眼睛：“吹牛，肯定是胡言嘴太臭。”

我说：“也不排除有这方面原因。”

老太太拍大腿：“哎呀我都没见过，这就飞了，这畜生糟蹋良家妇女一套一套的。”

我瀑布汗。

胡言推门进来，喊：“妈，你胡说八道什么？”

老太太喊：“我媳妇呢？”

胡言瀑布汗：“她是独生子女，父母年纪也大，她不想留在外地，就回长沙了。”

老太太勃然大怒：“那你跟着去长沙啊。”

胡言说：“我去了你怎么办。”

老太太说：“我留这儿，小张天天跪着伺候我。”

我腿一软。

胡言拽着我想跑，我瘫在地上被他拖着走，哭着喊：“粽子呢粽子呢？”

两人去哥们儿管春的酒吧扯淡。其实我明白，老太太在南京待了三十多年，打牌健身溜达唠嗑的朋友都在一个小区。老人建立圈子不比我们容易，他们重新到一个地方生活，基本就只剩下寂寞。

刚要了打酒，管春领着个老太太进来，哭丧着脸说：“胡言，不是我不帮你，你妈自己找上门的。”

胡言暴怒：“放屁，你手里还拎着粽子！肯定是你出卖了我！”

老太太拄着拐杖，一拍桌子，说：“闭嘴！”

整个酒吧刹那静止了，人人闭上嘴巴，连歌手也心惊肉跳地偷偷关了音响。

老太太说：“我就特别看不起你们这帮年轻人，二三十岁就叨叨说平平淡淡才是真。你们配吗？我上山下乡，知青当过，饥荒挨过，这你们没办法体会。但我今儿平安喜乐，没事打几圈牌，早睡早起，你以为凭空得来的心静自然凉？老和尚说终归要见山是山，但你们经历见山不是山了吗？不趁着年轻拔腿就走，去刀山火海，不入世就自以为出世，以为自己是活佛涅槃来的？我的平平淡淡是苦出来的，你们的平平淡淡是懒惰，是害怕，是贪图安逸，是一条不敢见世面的土狗。女人留不住就不会去追？还把责任推到我老太婆身上！呆逼。”

她一挥拐杖，差点儿打到胡言脑门儿：“你那女朋友我都没见过，你们谁

见过？”

酒吧里大部分人都点头如捣蒜。

老太太说：“自己弱不禁风，屁事不懂，看见别人奔波受苦，只知道躲在角落放两支冷箭说矫情，说人家犯贱穷折腾。呸，一天到晚除了算计什么都不会。钱花完可以再赚，吃亏了可以再来，年轻没了怎么办？当过兵才能退伍，不打仗就别看不起牺牲。你会不会说话？会说话，就去长沙，告诉人家，你想娶她。”

老太太抖出一张发黄的纸，大声说：“这是我老头写给我的，我读给你听。”她看了半天，说：“哎哟呆逼，拿错了，这是电费催缴单。小张你喜欢写字，你临时来一篇。”

我赶紧临场朗诵：“相信青春，所以越爱越深，但必须爱。勇于牺牲，所以死去活来，但必须来。从低谷翻越山巅，就能找到云淡风轻的庭院。总有一天，你的脚下满山梯田，沿途汗水盛开。想要满屋子安宁，就得丢下自己的骸骨，路过一万场美景。”

老太太抽我一耳光，说：“当着七十岁老太婆的面说骸骨，滚。”

她静静地看着胡言，说：“几个月前，你在阳台打电话，我听到了。你劝她留在南京，不要去长沙。劝着劝着自己哭了，我特别想冲进去揍你一顿，哭什么，姑娘孝顺是好事，你不能追着去吗？然后从那天开始天天加班，你有这么勤劳吗，还不是怕回家孤单单地想心事。”

老太太说：“我年纪大了，本来想你结婚后，每天包粽子给你们小两口吃。吃到你们腻了，我也可以走了。你是我儿子，走错路不怕，走错就回家，你妈我一时半会儿死不了，回来的时候我在家。”

她说完擦擦眼泪，昂首挺胸走了。管春赶紧送她。

我回过头，发现酒吧里的每个人眼里都泪汪汪。

我突然明白胡言的语言能力是从哪儿来的，这绝对是遗传啊。

后来胡言还是没去长沙。老太太气得眼不见为净，麻将也不打，喊我教她上网看微博什么的。没几天又自己报团去旅行，跟一群老头老太戴着红帽子，咋咋呼呼地去逛桂林山水。胡言放不下心想跟着去，结果老太太早上五点偷偷摸摸出发，留下胡言无言望着天花板。

老太太回来后，不给胡言好脸色，准备养精蓄锐继续跑。结果半月后心梗，抢救及时，住院等搭桥换二尖瓣。我们一群哥们儿轮流守夜，老太太闭着眼睛，话都说不了。

一天胡言坐在老太太身旁，沉沉睡着。我刚拎着塑料袋进来，想替胡言换班。

老太太艰难地开口，说：“悦悦，胡言是好孩子。”

我突然哭得不能自已。

悦悦是胡言的女朋友，在长沙工作。老太太可能已经说梦话了吧。

老太太是怎么知道她名字的？

那，其实母亲什么都知道。

再后来，老太太没等到手术，二次心梗发作，非常严重，没有抢救过来。

胡言再也不会说话，他变得沉默寡言。

头七那天，大家在胡言家守灵。半夜十一点，虚掩的门推开，冲进来一个姑娘，妆是花的，对我喊：“你怎么不早告诉我？”

她大哭，跪在老太太灵前，说：“阿姨，我跟爸妈说过了，他们说，我应该留在南京，胡言有这样的妈妈，我们放心的。”

我们呆呆地说不出话，不清楚发生了什么事情。

姑娘叫悦悦，在长沙工作，可是她现在在南京。

悦悦哭得喘不过气。她面前摆着老太太的遗像，微笑着看着大家。

那天中午我接到电话，是悦悦打给我。她问我，胡言的妈妈怎么样。我说你干吗不问胡言，她说他电话打不通。我不敢乱讲，就问，你找她干吗？

悦悦告诉我，老太太其实没旅游，单枪匹马去了长沙。那天她正在上班，老太太跑到柜台，存了二十万。悦悦出于流程，问她怎么存法。老太太说，听说在银行工作很辛苦，每年要拉到一定数目的存款，才能升职。

悦悦摸不着头脑，说："谢谢阿姨。"

老太太嘀咕："悦悦，你快升职，让胡言那浑球后悔。"

悦悦这才明白，自己碰到胡言妈妈了。她赶紧请了半天假，带着老太太去吃饭。

老太太说："悦悦你喜欢胡言吗？"

悦悦哭了，说自己很喜欢胡言，可是父母身体不好，自己留在长沙才放心。让阿姨失望了。

老太太嘿嘿一笑，说："那你就留在长沙，快快升职，免得胡言来了长沙欺负你。"

悦悦说："胡言肯到长沙吗？"

老太太点头说："他会来的，我这就是过来熟悉一下环境。到时候我先来住一阵，等你们踏实了我再回南京。"

老太太在长沙住了三天，包粽子给悦悦吃。

后来悦悦送她的时候才发现，老太太住在一家很便宜的旅馆，桌上堆着一些叶子和米，还有最便宜的电饭锅。

我这才知道，老太太学电脑看微博的原因，是想找到悦悦啊。我的眼泪止不住，说，悦悦你快来南京吧，阿姨去世了。

千里奔丧的悦悦跪在灵前，拿出一个粽子，哭着说："阿姨，粽子好好吃，我不舍得吃完，留了一个在冰箱里。今天拿出来结果坏掉啦，阿姨求求你，不要怪悦悦……"

朋友们泣不成声。

过了一年，胡言和悦悦结婚。那天没有大摆筵席，只有三桌，都是最好的朋友。悦悦父母从长沙赶来，也没有其他亲戚。

悦悦穿着婚纱，无比美丽。

可是她从进场后，就一直在哭。

胡言西装笔挺，牵着悦悦，然后拿出一张泛黄的纸，认真地读。短短几句话，一直被自己的抽泣打断。

亲爱的刘雪同志，我很喜欢你，我已经跟领导申请过了，我要调到南京来。他们没同意，所以我辞职了。现在档案怎么移交我还没想好。所以，请你做好在南京接待我的准备。

亲爱的刘雪同志，我不会说话，但我有句心里话要告诉你。

我想和你生活在一起，永远。

所有的朋友脑海中都浮现出一个场景。

老太太拄着拐杖，站在酒吧里，痛骂年轻人一顿，抖出张发黄的字条说："这是老头写给我的，读给你们听。哎哟呆逼，拿错了，这是电费催缴单。"

*Пераклад Фу Мэйянь, Вольга Шахаб, Хэ Цін*

Пажылая жанчына, абапіраючыся на мыліцу, стаяла ў бары і сварылася на маладога чалавека. Яна выцягнула пажаўцелы кавалачак паперы і сказала: "Калісьці мой хлопец напісаў мне гэта, я вам прачытаю. Ой, дурніца, пераблытала, гэта паведамленне аб запазычанасці за электраэнергію".

Ці можаш ты гаварыць?

Людзі, якія могуць гаварыць, дзеляцца на два тыпы. Першыя гавораць зыходзячы з абставін, словы іх даходзяць да самага сэрца, напрыклад Кевін Цай[1]. А людзі другога тыпу шмат гавораць, але няма ніводнага прыемнага для слыху сказа, быццам АК47 з бясконцым магазінам, напрыклад Ху Янь.[2]

Ху Янь самы незвычайны сярод маіх сяброў. Як правіла, ён не прыцягвае чужой ўвагі, а калі пачынае гаварыць, быццам ядзерная бомба ўзрываецца: “бах!” – і ўсе ў няёмкім становішчы.

Адзін сябра страціў каханне, яго сяброўка атрымала пярсцёнак з брыльянтам, але сышла да іншага. Усялякі зброд сабраўся ў караоке, але ніхто не ўспомніў пра тое. Нехта павольна прамовіў: ”Пра ўсе гэтыя дзіўныя з’явы не раз давядзецца мне разважаць”[3]. З кута данёсся голас Ху Яня, ён сказаў: ” Пра ўсе гэтыя дзіўныя з’явы не раз давядзецца мне разважаць. Б…дзь шчаслівая з дурнем сустрэцца”[4].

У пакоі павісла мёртвая цішыня. Усе з каменнымі тварамі, але я магу чуць іх думкі: “Ахахах, як разумна, далей некуды!”

Яшчэ адзін мой сябра ажаніўся. Сведкі спрабавалі з цяжкасцю зайсці ў пакой нявесты, каб знайсці туфель дзяўчыны. Мужчыны шукалі паўсюль і нідзе не знаходзілі, а па іх спінах сцякаў ад хвалявання пот.

Ху Янь спахмурнела ўвайшоў і сказаў: ”Як добра схавала! Уродзіна! Адразу зразумеў, што гэта зрабіла яна! Зноў нічога не можа, акрамя як хаваць рэчы. Выдра, непрыгожая з самага нараджэння, але яна толькі есць і спіць і нікому не робіць падкопы. Марскі коцік любіць хаваць рэчы, але ён таксама не робіць пастку для каракаціцы. На самай справе задача пастаўлена дзеля шчасця, а яна якраз псуе шлюб. Калі народ не зацвярджае закон, каб прыгаварыць вырадкаў да смяротнага пакарання, то давядзецца выправіць закон пра абарону шлюбу. Кажуць, што ёсць крывадушныя жанчыны, якія знешне стявяцца да цябе добра, але ў душы моцна жадаюць, каб ты ніколі не ажаніўся, як яна сама. Цяпер, здаецца, такая праўда”.

Ледзь пачуўшы гэта, адна невысокая дзяўчына горка заплакала, забілася пад ложак, знайшла туфель у раме ложка, заплакала і ўцякла без аглядкі.

Усе паглядзелі адзін на аднаго і радасна закрычалі. Жаніх выцер пот, удзячна падаў Ху Яню келіх віна і сказаў:

– Дзякуй за вашу дапамогу! Мой сябар! Прапануй тост, калі ласка!

Не-е-е! – стоячы за натоўпам, я нема крычаў. Але было ўжо позна. Ху Янь падняў чарку і ўсхвалявана сказаў:

– Сёння выпіваем і віншуем, а заўтра дрэва ўпадзе, і ўсе малпы разбягуцца[5]. Я пераканаў яго браць прыклад з Кевіна Цая. Пасля таго як ён паглядзеў некалькі серый “Кансі прыйшоў[6], сказаў:

– Ахахаха, якая цікавая Сяо S[7]! Яна як быццам жывы ялавічны рубец, больш бессаромная, чым я.

Чорт. Чаму ж ялавічны рубец бессаромны? Ху Янь востры на язык, але вельмі верны сябар, паслухмяны і паважлівы да бацькоў. Яго бацька даўно памёр, а маці хутка споўніцца 70 гадоў. Яны з'яўляюцца апорай адзін для

---

[1] Кітайскі вядучы, пісьменнік і акцёр.

[2] Імя героя гэтага апавядання, якое азначае ”гаварыць лухту”.

[3] Радок з верша кітайскага паэта Лі Шаньіня “Каштоўная цытра”.

[4] Адаптаваны вершаваны радок. У арыгінале напісана “Пра ўсе гэтыя дзіўныя з’явы не раз давядзецца мне разважаць. Але трэба прызнацца, зараз на маёй душы пячатка тугі”.

[5] Азначае калі важак губляе ўладу, разбягаюцца ўсе яго прыспешнікі.

[6] Назва тэлепраграмы.

[7] Прозвішча Сюй Сідзі, тайваньскай тэлевядучай.

аднаго. Яго маці бадзёрая і сёння (нарадзілася ў Цзясіні). Яна часта частуе нас цзунцзамі[8]. У Інтэрнэце горача абмяркоўваюць, якія цзунцзы лепшыя: салодкія ці салёныя[9]. Не варта абмяркоўваць. Толькі цзунцзы з горада Цзясін вартыя называцца цзунцзы, а цзунцзы з іншых гарадоў проста рысавыя піражкі з начыннем. Жанчына нярэдка частуе цзунцзамі, і калі ў каго застаюцца цзунцзы да вечара, то вечарам усе абавязкова прыйдуць туды і з'ядуць усё дачыста.

Аднойчы пад вечар Ху Янь патэлефанаваў і тэрмінова папрасіў, каб я хутчэй прыехаў да яго дадому. Ён не мог сысці з працы, а яго мама тэрмінова прыспешвала яго з мэтай дапамогі. Калі я ў спешцы прыехаў, у яго доме сядзелі некалькі жанчын вакол стала для гульні ў мацзян[10], глядзелі на мяне, іх вочы блішчалі надзеяй.

Добра! Давайце гуляць некалькі тураў у мацзян. Але жанчыны такія разумныя і моцныя ў мацзяні, што я са стогнам ім прайграў. Мы гулялі аж да адзінаццаці гадзін вечара. Скончыўшы, яго мама запыталася ў мяне:

– Сяо Чжан, ці разышоўся Ху Янь з сяброўкай?

– Я зусім не ведаю. – Я збянтэжыўся.

– Я дам табе дзве цзунцзы, хутчэй скажы! – сказала яна.

– Яго сяброўка вярнулася ў родны горад Чанша. Паколькі адлегласць паміж двума гарадамі даволі вялікая, яны не могуць працягваць быць разам, – адказаў я.

– Лухта! Абавязкова з-за таго, што Ху Янь занадта востры на язык, – скасіла яна вочы.

– Нельга выключаць гэтую прычыну.

– Ай-яй! Я нават ні разу не бачыла яе, а яна ўжо з'ехала. Скаціна! Ну ў яго і метады зняважыць жанчыну, – пляснула яна па сцягну.

З мяне пот каціўся градам.

Ху Янь штурхнуў дзверы, увайшоў і крыкнуў:

– Мама, якую лухту ты нясеш?

– Дзе мая нявестка? – таксама крыкнула яна.

– Яна адзінае дзіця ў сям'і, а бацькі ўжо ў гадах. Яна не хоча заставацца ў чужым горадзе, таму паехала дадому. – З Ху Яня ліўся пот.

– Рухайся за ёй следам у Чанша! – яна моцна раззлавалася.

– Як ты будзеш жыць, калі я паеду? – запытаўся Ху Янь.

– Я застануся тут, а Сяо Чжан будзе даглядаць мяне, – адказала яна.

У мяне адняліся ногі.

Ху Янь цягнуў мяне ўцякаць адсюль, а я валачыўся па зямлі з крыкам: “Цзунцзы, дзе мае цзунцзы?”

Мы прыйшлі ў бар Гуань Чуня і там працягнулі размову. На самой справе мы ўсе разумелі, што яго маці жыла ў адным раёне Нанкіна больш за 30 гадоў, адпачывала, займалася спортам і гуляла ў карты. Сталым людзям нялёгка знайсці патрэбнае асяроддзе. Калі яны пераедуць і пачнуць жыць у іншым горадзе, то яна будзе вельмі сумаваць.

Толькі замовілі тузін піва, Гуань Чунь прывёў маці ў бар і сказаў з сумным выразам твару:

– Ху Янь, не тое каб я табе не дапамог, а твая мама сама прыйшла.

– Што за глупства! У цябе ў руках цзунцзы! Пэўна, ты мяне выдаў! – Ху Янь раззлаваўся.

Матуля, абапіраючыся на мыліцу, ударыла рукой па стале:

---

[8] Страва з клейкага рысу з разнастайным начыннем у бамбукавым ці іншым лісці, традыцыйна гатуецца на свята Дуаньу.

[9] Звычайна на поўначы Кітая ядуць салодкія цзунцзы, а на поўдні - салёныя

[10] Кітайская азартная гульня з выкарыстаннем гульнёвых касцей для чатырох гульцоў.

– Маўчы!

У бары раптоўна настала цішыня, усе закрылі рты. Нават спявак непрыкметна выключыў музыку ад страху.

Маці загаварыла:

– Я стаўлюся з пагардай да вас, маладых, якім толькі гадоў 20-30. Вы бясконца разважаеце пра бесклапотнасць жыцця. Хіба вы можаце так казаць? Я накіроўвалася на працу ў вёску як адукаваная моладзь[11] і перажыла голад, гэтага вы не зможаце зразумець і сабе ўявіць. А цяпер я шчаслівая і вясёлая, гуляю ў карты ў вольны час, рана кладуся спаць і рана ўстаю. Няўжо вы думаеце, што спакой і пачуццё бяспекі з'явіліся ніадкуль? Стары манах казаў: "Бачу, што горы – гэта ўсё ж горы"[12]. Але вы паспрабавалі: "Бачу, што горы – не горы"? Не ідзіце ў горы мячоў і мора агню, пакуль вы маладыя. Нават не прыходзілі ў свет, а самі лічыце, што ўжо сышлі ад свету. Думаеце, што вы быццам жывы Буда пасля нірваны? Маё жыццё спакойнае таму, што я ўжо цярпела нягоды. А ваша жыццё бескаляровае з-за таго, што вы гультаяватыя, баіцеся цяжкасцяў і імкняцеся да лёгкага і бяздзейнага жыцця. Вы як мясцовы сабака, які баіцца пабачыць свет. Ці варта дабівацца таго, што не можаш утрымаць? А ты яшчэ зваліў адказнасць на мяне! Дурань!

– Яна махнула кіем ледзь не па ілбе Ху Яня:

– Тваю сяброўку я нават не бачыла. Хто з вас раней яе ўбачыў?

Людзі ў бары заківалі галовамі, быццам часнок таўклі.

Яна сказала:

– Ты сам слабы і нічога не разумееш. Бачыш, што хтосьці клапоціцца і пакутуе, а ты толькі хаваешся ў куце, наносіш ўдар у спіну, кажаш, што яны красуюцца, робяць шмат непатрэбнага і асуджаеш іх. Фу! Ты нічога не ўмееш, акрамя як рабіць падкопы. Грошы патраціў, можна яшчэ зарабіць. Прайграў – можна зноў пачаць. А што рабіць, калі маладосць сышла? Толькі адслужыўшы ў арміі, можна сысці ў адстаўку. Не глядзі пагардліва на ахвяру, калі не ваяваў. Ці ўмееш ты размаўляць? Калі так, то едзь у Чанша, скажы ёй, што ты хочаш ажаніцца з ёй.

Яна выцягнула пажоўклую запіску і гучна прамовіла: “Гэта мой хлопец калісьці напісаў мне, я вам прачытаю”. Доўга паглядзеўшы, сказала: “Ах, дурніца я, пераблытала, гэта паведамленне аб запазычанасці за электраэнергію. Сяо Чжан, ты любіш пісаць, напішы што-небудзь”.

Я зараз прачытаю ўслых: «Вер у маладосць, чым больш кахаеш, тым пачуццё глыбей, але ты абавязкова павінен кахаць. Не бойся ахвяраваць і абавязкова рабі так нават пры пагрозе смерці. Прайшоўшы праз даліну і вяршыню гары, знойдзеш цудоўны двор. Рана ці позна пад тваімі нагамі будуць выдатныя тэрасы, а на шляху пот, але ты ўбачыш, што пот гэты як кветкі. Калі хочаш мець спакойнае жыццё, табе давядзецца забыцца на сваё цела і прайсці шмат выпрабаванняў”.

Матуля дала мне аплявуху і сказала: “Кажаш пра цела пры 70-ці гадовай старой. Вон!”

Яна моўчкі глядзела на Ху Яня, потым сказала:

– Некалькі месяцаў таму я пачула, калі ты размаўляў з ёй па тэлефоне

[11] Рух часоў Культурнай рэвалюцыі ў КНР.

[12] Згодна з крыніцамі, гэта выказванне належыць аднаму з будыйскіх манахаў эпохі Сун. «Гляджу на горы і бачу горы, гляджу на ваду і бачу ваду. Бачу, што горы не горы і вада не вада. Бачу, што горы – гэта ўсё ж горы, а вада і ёсць вада». Кітайцы разглядаюць гэта выказванне і ў адносінах да штодзённага жыцця, дзе мы рухаемся па прыступках ад «дзіцячай даверлівасці» да «сумневаў» і «прасветленага прыняцця».

на балконе. Ты пераконваў яе застацца ў Нанкіне і не выязджаць у горад Чанша. Ты пераконваў, пераконваў і заплакаў. Я хацела ўвайсці і цябе пабіць. Навошта ты плакаў? Добра, што яна ветлівая. Чаму ты не з ёй? З таго часу ты пачаў кожны дзень звышчасова працаваць. Ты такі працавіты? Ты проста баішся застацца дома адзін і задумацца.

Я ўжо сталага веку, хацела б пасля вашага вяселля кожны дзень карміць вас цзунцзамі. Калі вам надакучыць, і мне варта сыходзіць. Ты, мой сын, не бойся ісці памылковай дарогай. Калі памылішся, заўсёды можна вярнуцца дамоў. Я не памру за кароткі час, калі ты вернешся, я буду дома.

Сказаўшы, яна выцерла слёзы і сышла, трымаючы высока галаву і расправіўшы плечы. Гуань Чунь паспешліва яе праводзіў.

Павярнуўшы галаву, я заўважыў слёзы на вачах у кожнага, хто быў у бары.

Я раптам зразумеў, адкуль здольнасць да моў у Ху Яня. Гэта відавочна спадчынная здольнасць ад маці.

Ху Янь не рушыў ў Чанша. Маці нават не гуляла ў мацзян з-за гневу. Яна папрасіла мяне навучыць яе выкарыстоўваць мікраблог па Інтэрнэце. Праз некалькі дзён яна яшчэ запісалася на экскурсію, у чырвонай кепцы падарожнічала ў Гуйлінь з натоўпам старых. Ху Янь непакоіўся за яе і хацеў суправаджаць, але яна непрыкметна паехала ў пяць гадзін раніцы. Ху Янь застаўся адзін і моўчкі глядзеў у столь.

Вярнуўшыся, яна была надзьмутая на Ху Яня. Набраўшыся сіл, гатовая была працягваць падарожнічаць. Але праз паўмесяца трапіла ў шпіталь з інфарктам міякарда. Выратавалі своечасова. Чакаючы шунтавання сэрца і пратэзавання мітральнага клапана, мы з сябрамі па чарзе дзяжурылі каля ложка ўначы. Яна нават не змагла гаварыць з закрытымі вачыма.

Аднойчы Ху Янь забыўся ў глыбокім сне, седзячы побач з маці. Толькі я прыйшоў на змену Ху Яню з пластыкавым пакетам у руках, як яна з цяжкасцю загаварыла:

– Юэюэ, Ху Янь – добры хлопец. Я быў не ў стане стрымаць слёзы і раптам горка заплакаў.

Юэюэ з'яўляецца сяброўкай Ху Яня, якая працуе ў Чанша. Маці, можа быць, трызніла ў сне.

Як матуля даведалася пра яе імя?

Глядзі, на самой справе маці ўсё ведае.

А далей не паспела яна дачакацца аперацый, як здарыўся чарговы прыступ інфаркту міякарда. У гэты раз такі цяжкі, што не атрымалася яе выратаваць.

Ху Янь стаў зусім маўклівым. На сёмы дзень пасля яе смерці мы ўсё стаялі ў пачэснай варце каля труны ў доме Ху Яня. У 11 гадзін вечара дзверы адчыніліся, у пакой з крыкам кінулася дзяўчына, папракаючы мяне, што не паведаміў ёй раней аб хваробе маці.

Яна горка плакала, стаяла на каленях каля труны матулі і сказала: “Цётухна, я ўжо ўсё распавяла бацькам. Яны сказалі, што я павінна застацца ў Нанкіне. У Ху Яня такая добрая маці, як ты. Мы можам быць спакойныя”.

Не зразумеўшы, што здарылася, мы стаялі, як цурбаны, і не маглі вымавіць ні слова.

Дзяўчыну завуць Юэюэ, і праца яе ў Чанша, а яна зараз у Нанкіне.

Юэюэ залівалася слязьмі. Перад ёй быў здымак памерлай, на якім матуля глядзела на ўсіх з усмешкай.

Апоўдні, у той жа дзень, Юэюэ патэлефанавала мне і спытала, як маці Ху Яня. Я спытаў у адказ, чаму яна сама не пытаецца Ху Яня? Яна сказала, што не датэлефанавалася. Я не адважваўся ёй паведаміць.

Юэюэ сказала мне, што матуля на самой справе не падарожнічала, а прыязджала ў Чанша адна. Аднойчы, калі яна працавала, матуля прыйшла да касы і ўнесла 200 тысяч юаняў. Пры аперацыі ўнясення грошай Юэюэ спытала ў яе, на які рахунак пакласці грошы. Маці сказала, што у банку цяжка працаваць. Толькі прыцягнуўшы пэўную суму ўкладу за год, магчыма павысіцца на пасадзе.

Юэюэ не зразумела і сказала: «Дзякуй вам».

Матуля прашаптала: «Юэюэ, зрабі кар'еру хутчэй, хай мярзотнік Ху Янь раскаецца!»

У той час Юэюэ толькі зразумела, што яна сустракалася з маці Ху Яня. Яна паспяшалася адпрасіцца на паўдня і павяла матулю ў рэстаран. Матуля спытала: "Юэюэ, табе падабацца Ху Янь?"

Юэюэ заплакала і сказала, што яна вельмі любіць Ху Яня, а ў бацькоў слабое здароўе, толькі застаўшыся ў Чанша, яна можа быць спакойная. Выбачалася, што расчаравала яе.

Матуля ўсміхнулася і сказала: «Тады заставайся ў Чанша, зрабі хутчэй кар'еру, каб Ху Янь цябе не крыўдзіў па прыездзе ў Чанша».

Юэюэ спытала: "Ху Янь згодны прыехаць у Чанша?"

Ківаючы галавой, матуля сказала: "Ён прыедзе. Я сюды прыйшла, каб пазнаёміцца з рэальным станам рэчаў. Тады я пажыву ў вас нейкі час і вярнуся ў Нанкін пасля таго, як вы ўладкуецеся".

Матуля пажыла ў Чанша тры дні і частавала Юэюэ цзунцзамі.

Праводзячы матулю Юэюэ заўважыла, што тая спынялася ў таннай гасцініцы. На стале бамбукавае лісце, клейкі рыс і самая танная электрычная рысаварка.

Я толькі тады зразумеў, чаму матуля вучылася выкарыстоўваць мікраблог па Інтэрнэце. Прычына ў тым, што яна хацела знайсці Юэюэ. Я сказаў са слязьмі на вачах: "Юэюэ, прыязджай у Нанкін хутчэй. Матуля памерла". Юэюэ, якая прыехала на пахаванне здалёку, стаяла на каленях перад трунoй. Трымаючы цзунцзы ў руках, яна сказала са сьлязьмі: "Матухна, цзунцзы вельмі смачныя. Мне шкада было з'есці ўсё, таму захоўвала адзін у халадзільніку. Сёння дастала з халадзільніка, а цзунцзы ўжо сапсаваліся. Прашу вас мяне не дакараць..."

Слёзы перахапілі голас ва ўсіх.

Прайшоў ужо год. Ху Янь ажаніўся з Юэюэ. У той дзень яны не прыгатавалі шыкоўны вясельны банкет, усяго толькі тры сталы і толькі лепшыя сябры. Бацькі Юэюэ прыязджалі з Чанша, і больш не было іншых сваякоў.

Юэюэ была вельмі прыгожая ў вясельнай сукенцы.

Але яна ўвесь час плакала на цырымоніі.

Ху Янь у выпрасаваным касцюме, ведучы Юэюэ за руку, выцягнуў пажоўклы ліст паперы і ўважліва прачытаў услых. Толькі некалькі сказаў ён чытаў адрывіста з-за міжвольнага плачу:

«Дарагі таварыш Лю Сюэ, я вас вельмі люблю. Я ўжо прасіў аб пераводзе на працу ў Нанкін. Яны не згодныя, таму я пайшоў у адстаўку. Я яшчэ не прыдумаў, як перадаць асабістую справу. Рыхтуйся прымаць мяне ў Нанкін, калі ласка.

Дарагі таварыш Лю Сюэ, я не ўмею гаварыць, але я хачу выказаць мае думкі, затоеныя у сэрцы. Я хачу жыць з табой усё жыццё".

Ва ўсіх у галаве паўстала такая сцэна: Матуля, абапіраючыся на мыліцу і стоячы ў бары, злосна вылаяла маладога чалавека, выцягнула пажоўклую запіску і сказала: "Гэта мой хлопец напісаў мне калісьці, я вам прачытаю. Ах, дурніца я, пераблытала, гэта паведамленне аб запазычанасці за электраэнергію ".

# *ПРОЗА – ПУБЛІЦЫСТЫКА*

*Арцемій МІЦКЕВІЧ*



– Это он тебя напугал, а меня нет!

– А кто из нас первый испугался? Разве не ты?

– А вот и нет!

– А вот и да!

– Так, стоп! – решительно подняла руки мама. – Не торопитесь, пожалуйста, иначе от холодного воздуха у вас разболится горло. А ну-ка по порядку! Какой ещё Дед Мороз, какой памятник? Кто кого напугал и прогнал? Куда вы уже успели забраться?

– Никуда мы не забирались! – рассердилась Маринка. – Этот странный Дед Мороз сам к нам прицепился. А брови у него чёрные, страшные – ух! Ясное дело, он ненастоящий. А памятник спустился к нам и защитил, а его отругал. И правильно, за дело! Нечего приставать, вот так!

Мама явно была сбита с толку:

– Постой-ка... Памятник? Памятник отругал?

– Да мы уже сто раз тебе сказали! – возмутился Лёня. – Он из брозны такой...

– Из бронзы! – толкнула его Маринка.

– Да без разницы! Вот, из бронзы, и на нём форма солдата (только это не солдат), и ты, мам, его даже знаешь, ведь он из твоего фильма, хотя сказал, что вообще-то из жизни...

– Ничегошеньки не поняла, – обречённо вздохнула мама, чем вызвала у детей новый возглас негодования. – Хотя бы о каком фильме идёт речь?

Маринка оглянулась на Лёню как на самого осведомлённого. Он нахмурился, подбирая слова, а затем сообразил что-то и просиял:

– Я знаю, ты сейчас мигом вспомнишь! Там ещё песня была такая весёлая! – Он набрал побольше воздуха и с ходу затянул припев: – Раскудрявый клён зелёный, лист резной...

– Ой, теперь и я вспомнила! – обрадовалась Маринка.

– Да это же «Смуглянка», – растерянно пробормотала мама. – Значит, этот ваш таинственный фильм – «В бой идут одни “старики”». Но памятник-то здесь причём?

Тётя озадаченно взглянула на неё:

– Так ведь в этом парке стоит памятник Быкову и военным лётчикам. Ты разве не знаешь?

А Лёня внезапно обернулся к Маринке:

– Послушай, а вдруг этот Дед Морозище осмелел, когда мы убежали? Он же такой большой, да ещё палка у него...

– Посох, – машинально поправила Маринка.

– Ну, посох! А вдруг он взял этот свой посох – и как даст! Ведь тот бронзовый не такой уж высокий, а ещё совсем нестрашный, потому что добрый... Вдруг мы зря убежали? Они там, может, дерутся!

Маринка хотела сказать, что бояться тут нечего и что на самом деле «Дед Мороз» окончательно струсил, а не осмелел. Но после слов Лёни ей тоже стало как-то не по себе.

– Мам, пошли! – воскликнул мальчик и отчаянно потянул мать за руку. – Скорей пошли, мам, нам надо спешить!

– Куда спешить?

– Ну давай же, двигайся, а то не успеем! Маринка, помогай!

Девочка с готовностью схватила за руку тётю, и они с братом потянули недоумевающих женщин за собой.

Когда они оказались на месте, Маринка торопливо осмотрелась и вздохнула с облегчением. «Дед Мороз» уже куда-то подевался, а бронзовый человек вернулся на постамент и спокойно сидел на крыле, слегка опираясь руками на колени. Он был абсолютно неподвижен и даже не оглянулся, когда они подошли.

– Уф, ничего не случилось. Вот хорошо! – обрадовался Лёня. – А это, мам, и есть тот бронзовый. Он и вступился за нас.

Мальчик ожидал серии новых нелепых вопросов, однако мама лишь молчала и долго-долго вглядывалась в лицо тому, кто находился на постаменте.

– О господи, он же точь-в-точь как в фильмах, – наконец выдохнула она каким-то странным сдавленным голосом.

Лёня заметил её повлажневшие глаза и убито пробормотал:

– Ну вот, она опять плачет. Я так и знал.

Маринка шмыгнула носом:

– Кажется, я тоже плачу...

– Ох уж эти девчонки, – совсем по-взрослому подосадовал Лёня и деловито осмотрел бронзового человека. – Гляди-ка, Марин, шлем-то он взял, а цветочки позабыл!

С энтузиазмом подскочив к памятнику, он начал собирать рассыпавшиеся гвоздики. Некоторые из них упали с постамента и алели в снегу.

– Вот, мам, держи, – решительно заявил Лёня и сунул букет матери в руки.

Некоторое время она растерянно держала гвоздики, словно не зная, что с ними делать. Дети не могли припомнить, чтобы мама когда-нибудь была в большем замешательстве. Но вот она заметила ободряющий взгляд сестры и бережно положила гвоздики бронзовому человеку на колени. Положила так, чтобы казалось, будто он придерживает букет одной рукой.

Маринка внимательно смотрела на человека и ждала, что он вот-вот поправит цветы, скажет что-нибудь ободряющее, а может, даже улыбнётся, как тогда. Но он почему-то не шевелился.

– Лёнь, – шепнула брату Маринка, – но ведь нам не показалось, правильно? Всё это было?

– Ну конечно же! – с неподдельным удивлением и даже негодованием вытаращился тот. – Сама подумай: на нём же снега нету, а раньше был, но он его стряхнул. И цветочки свалились. И следы вон повсюду... Так ведь он нам помог, а теперь отдыхает. Как ещё может быть?

– Точно, – сообразила Маринка. Она немного подумала и неуверенно пробормотала: – Только давай лучше не будем опять про это рассказывать. Они и так не поняли. А мама ещё и расстроилась.

И как раз в этот момент мама их позвала:

– Дети, подойдите вот сюда, поближе. – Сейчас она уже овладела собой и была гораздо больше похожа на саму себя. – Посмотрите хорошенько на человека, которого изображает этот памятник. Это известный актёр и кинорежиссёр – Леонид Быков.

– Вот здорово, имя как у меня! – не преминул восхититься Лёня.

Мама неожиданно улыбнулась:

– Да, совсем как у тебя. И мне хочется, чтобы вы запомнили Быкова, потому что он был очень хорошим человеком. Он был настоящим человеком.

Маринку насторожило слово «был», и она недоверчиво уточнила:

– То есть был хорошим – а теперь уже нет?

– А теперь... его самого нет, – поправила мама, и её улыбка превратилась в грустную и немного отстранённую.

– Как это его нет? Но ведь мы... – начала было Маринка, однако тут же прикусила язык. Сама же хотела, чтобы они молчали о том, что видели! И вот – чуть не проговорилась!

– Он есть, мам, – упрямо сказал Лёня. – Он всё равно есть.

Маринка при этих словах незаметно покосилась на памятник.

Тут мама тряхнула головой и решительно воскликнула:

– Ну да ладно, хватит на сегодня печалей! Давайте-ка лучше возвращаться домой. Уже темнеет, скоро Новый год, а нам ещё столько нужно сделать!

Они двинулись в обратный путь, и снежинки всё так же кружились в воздухе, плавно опускаясь на землю. Они сыпались уже не мелкой искрящейся пудрой, а целыми хлопьями, которые мягко ложились на плечи бронзового человека и путались в кудрявых волосах. Он неподвижно сидел на крыле и задумчиво смотрел куда-то далеко вперёд, словно стремился заглянуть в будущее.

*09–10.12.2015*



# *Чэрвеньскі снег*

*Рэспубліканскі конкурс навукова-*
*даследчых і творчых работ*
*«Памяць роду: мінулае вачыма сучаснікаў»*



ДЫПЛОМ

III ступені

Ў НАМІНАЦЫІ "МАЕ ГЕРАІЧНЫЯ ПРОДКІ"

Узнагароджваецца

*Значонак Дар'я Аляксандраўна*

студэнтка УА "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт", за перамогу ў рэспубліканскім конкурсе творчых і навукова-даследчых работ "Памяць роду: мінулае вачыма сучаснікаў", прымеркаванага да Года культуры.

Галоўны рэдактар часопіса "Роднае слова" З. І. Падлiпскі

Дырэктар РВУ «Выдавецкі Дом "Звязда"» А. М. Карлюкевіч

01.11.2016

*Прысвячаецца Куліковай Э. М.*

Душная цемра зямлянкі поўнілася крыкамі жаху і адчаю. Ад страшэнных выбухаў скалыналіся сцены і падлога, зверху струменіўся пясок, зацярушваючы валасы і адзенне. Ані пробліску святла – толькі суцэльны згустак апраметнага змроку, у якім скурчыліся бясформенныя цені. Людзі ліхаманкава мітусіліся, туліліся адзін да аднаго і закрывалі галовы рукамі, а недзе за межамі гэтай беспрасветнай цемры гырчалі нямецкія самалёты і з пранізлівым віскам падалі бомбы, ад выбухаў якіх звінела ў вушах...

Прываліўшыся да земляной сцяны, Соф'я сутаргава прыціскала да сябе маленькі скрутачак. Унутры яго заходзілася ў няспынным плачы немаўлятка, якому было ўсяго два дні ад нараджэння. Навокал стаяў невыносны грукат і лямант, у якім немагчыма было пачуць нават уласныя думкі, а на руках надрыўна плакала дачушка. Соф'я ўсхліпвала, не ведаючы, як яе супакоіць, і шаптала дрыжачымі вуснамі:

– Не плач, Элечка, не плач, родненькая... Гэта хутка скончыцца, абяцаю табе... Усё будзе добра... Нічога тут няма страшнага, і я зусім не спужалася...

Зямлю страсянула такім моцным выбухам, што ў Соф'і на некалькі імгненняў залажыла вушы, а ўнутры ад жудаснай вібрацыі нібы разышлася бяздонная прорва. Немаўлятка закрычала яшчэ адчайней, і ў Соф'і ледзь не разарвалася сэрца. Глытаючы слёзы, яна ломкім голасам замармытала:

– Ну не трэба, дачушка, мілая... Прагоняць гэтых чортавых немцаў, і ўсё скончыцца... Тры твае дзядзькі на фронце, яны ім пакажуць, чуеш мяне? І Ваня там, і Лёша, і Жэнька... Яны ўсіх немцаў паб'юць, і стане як раней... Ваня фінскую прайшоў, ён вопытны, верыш?.. Ну толькі не плач, не плач, калі ласка, ну я прашу цябе...

Яна сама ў роспачы зайшлася плачам, схаваўшы твар у пялёнках скрутачка, а ў небе працягвалі пагражальна ракатаць самалёты, скідаючы на мястэчка смяротны груз...

Дзіўна, што раней Соф'я іх не баялася. Не асабліва ўстрывожылася нават у той ракавы дзень – 22 чэрвеня 1941 года. Яна была тады не дома, а ў горадзе Ліда, на здымнай кватэры. Як прачнулася раніцай, так адразу і пачула незразумелы гул матораў. Высунуўшыся ў акенца, яна здзіўлена прыўзняла бровы: гаспадар хаты стаяў пасярод двара ў адных кальсонах і, задраўшы галаву, неадрыўна глядзеў у неба. А над горадам плылі і плылі самалёты – бездакорным строем, як на парадзе.

У калідоры крыху занепакоеная Соф'я сутыкнулася з гаспадыняй.

– Вы не ведаеце, што здарылася?

– Дык гэта ж вайна пачалася, – ціха і сумна адказала жанчына. – Соня, гэта вайна.

Соф'я замерла, спрабуючы асэнсаваць пачутае. У дваццаць тры гады цяжка верыцца ў вайну і смерць. Але Соф'я, народжаная праз паўмесяца пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, умела сканцэнтравацца на галоўным. Раз вайна, значыць трэба хутчэй вяртацца дамоў, у Крупкі. Да мужа і родных.

Яна акуратна заслала ложак, апранула чысценькую сукенку і сабрала ў дарогу ежу – сала з кавалкам хлеба. Іх яна завярнула ў сваю пуховую коўдру колеру шампанскага. Развітаўшыся з гаспадарамі хаты, Соф'я пехатой накіравалася ў бок Крупак, а за спіной ужо грымелі першыя выбухі – гэта на горад накінуліся нямецкія бамбардзіроўшчыкі.

Вялікая сям'я Соф'і распадалася на вачах. З мамай, Марыяй Мікалаеўнай, засталіся толькі Люба і Вася, дванаццаці і васьмі гадоў. Старэйшыя сыны пайшлі на фронт – і Лёша, і Ваня, і нават зусім малады хлопец Жэнька.

А праз тыдзень вайна дабралася і да Крупак. Каменданцкая гадзіна, допыты, расстрэлы... Многіх жыхароў пагналі на працу ў Германію. Ахвярай гэтага стала і Вікторыя, жонка Лёшы, якую забралі разам з шасцігадовай дачкой і двухгадовым сынам. Але насельніцтва нядоўга цярпела здзекі і забойствы: у лясах пачалі з'яўляцца партызанскія атрады. У адзін з такіх атрадаў увайшлі Соф'я і яе муж Іван, якія сталі выконваць ролю сувязных. Жылі яны ў маленькім пакойчыку пры раённай бальніцы, дзе Соф'я працавала зубным урачом. Яна мела магчымасць таемна перадаваць партызанам медыкаменты, а іншыя работнікі бальніцы, моцна рызыкуючы, прымалі параненых на лячэнне пад выглядам мірных жыхароў.

Наступныя два з паловай гады Соф'я жыла ў штодзённым напружанні, з пастаянным унутраным страхам. Варта памыліцца – і цябе раскрыюць... Аднойчы так і здарылася. Не з ёю – з Іванам. Гестапа забрала яго 15 снежня 1943 года, калі Соф'я ўжо насіла пад сэрцам яго дзіця. І ён бясследна знік, яе любы Іван Каралёў, статны мужчына з прыгожым арыстакратычным тварам. Соф'я засталася ў пакойчыку адна.

Яшчэ ў бальніцы жыла і працавала Тамара – жонка афіцэра, які ваяваў на фронце. Жанчын аб'ядноўвала трывога за каханых, і яны стараліся

падтрымліваць адна адну. Асабліва цяжка прыходзілася Тамары: немцы перыядычна выклікалі яе на допыты і ўсё спрабавалі нешта выведаць. Ім не давала спакою званне яе мужа. Аднаго разу Тамару павалаклі ў гестапа ноччу, бесцырымонна падняўшы з пасцелі. Удзень яе прыгналі назад. Стаялі жорсткія зімовыя маразы, а яна, растрапаная, пабітая, брыла па вуліцы ў падранай ніжняй кашулі. Соф'я зацягнула Тамару да сябе ў пакойчык, таропка захутала яе ў цёплае і сутаргава сціснула ў абдымках.

– Што ж гэта такое, Тома? – бездапаможна вымавіла яна. – Што гэта робіцца?

Па мелавых шчаках Тамары каціліся слёзы. Яна слаба тулілася да сяброўкі і толькі бязгучна варушыла вуснамі, намагаючыся нешта сказаць. Нарэшце Соф'я разабрала яе жаласны перарывісты шэпт:

– Які сорам, які жудасны сорам... У кашулі... Перад людзьмі... Мяне ж усе ведаюць, Софачка, мы з табой урачы... А мяне – распранутую, па вуліцы... Які сорам...

Слёзы навярнуліся на вочы Соф'і, і яна расплакалася сама.

– Я больш так не магу, мне страшна... – выціснула яна ў адчаі. – Яны могуць вось так проста ўзяць ды забраць чалавека. Забралі майго Івана, забралі жонку Лёшы з дзецьмі... Брат піша мне з фронта: «Да апошняга буду змагацца, сябе не пашкадую! Паб'ю гэтых гадаў – за Вітку і за дзяцей!» А нас жа з табой таксама могуць забраць, Томачка... І я ў дадатак цяжарная... Усюды вайна, немцы – як я нараджу? Што гэта за жыццё такое несправядлівае?

Яна міжвольна абхапіла свой немалы жывот і бяссільна ўткнулася тварам у плячо Тамары.

– А ты не загадвай так далёка, – нягучна прагаварыла тая, і яе дрыжачая рука слізганула па валасах Соф'і. – Хай яно ідзе як ідзе, добра? А мы будзем проста жыць. Павінна ж усё калі-небудзь наладзіцца?

– Ты такая моцная жанчына... – Соф'я вінавата шморгнула носам і хуценька выцерла слёзы. – Калі ў мяне нарадзіцца дачка, я абавязкова назаву яе Тамарай у твой гонар.

– Не трэба, Софачка, бо я нешчаслівая, – уздыхнула Тамара. Яе запалыя вочы глядзелі сумна і сур'ёзна. – Ведаеш, ёсць такое прыгожае імя – Элеанора. Калі сапраўды будзе дачка, лепш назаві яе Элеанорай.

З наступнага допыту Тамара ўжо не вярнулася. Соф'я працягвала чакаць яе, не губляючы надзеі, але дні ішлі за днямі, а пра сяброўку не было ніякіх вестак. Яна прапала, як і Іван, і можна было толькі здагадвацца: ці то адправілі на працу, ці то забралі ў канцлагер, ці то расстралялі...

З той самай ночы Соф'я нязменна спала не распранаючыся. Яе мучыў стыхійны страх, што яе, цяжарную, таксама пагоняць перад усімі ў адной кашулі. Тая жорсткая сцэна ўрэзалася ёй у памяць, уелася ў плоць і кроў. Мінула амаль паўгода, а Соф'я працягвала прымхліва класціся спаць у вопратцы.

Дачка Элеанора паявілася на свет 15 чэрвеня 1944 года. Супакоеная і шчаслівая, Соф'я ляжала з ёю ў радзільным доме і ўсё ніяк не магла паверыць, што гэта яе ўласнае немаўлятка. Яна расла ў сям'і, дзе акрамя яе было адзінаццаць дзяцей, таму прыходзілася без канца няньчыць брацікаў і сястрычак. Праўда, шасцёра з іх памерлі яшчэ маленькімі, некаторым і гадочку не было. Вось прайшоў час – і Соф'я стала мамай сама. Канешне ж, яна паклапоціцца, каб з дачкой нічога не здарылася...

А 17 чэрвеня на Крупкі абрынуліся бомбы. Зямля стаяла дыбам, у небе страшна гула цэлая зграя нямецкіх самалётаў. Соф'я схапіла Элю, загорнутую ў пялёнкі, і рванулася прэч з радзільнага дома. Людзі ратаваліся, хто як мог: адны спешна запрагалі коней і перацягвалі на калёсы самае каштоўнае, другія ўцякалі, кінуўшы ўвесь набытак. Соф'я пабегла напрас-

ткі цераз поле следам за ўсімі. Далёка наперадзе цямнела выратавальная каёмка лесу, а над самай галавой з жудасным гырчаннем праносіліся самалёты – яны зноў і зноў пікіравалі і мсціва страчылі па людзях. Прыгінаючы галаву, Соф'я стрымгалоў неслася да лесу, і ноша ў яе руках з кожнай секундай рабілася ўсё цяжэйшай і цяжэйшай, а ўкрыццё нібыта зусім не набліжалася. Ледзь не губляючы розум ад жаху, Соф'я бегла з апошніх сіл, але ногі ўжо не трымалі яе, і ў рэшце рэшт яна звалілася на траву, накрыўшы дачку сабой. Маленькая Эля закрычала, напалоханая цяжарам, але Соф'я толькі мацней прыціснулася да зямлі. Яе ўсю калаціла, у скронях стукала кроў: «Калі мяне заб'юць, ты хоць сіратой не застанешся...»

Раптам нехта пачаў апантана трэсці Соф'ю за плячо:

– А ну не ляжы, уставай! Зараз жа ўставай, я сказаў!

Яе рыўком паднялі на ногі і павалаклі ўперад, а над імі па-ранейшаму грукаталі маторы і агрызаліся кулямёты. Хістаючыся, Соф'я брыла на аслабелых нагах і мёртвай хваткай трымала скрутак з дачкой. Яна не паспела заўважыць, калі ж закончылася поле, яе проста пхнулі ў вузкую адтуліну лясной зямлянкі. Яна апынулася ў непраглядным змроку, дзе было цесна і сумятліва, як у мурашніку. Усюды хныкалі дзеці, галасілі бабы, сярдзіта мацюкаліся мужыкі... Соф'я без сіл апусцілася на халодную земляную падлогу, якая дрыжала ад выбухаў, і крэпка заплюшчыла вочы, а з-пад яе павекаў неадольна пацяклі слёзы.

А далей усё злілося ў бясконцае невыноснае чаканне, якое саткалася з цемры, ляманту і выбухаў. Эля як пачала крычаць, так і не змаўкала, і Соф'я страціла надзею яе супакоіць. Яна перастала разумець, дзе яна і што з ёю; усё зрабілася падобным на цьмяны сон, з якога можна было вырвацца і прачнуцца на ўласным ложку. Не стала ні мінулага, ні будучыні – яе свядомасць сціснулася ў маленечкую іскру, якая жыла толькі кароткімі імгненнямі сучаснасці...

Не ведала Соф'я, што ніколі яна больш не ўбачыць свайго мужа Івана: ён назаўсёды знік у жорнах вайны. Пройдзе час, і ў Крупках з'явіцца помнік жыхарам, якія загінулі пры абароне Радзімы. На адной з пліт сярод іншых прозвішчаў будзе выбіты кароткі сухі надпіс: «Каралёў І. А.».

Не ведала Соф'я і таго, што 13 лістапада 1944 года яе малодшы брат Жэня прападзе без вестак, так і не паспеўшы толкам спазнаць жыццё.

І, канешне, яна не магла нават здагадвацца, што яе брат Лёша загіне ў Кёнігзбергу 26 красавіка 1945 года – тады, калі ў паветры ўжо будзе адчувацца подых доўгачаканай Перамогі. Ён да самай смерці будзе помсціць за сваю сям'ю, так і не даведаўшыся, што пасля вайны жонка разам з дзецьмі шчаслівa вярнулася дамоў...

Соф'я намаганнем волі вырвала сябе з мутнага забыцця і раптам усвядоміла, што зверху больш не даносіцца ні адзінага гуку. Па зямлянцы расцяклася цішыня, якая з нязвычкі ціснула на вушы, – такая густая, што чулася, як недзе тоненька звініць камар. Змоўкла нават стомленая Эля. Людзі напалохана перашэптваліся, але ніхто не знаходзіў у сабе дастаткова адвагі, каб высунуцца і паглядзець, што робіцца на паверхні.

Нарэшце ў змроку прашаргацелі цяжкія крокі, і нехта пачаў няўпэўнена корпацца ля ўвахода. Адкінулася шырокая дошка – і ў зямлянку ўварваліся асляпляльныя сонечныя прамяні. Соф'я тут жа загарадзілася рукой, а калі здолела расплюшчыць вочы, наверх ужо няспешна выбіраўся нейкі стары. З-за яго спіны з цікаўнасцю высоўваўся хлопчык.

– Вой, гляньце – снег! – заверашчаў ён. – Сапраўдны снег!

Людзі разам загаманілі і, ужо не вагаючыся, павалілі да выхаду. Не выпускаючы Элю, Соф'я таксама асцярожна вылезла наверх. Яна так

доўга прасядзела без святла ў душнай зямлянцы, што цяпер сонца рэзала вочы, паветра п'яніла, а чэрвеньскае неба, якое дыхала спякотай, здавалася незвычайна яркім і прыгожым. І куды ні глянь, трава і кусты былі засыпаны чымсьці белым-белым, нібы нехта клапатліва накрыў іх коўдрай...

Недалёка ад увахода ў зямлянку грувасціліся рэшткі воза, ушчэнт разбітага дакладным бомбавым ударам. А сярод абломкаў слаба гайдаліся шматкі светлай тканіны – толькі гаспадар змог бы распазнаць у тым, што засталося, свае каштоўныя падушкі і пярыны. Яны былі цудам уратаваны з хаты, але знайшлі свой канец пад адкрытым небам.

Прыціскаючы да сябе дачку, Соф'я апусцілася на траву і лагодна правяла рукой па мяккім слаі пер'я. Свавольнік вецер падхопліваў незлічоныя пушынкі, і яны легкадумна кружыліся ў паветры, як камячкі заўчаснага снегу...

***

Пра гэту гісторыю я даведалася ад Куліковай Элеаноры Міхайлаўны – той самай Элі, якая нарадзілася ў ваеннае ліхалецце. А сама яна пачула гэта ад сваёй маці, Свянціцкай Соф'і Мікалаеўны.

Старэйшы брат Соф'і, Свянціцкі Іван Мікалаевіч, быў маім прадзядулем. Ён прайшоў простым салдатам фінскую і Вялікую Айчынную вайну і вярнуўся дамоў з узнагародамі. Сярод іх былі медалі «За адвагу» і «За абарону Сталінграда».

Праз паўмесяца пасля згаданай бамбёжкі Крупскі раён быў паспяхова вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і Соф'я змагла з лёгкім сэрцам прысвяціць сябе дачцэ. А пасля вайны яна выйшла замуж у другі раз – за Кулікова Міхаіла Пракоф'евіча. Так маленькая Элеанора стала Міхайлаўнай, хаця яе сапраўднага бацьку звалі Іванам. Потым у Соф'і нарадзіўся сын, і яна назвала яго Аляксеем у гонар брата, які загінуў на вайне. Таленавіты Лёша стаў ударнікам у вакальна-інструментальным ансамблі «Тоніка», з якім працаваў народны артыст Беларусі Віктар Вуячыч. Але ў Аляксея, як і ў яго гераічнага цёзкі, было нядоўгае жыццё: у трыццаць гадоў ён памёр ад сардэчнай недастатковасці.

Пра сваю маці Элеанора Міхайлаўна расказвае наступнае: «Яна з такім гонарам насіла ўсе свае ордэны! Памятаю, аднойчы апраналіся мы з ёю на свята – Дзень Перамогі. Было халаднавата, і я накінула ёй на плечы вятровачку. На вуліцы я ўсё прасіла: "Мама, зашпіліся, холадна!" А яна горача ўпэўнівала: "Не-не, мне нармальна, мне цёпла!" І ішла шчаслівая, з расшпіленай вятроўкай, а на яе камізэльцы ўрачыста блішчалі ордэны... Да нас падбягалі маленькія дзеці, дарылі цюльпаны і радасна ціўкалі: "Віншуем са святам! Вялікі дзякуй!" Гэтыя цюльпаны мы клалі на плошчы Перамогі каля манумента, а яны пацíху апускалі галоўкі, быццам таксама схіляліся перад подзвігам народа...

Мама сама выбрала фатаграфію для ўласнага помніка. "Пасля маёй смерці вазьміце менавіта гэты здымак, – гаварыла яна. – Я так добра тут атрымалася!" Аднак потым, калі яе не стала, я зразумела, што не магу гэта зрабіць. Мама будзе кожны дзень глядзець з фатаграфіі і чакаць, калі я прыду да яе на магілку. Глядзець і чакаць, чакаць і глядзець – нават тады, калі мяне больш не будзе на свеце... Ніхто да яе не прыйдзе, а яна будзе верыць і спадзявацца...

Я падумала так – і скаланулася, а да горла падступіў камяк. Я не выканала волю мамы, не ўзяла яе фатаграфію. На помніку выбілі ордэн Айчыннай вайны, якім яна была ўзнагароджана... Як можна было паступіць інакш? Гэты позірк чакаў бы і чакаў мяне кожны дзень...»

*14–17.09.2016*



Свянціцкая Соф'я Мікалаеўна
(29.11.1917–01.02.2005)



Каралёў Іван Аляксандравіч
(1914 – прапаў 15.12.1943)

Кулікова Элеанора Міхайлаўна
(15.06.1944–03.02.2018)




Помнік у г. Крупкі



Свянціцкі Іван Мікалаевіч (1913–10.11.1975)
і его жонка Каўрыга Вольга Васільеўна (20.12.1922–25.07.2003)



Кулікоў Аляксей Міхайлавіч (12.10.1950–14.04.1981) з сястрой Элеанорай



ВІА «Тоніка». Аляксей Кулікоў чацвёрты справа

= = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = =

# *Леся*

= = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = = =

*Конкурс маладых літаратараў «Першацвет»*


Министерство информации Республики Беларусь
ОО «Союз писателей Беларуси»
РИУ «Издательский дом «Звязда»
Издательство «Мастацкая літаратура»

Диплом

Победителя международного литературного конкурса
«Першацвет»
в номинации «Проза»

Награждается
Значенок Дарья Александровна

МИНИСТР ИНФОРМАЦИИ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
Л.С. АНАНИЧ

Минск-2017



## 1

Яны зусім не ведалі адзін аднаго і сустракаліся толькі выпадкова. Часцей за ўсё гэта адбывалася ў парку, дзе абапал дарогі летуценна шапацелі лістатай каштаны, а ў паветры пяшчотна пахла вясной. Глеб Федарэнка ішоў рашучым парывістым крокам – сутулаваты малады мужчына ў чысцюткай лётнай форме і ў бездакорна адпаліраваных кірзавых ботах. А насустрач яму нязмушана тупалі дзве дзяўчыны-школьніцы, адна светленькая, другая цёмненькая, і абедзве з касічкамі, падвязанымі «кошыкам». Школьніцы заўважалі мужчыну яшчэ здалёк і тут жа пачыналі па-змоўніцку перагаворвацца, кідаючы на яго пільныя погляды. Светлавалосая дзяўчына толькі крадком узнімала вочы, а яе сяброўка тарашчылася ў адкрытую і ўсё нешта імпэтна шаптала, быццам спрабавала ў нечым пераканаць.

Калі адлегласць паміж імі і лётчыкам рабілася зусім нязначнай, яны змаўкалі, як па камандзе, і прымалі сціпла-абыякавы выгляд. Тое, як незалежна яны памахвалі партфелямі, так і казала: «А мы вас нават не бачым, а нам увогуле ўсё роўна...»

– Прывітанне, – крывавата ўсміхаўся Глеб, крыху схіляючы галаву.

Светлавалосая дзяўчына мімаволі распраўляла плечы:

– Добры дзень!

Ён праходзіў міма і спакойна крочыў далей, захоўваючы на твары ўсё тую ж стрыманую ўсмешку. Нават не азіраючыся, ён ведаў, што дзяўчаты глядзяць яму ўслед і зноў узбуджана шэпчуцца. Ён і не азіраўся. Ніколі. Гэта было для яго адным з тых няпісаных правілаў, якія прыдумляюцца выпадкова, але з цягам часу ператвараюцца ў няўхільны закон. Такім жа законам было для яго і тое, што пры сустрэчы з Лесяй трэба коратка сказаць: «Прывітанне». І яна абавязкова адгукнецца: «Добры дзень...»

***

Гэта пачалося некалькі месяцаў таму, у сакавіку сорак першага. Дзень быў хмурны і золкі, пад ботамі хрупалі падмерзлыя лужыны – сляды ўчарашняй адлігі. Глеб павінен быў зайсці па сябра, але перш чым ён знайшоў патрэбны дом, прыйшлося трохі паблукаць: ён даўно не быў у гэтых дварах. Толькі выдатная зрокавая памяць – прафесійная рыса лётчыка – змагла падказаць яму правільны напрамак. Вока чаплялася то за адзін арыенцір, то за другі, і ў рэшце рэшт Глеб апынуўся каля знаёмага пад'езда. Звыкла ўзняўшы галаву, ён адзначыў, што ў кватэры Мішкі запалена святло. «Яшчэ дома, – падумаў Глеб, і яго кальнула незадавальненне. – Мог бы ўжо выйсці!»

І тут нехта наляцеў на яго – ды так нечакана, што Глеб пахіснуўся і ледзь утрымаў раўнавагу. Шапка звалілася з яго галавы і ахвотна плюхнулася ў лужыну, якая па капрызе лёсу не зацягнулася лёдам.

– Вой-вой, прабачце, калі ласка! – У тонкім дзявочым голасе чулася шчырае засмучэнне.

Глеб падхапіў шапку так хутка, як змог, але яна ўжо паспела набрыняць вадой. Ён гнеўна ўскінуў позірк на вінаватую: светлы берэцік, цёмнае старэнькае паліто – і вялікія напалоханыя вочы.

– Я не хацела, праўда! Яна вельмі прамокла?

Не стрымаўшыся, Глеб раздражнёна прашыпеў:

– Ішлі б вы... па сваіх справах!

Дзяўчынка разгублена адступіла і, глянуўшы на яго шынель, сумна ўсміхнулася:

– Ну чаго вы грубіце? А яшчэ афіцэр!

Яна праслізнула міма і заспяшалася прэч, а Глеб, чартыхнуўшыся, нырнуў у пад'езд.

Канешне, Мішка яшчэ не сабраўся.

– Ты давай праходзь, а я зараз, толькі апрануся, – мітусліва паведаміў ён і тут жа знік у пакоі. – Два дні як прыехаў і распакаваўся, але верыш – нічагуткі знайсці не магу! Проста нейкае насланне!

Глеб глыбока ўдыхнуў і далічыў да дваццаці, каб не сарвацца на сябры. Вырашыўшы не губляць час дарэмна, ён уладкаваў шапку на батарэі.

*(Працяг глядзіце ў зорніку “Першацвет” і на сайце БДТУ, дзе гэта праца рямашчана без скарачэнняў)*

# *Изобразительное искусство*














# Военные парады

• участие в спортивно-молодёжном шествии, посвященном 70-летию Победы советского народа в Великой Отечественной войне, 9 мая 2015 года;

• участие в массовом номере «Са святам, любая Айчына» в рамках военного парада, посвященного Дню Независимости Республики Беларусь, 3 июля 2016 года.



# *Другие мероприятия*




*31.05.2015*
*Экскурсия на партизанскую стоянку Александрово*
*и к мемориальному комплексу Литавец*




*08.12.2015*
*Выступление на творческом вечере*
*«Слова і музыку голас яднае» литературного клуба «Ветліца»*




*27.10.2016*
*Участие в дискуссии «Книга – знание или часть интерьера»*
*на базе Научной библиотеки БНТУ*




*21.02.2017*
*Выступление на концерте, посвященном Дню родного языка*

# ВАКАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ БДТУ «АКАВІТА»



*Да 25-годдзя творчай дзейнасці вакальнага ансамбля выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДТУ "Акавіта"*

*Спявайце песню родную –*
*Вясёлую, самотную,*
*Спявайце песню родную*
*народную…*

*Ул. Мазго*

### *Душа просіць песні*

У 2019 годзе спаўняецца 25 год творчай дзейнасці спеўнага гурта "Акавіта". Пачаткам працы калектыву можна лічыць першае выступленне для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, наладжанае адміністрацыяй універсітэта і прафкамам, якое адбылося напярэдадні свята – вызвалення Мінска – у пачатку ліпеня 1994 года.

А задума стварыць спеўны калектыў узнікла значна раней і выношвалася некалькі год. Варта адзначыць, што ажыццявіць гэту задуму дапамог "Універсітэт беларускай мовы, гісторыі і культуры", які быў створаны ў БДТУ ў 90-я гады XX стагоддзя і служыў своеасаблівым універсітэтам павышэння кваліфікацыі для спецыялістаў вышэйшай школы. У гэтым універсітэце , акрамя заняткаў, наладжваліся вечарыны, дзе выкладчыкі маглі праявіць свае творчыя здольнасці ў выкананні песні, дэкламацыі верша, у акцёрскай ігры і інш. Дзякуючы гэтаму вызначылася кола патэнцыяльных удзельнікаў будучага калектыву.

Калі адміністрацыяй БДТУ было прапанавана зрабіць выступленне для ветэранаў, тады Савіцкая Н. Я. – выкладчык і метадыст гэтага Універсітэта, склала сцэнарый вечарыны і запрасіла для выступлення выкладчыцу гэтага Універсітэта Рэут Ніну Міхайлаўну і супрацоўніцу дэканата па рабоце з замежнымі грамадзянамі Мядзведзеву Таццяну Іванаўну – яны хораша спявалі – паўдзельнічаць у мерапрыемстве. Выступленне спадабалася прысутным, і быў дадзены дазвол стварыць калектыў. Яланецкі Зіновій Іосіфавіч – дырэктар студэнцкага клуба – пачаў шукаць мастацкага кіраўніка, а Савіцкая Надзея Яўсееўна – падбіраць спевакоў. З кастрычніка 1994 года пачаліся рэпетыцыі. Першым мастацкім кіраўніком была старшы выкладчык Мінскага інстытута культуры Ліёзнава Вольга Аляксандраўна. Збіраюцца на рэпетыцыі першыя ўдзельнікі калектыву – Мядзведзева Т. І., Міксюк Р. В., Шостак А. П., Фарафонтаў В. М., Паплаўская А. І. Пазней далучаюцца Сяўко А. А., Сакалоўскі І. В., Наскавец М. Т.

З кастрычніка 1997 года мастацкі кіраўнік ансамбля – Аляксандр Палікарпавіч Лях. Ён закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры, працаваў настаўнікам музыкі, з'яўляецца мастацкім кіраўніком Народнага ансамбля песні і танца імя Агінскага (г. Смаргонь), Народнага хора Завода аптычнага станкабудавання (г. Смаргонь ). Творчае жыццё актывізавалася з прыходам у калектыў Ляха А. П., які больш увагі стаў удзяляць народнай песні, не забываючы класіку і песні сучасных кампазітараў, песні народаў свету і духоўную музыку. Ансамбль папаўняецца новымі ўдзельнікамі. Гэта – Дайлід Л. В., Бандарэнка Ж. У., Бялясава Н. А., Чорная Н. В., Чэрнік А. А., Каржэль М. С., Кабайла А. С., Рыбакова Н. А., Марозава Ю. К., Ламоткіна Н.В.,Александровіч П. І., Куліковіч У. І., Дамброўская Н. В., Гаркавая М. А., Маціна С. Г., Сідралёнак А. Ф., Мініч Т. У., Татарэвіч В. А.,Марозава Ю. К.,Пагарэлава Ю. К., Шамовіч В., Малініна Л. Я., Паўлюкевіч К. М.,Курачкіна Н. В., Нікіценка А. І., Брусянцова Т. П., Карпінская А. І., Шуцін С. Г.

Акампаніятарамі працавалі: Болбат А. М., Янкоўскі І. В., Рамановіч В. Р., Маліноўскі В. В. Зараз канцэртмайтар “Акавіты” – Болбат Аркадзій Мікалаевіч.

Акапаніятар Рамановіч В.Р. іншы раз здзіўляўся таму, што без ніякага матэрыяльнага заахвочвання, ахвяруючы сваім каштоўнейшым часам, вельмі занятыя працай людзі знаходзілі час для спеваў. Чаму людзі прыходзяць спяваць? Ды таму, што гэтага просіць душа. Увогуле беларусы – вельмі спеўная нацыя, не менш, чым украінцы ці рускія, а можа, нават і больш. Нездарма беларусаў некаторыя нашы суседзі называлі гудамі, таму што гудуць (спяваюць), ідучы на працу і з працы (стомленыя), на радзінах, на хрысцінах, на вяселлях, на хаўтурах, ды, увогуле, круглы год. Нават ёсць гадавы каляндарна-абрадавы спеўны цыкл. І сапраўды, як сказала ў адным са сваіх вершаў сучасная беларуская паэтэса Аксана Гаравенка “Не просто песней звук даётся – ,/Душа коль хочет – так поёт”. Душа просіць песні і спявае, і песняй ачышчае і ўзвышае гэтую ж душу. Ад простага, звычайнага, паўсядзёнага, як бы адштурхоўваецца, і становячыся лёгкай, узлятае, лунае…

А што такое песня? Напрыклад, Роберт Раждзественскі пісаў, што “Песня – особый способ чтения стихов”. Значыць, у песні ёсць два крылы – вершы-словы і мелодыя, музыка. І што тут больш важнае, вызначыць немагчыма. Слова дае сэнс або сэнсы – простыя і глыбінныя, калі ты, як быццам, і ведаеш значэнне слова, але яно ў кантэксце іншых слоў, набывае большую значнасць, велічнасць, само стварае музыку і ,можа, нават набывае новае значэнне. А тут яшчэ далучаецца і мелодыя, і рытм, і ... загучала песня. Сапраўдная песня, якая можа жыць і жыве стагоддзямі і тысячагоддзямі.

Заглыбляючыся ў фальклорныя напевы, калектыў не забывае і сучасныя мелодыі. Але шукае такія, якія блізкія да народных, ведаючы, што “Кожны рытм,афарбаваны народнай асновай, заўсёды будзе адпавядаць духу часу” (Уладзімір Мулявін). І калектыў імкнецца, стоячы на глыбінным, народным, адпавядаць патрабаванням сённяшняга дня. Таму і выступленні калектыву маюць поспех як у сталай аўдыторыі, так і ў маладзевым асяродку.

Іншы раз пытаюцца, што азначае слова “акавіта”? На гэта пытанне можна адказаць так: у слоўніку Ірыны Шкраба “Самабытнае слова”, яно падаецца як дыялектнае і мае паходжанне з лацінскіх каранёў: “аква” – вада і “віта” – жыццё, жывая вада. А ў народзе так называюць гарэлку, настояную на зёлках ці каранях, якой гояць розныя хваробы цела. Гэта

першае – прамое значэнне слова. Але ёсць і пераноснае. “Акавіта” – гэта нешта высокае, духоўнае, гэта тыя словы, тыя мелодыі, тыя гукі, якімі лечыцца душа, узвышаецца, становіцца здольнай да палёту, да высокіх імкненняў, да касмічных вышыняў. Наш калектыў “Акавіта” імкнецца адпавядаць сэнсу гэтага слова ў самым высокім яго значэнні. Наша “акавіта” – песня “Акавіты”. Таму іншы раз на канцэртах мы кажам :”Піце нашу акавіту”, – гэта значыць, ачышчайцеся, узбагачайцеся і ўзвышайцеся нашай песняй.

“Акавіта” спявае ўжо 25 год. Выступленні ў сотнях канцэртаў, мерапрыемстваў, акцый, конкурсаў, фестываляў робіць калектыў пазнавальным, бо ён унікальны ў сваім родзе па падборы рэпертуару, вакальнай яго падачы, адметнасці гучання, галасоў, касцюмаў, выканаўцаў. Можна сказаць, што “Акавіта” – адна з візітных картак БДТУ, яго своеасаблівы брэнд.

Якія нашы набыткі за чвэрць стагоддзя? Перш за усё, – гэта людзі, якія спяваюць ці спявалі ў “Акавіце”, кіраўнікі, акампаніятары. Разам мы ствараем калектыў, нягледзячы на тое, што мы ўсе вельмі розныя – сваімі поглядамі, памкненнямі, характрамі, звычкамі, густамі і г.д. Але з’ядноўвае нас песня. Яна ўзвышае. І мы паварочваемся адзін да аднаго сваімі лепшымі бакамі, умеем мабілізавацца, быць адказнымі, прыйсці на выручку, узаемадапамогу. Мы любім спяваць. І адчуваем прыгажосць і слова, і мелодыі, і галасоў, і гармоніі, і суладдзя ўсяго гэтага, узятага разам, пры добрым выкананні.

Канечне, кожны з нас асоба. Асоба непаўторная і незаменная. На вялікі жаль, некаторыя з акавітаўцаў нечпадзеўна, але назаўсёды развіталіся з намі.Пасля цяжкіх хвароб адышлі ў іншы свет нашы спевакі. Гэта: салістка калектыву – Жанна Уладзіміраўна Бандарэнка, барытон – Аляксандр Серафімавіч Кабайла, тэнар – Міхаіл Сцяпанавіч Каржэль, сапрана – Антаніна Іванаўна Паплаўская, акапампаніятар – Валерый Раманавіч Раманоўскі. Вечная Вам памяць і вечны супакой. Вы назаўсёды ў нашай памяці, да скону нашых дзён. Мы Вас любім і памятаем маладымі, таленавітымі, поўнымі сіл і натхнення, памятаем Вашы галасы, Вашы аблічча, памятаем Вас як людзей, якія ўвасаблялі сабой дабрыню і прыгажосць, якія бачылі гэта ў іншых неслі дабро і прыгажосць у свет цэлы.

Напрыканцы лютага, развітаўшыся з Жаннай Уладзіміраўнай, пасмуткаваўшы, зрабіўшы перапынак у рэпетыцыях, усё-такі збіраемся адзначыць наш юбілей. Азіраючыся назад, бачым наш няпросты шлях і нашы набыткі. У рэпертуары “Акавіты” звыш 100 песень; два запісаныя дыскі; “Гімн БДТУ”(створаны ў “Акавіце”); буклет “Акавіта”; тры пары касцюмаў: народны, старажытна-арыстакратычны “Рагнеда” і касцюм беларускай шляхетнай гараджанкі канца 19 – пачатку 20 стагоддзя; шматлікія Граматы і Дыпломы і інш.

У нас шмат прыхільнікаў і аднадумцаў, як у нашым універсітэце, так і ў рэспубліцы. Гэта Саюз блакаднікаў Ленінграда ў Беларусі з нязменным кіраўніком – Марыяй Давыдаўнай Ягадніцынай, ветэранскія арганізацыі і арганізацыі інвалідаў, бібліятэкі, школы, гімназіі, жыхары горада Мінска, для якіх мы выступалі на розных пляцоўках на святах горада (Міхайлаўскі сквер, парк імя Грэкавай, Алімпійская вёска), на свяце Ленінскага раёна (Лошыцкі парк) і інш. Гэта роднасныя нам калектывы – “Жытніца” з вёскі Зазерка Пухавіцкага раёна, два народныя калектывы са Смаргоні – “Ансамбль песні і танца імя Агінскага” і хор Станкабудаўнічага завода.

Нягледзячы на розныя цяжкасці, якія сустракаюцца на шляху, калектыў жыве і плённа працуе.

А сённяшні склад “Акавіты” наступны:







21 лютага – Міжнародны
дзень роднай мовы
21 лютага






Мужчынская група

Наскавец МіхаілТрафімавіч – дацэнт  кафедры транспарту лесу, к.т.н., тэнар, паэт, аўтар слоў гімна БДТУ;

Сакалоўскі Іван Васільевіч – дацэнт кафедры лясных культур і глебазнаўства, к.с\х.н., тэнар;

Фарафонтаў Валерый Мікалаевіч – дацэнт кафедры цеплатэхнікі, к.х.н., барытон;

Куліковіч Уладзімір Іванавіч – загадчык кафедры рэдакцыйных тэхналогій, дацэнт, к.ф.н., паэт, музыкант, чытальнік вершаў, канферансье;

Жаночая група

Надзея Яўсееўна САВІЦКАЯ – кіраўнік-арганізатар, былы старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі (зараз педагог-арганізатар студгарадка БДТУ), арганізатар  і кіраўнік  вакальнага ансамбля выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДТУ “Акавіта” (з 1994 г.), арганізатар і кіраўнік літаратурнага клуба “Ветліца”( з 1997 г.), ініцыятар стварэння гімна БДТУ, выдання літаратурнага альманаха “AVE”, сапрана.

Міксюк Рэгіна Вячаславаўна – старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі, сапрана, аўтар тэкстаў песень.

Дамброўская Наталля Валянцінаўна – інжынер-энергетык, першы альт.

Чэрнік Алена Алегаўна – інжынер патэнтна-інфармацыйнага аддзела, першы альт.

Сідралёнак Алена Фёдараўна – лабарант кафедры лясных культур і глебазнаўства, сапрана.

Мініч Таццяна Уладзіміраўна – загадчык лабараторыі кафедры лясных культур і глебазнаўства, сапрана.

Татарэвіч Валянціна Аляксееўна – дыспетчар дэканата лесагаспадарчага факультэта, другі альт.

Курачкіна Наталля Валянцінаўна – спецыяліст Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, сапрана.

Нікіценка Анастасія Мікалаеўна – к.т.н., дацэнт кафедры фізіка-хімічных метадаў сертыфікацыі прадукцыі,  першы альт.

Брусянцова Таццяна Паладзьеўна – старшы выкладчык кафедры інфарматыкі і вэбдызайну, першы альт.

Карпінская Ала Іванаўна – выхавальнік інтэрната №5, сапрана.

Не забываюць "Акавіту", прыязджаюць на рэпетыцыі і ўдельнічаюць у канцэртах, тыя, хто па розных прычынах ужо не працуе ў БДТУ.

Гаркавая Марыя Арсеньеўна – выхавальніца інтэрната № 1, другі альт, зараз працуе ў школе.

Малініна Любоў Янакаўна – камендант інтэрната № 5, сапрана, салістка ансамбля, зараз сацыяльны педагог Заводскага раёна г.Мінска

Александровіч Пётр Іванавіч – дацэнт кафедры гісторыі і паліталогіі,к.п.н., палкоўнік у адстаўцы, саліст ансамбля, тэнар, лаўрэат усесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў. Зараз працуе ў Інстытуце нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, прафесар кафедры псіхалогіі.

Шуцін Сяргей Георгіевіч – к.х.н.,вядучы навуковы супрацоўнік ААТ "Белгархімпрам".

"Акавіта" супрацоўнічае з літаратурным клубам "Ветліца". Гэта вельмі ўдалы творчы тандэм, дзякуючы якому здзейснены дзясяткі творчых задум і праектаў – вечарыны, канцэрты і інш. Але, бадай, самым значным будзе напісанне "Гімна БДТУ" (верш дац. Наскаўца М. Т.), "Прысвячэнне "Акавіце" (верш Р. В. Міксюк), песня-візітоўка для Народнага калектыву вёскі Зазерка "Жытніца" (верш Куліковіча У. І.). Музыку да ўсіх твораў напісаў А. П. Лях. Дзве песні напісаны ім на вершы Вольгі Бергольц, пры падрыхтоўцы вечарыны з нагоды яе юбілею, новыя песні на вершы Міхаіла Наскаўца, Рэгіны Міксюк, Сяргея Мацiна , Мікалая Вырко і інш. У гэтым зборніку друкуюцца новыя песні, напісаныя Ляхам А.П. за апошнія 5 год.

Жыццё ідзе наперад, і мы таксама імкнёмся быць арганічнымі ў гэтым зменлівым асяроддзі, адпавядаць часу, не губляць свайго крэда, быць аптымістамі. Мы рэалісты, але ж крыху і рамантыкі, здольныя дапускаць мары ў сваё жыццё. І гэта важна, бо, як пісала Вера Вярба, "…нават мары аб вясне даволі, каб вясна цвіла ў жыцці тваім". Дык хай цвіце вясна-мара ў нашым і вашым жыцці, у нашай творчасці, у нашых песнях, у нашых душах. Бо вясна – гэта прыгажосць, імпэт, гэта абуджэнне і адраджэнне прыроды, якое моцна ўздзейнічае на чалавека. Вясна атаясамліваецца з маладосцю. У "Акавіце" спяваюць людзі розных узростаў, але душа ва ўсіх маладая, як малады і калектыў. Малады сваёй энергіяй, калектыўнай сілай духу і высокай творчасцю. 25 – гэта сапраўды яшчэ вясна ў жыцці чалавека, у жыцці ж калектыву – значны перыяд. Азіраючыся на пройдзены шлях – гэта чвэрць стагоддзя – бачым колькі і як зроблена, але, маючы і вопыт, і сілы, і галасы, будзем з годнасцю крочыць наперад з акавітаўскай песняй – душой народа і для народа.



Прапануем песні Аляксандра Ляха, створаныя ў «Акавіце»
за апошніх пяць гадоў

## *Душа поёт*

*В. Божидай* *А. Ляха*




У каждого своя судьба,
Но если песня с нами
Мы ею с радостью всегда
Поделимся с друзьями.

И не считаем мы года
Морщинки не считаем
Мы с песней молоды всегда
Чего и вам желаем!

Ах, до чего же хороша
Порою жизнь бывает.

## *Ах черёмуха белая*

*сл. В. Божидай* *А. Ляха*




Я весной с тобой повстречалась,
Белая черёмуха цвела.
Свои чувства прятать не пыталась,
Ведь любовь взаимною была.

Знаю я, ты послан мне судьбою,
Встреча не случайною была.
Сохранить сумеем мы с тобою,
Первую любовь в душе всегда.



*Савіцкая Н. Я. і салістка ансамбля Малініна Л. Я.*

## *Беларусь мая сінявокая*

*сл. Р. Міксюк* *А. Ляха*




Звон пчаліны зялёных гаёў,
Шум смалістых багатых бароў.
Запаветны напеў роднай песні
Пранясуць журавы ў паднябессі.

Славім веліч тваіх гарадоў,
Пах духмянага хлеба з палёў,
Прыгажосць рушнікоў вышываных
З васількоў і рамонкаў сатканых.

# Бывает так

*сл. А. Станкевича* — *А. Ляха*




Как хорошо, что снова пахнет маем,
Что вновь цветы способен я дарить…
И пусть пока я их в мечтах ласкаю,
И счастлив, что умею так любить.

## *Голас Багушэвіча*

*сл. М. Дуксы* *А. Ляха*




Ужо ён як праз сон,
Праз гулкі пошчак маю,
Праз гушчу шэрых дзён
Да слыху далятае.

Да нашых рвецца дум
І патрабуе ўвагі
Цераз штодзённы тлум,
Дробязныя звагі.

І сэнс яго жывы,
Пяршыць і сёння ў горле:
Любіце мову Вы,
Каб назаўжды не ўмёрлі.

## *Гроздья рябин*

*сл. А. Станкевича* *А. Ляха*






Красногрудый снегирь притаился на дереве.
Он, как вестник зимы ледяной...
А над лесом плывут облака тёмно-серые,
Любуясь с высот неземной красотой.

Красным цветом по белому каплями светитесь,
Как огонь, в этом тихом лесу...
Если с другом в пургу вы с рябиною встретитесь...
Значит, белый январь приближает весну!



*Пасля прафарыентацыйнага выступлення*
*для абітурыентаў і настаўнікаў Ашмянскага раёна.*
*На фота члены «Акавіты» з адміністрацыяй раёна, школы*
*і арганізатарам мерапрыемства – Кулiковiчам Уладзiмiрам Iванавiчам,*
*загадчыкам кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій.*

## *Грусть по тем глазам*

*сл. А. Станкевича* — *А. Ляха*




И то минутное желание
Сейчас покажется смешным,
Со мной шутить ты перестанешь,
И стану я совсем иным.

Но горько мне томить усталость,
И я грущу по тем глазам...
Я промолчал, мне показалось,
Что это месть прошедшим дням

*Детскому саду № 85 г. Гродно посвящается*

*А. Ляха*



## *Есть имя одно*

*сл. А. Станкевича* — *А. Ляха*




Я с именем этим спокоен всегда,
Оно – крепостная защита...
И как по стерне, где тропа пролегла
Шагаю я с именем этим.

Есть имя, с которым связал я судьбу,
Любовь разделил и надежды.
Оно позовёт, непременно приду
Отдать ему ласку и нежность.

Звучит оно в песнях, как символ мечта,
Летящей в бескрайние дали.
Тебе уложу я к ногам все цветы,
Родная моя, дорогая!

Пусть Богом отмерены сроки, года,
Пусть сердце стучит, не старея,
И слышать, и видеть желаю всегда
Твой голос и стан на земле я, Татьяна!

## *Завадская святочная*

*сл. А. Падгола* *А. Лях*




Сёння ты навічок, заўтра майстар,
Толькі ў справу з душою ўнікай,
І працоўнае, добрае шчасце,
Узнагарода умелым рукам.

Мы ў заўтрашні дзень акрылёна,
Яшчэ з большай надзеяй глядзім,
Мір мацуем усе працай натхнёнай,
І парушыць яго не дадзім.

Мы з заводам расцём год ад году,
З ім мы будзем расці і далей,
Юбілей адзначаем завода –
Гэта значыць і наш юбілей.

## *Красуням Беларусі*

*сл. М. Дуксы* *А. Ляха*




Яшчэ нядаўна – летась, пазалетась,
Яна была звычайнай, як усе,
А сёння валасоў бялёсых ветразь
Вось-вось яе кудысьці панясе.

Хто выставіў у гэты дзень нядзельны
Сталічную красуню напаказ?
Хто выканаў, каб стала звышмадэльнай,
У майстэрні Бога гэты спецзаказ?

*Курсантам ИНБ Республики Беларусь посвящается*

*сл. А. Станкевича* | *А. Ляха*



## *Милый ангел*

*сл. В. Божидай* *А. Ляха*




Всегда ты даришь мне тепло в ненастье,
Оберегаешь, замедляя ход.
Хранишь мою любовь, удачу, счастье,
От передряг житейских и невзгод.

Всю жизнь тебе я благодарна буду,
Мой нежный ангел, посланный судьбой.
За то, что ты со мной идёшь повсюду, милый ангел мой!
Мой милый ангел, ты хранитель мой!

## *Рака жыцця*

*сл. М. Дуксы* *А. Ляха*




15
кі, не сум–ня–вай–ся ў тым, што ты шчас–лівы. Па–куль у
ны, твой сму–так вы–пад–ко–вы–не сур'–ёз–ны. Не ўчы-няць
18
хра–ме пра віц–ца ім–ша, прыс ве–ча–ная іх–ня–му зда–роў–ю, твая
бед вя–лі–кіх скраз ня–кі. Га–ні ад–чай, маўк–лі-васць і за–ця–тасць. Па–
22
та–ка–я лёг–ка–я ду–ша, уз – не–се–на–я ўдзяч–на–ю лю–боў–
куль тва–е яш–чэ жы–вуць баць–кі, ту–лі да сэр–ца, як ня–вес–ту,
25
ю. Не ў–чы–няць бед вя–лі–кіх скраз–
ра–дасць. Не ў–чы–няць бед вя–лі–кіх скраз–


27
някі. Га – ні ад – чай, маўк – лі – васць і за – ця – тасць. Па –
някі. Га – ні ад – чай, маўк – лі – васць і за – ця – тасць. Па –
30
куль тва – е яш – чэ жы вуць баць – кі, ту – лі да сэр–ца, як ня–вес–ту, ра–дасць. Ту–
куль тва – е яш – чэ жы вуць баць – кі, ту – лі да сэр–ца, як ня–вес–ту, ра–дасць. Ту–
34
лі да сэр – ца, як ня-вес – ту ра – дасць.
лі да сэр – ца, як ня-вес – ту ра – дасць.

## *Яблыня, сонца, хмурынка, сінічка*

*сл. М. Дуксы* — *А. Ляха*




Яблыня, сонца, хмурынка, сінічка,
Вечны, нязводны ручай за кустамі.
Самая добрая моцная звычка –
Не расставацца, як з іншымі, з вамі.

Вы спадарожнікі радасці й жалю,
Дні нашы разам ядналі ў згодзе.
Вы на світанні мяне прывіталі,
Не пакідаеце пры адыходзе.



*На рэпетыцыі перад выступленнем у канцэрце, прысвечаным Дню Перамогі*

# КРЫТЫКА
# І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА



*Вольга КУЗЬМІЧ*

*Кузьміч Вольга Аляксандраўна – заслужаны работнік народнай адукацыі Беларускай ССР, выдатнік адукацыі. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у 1967 годзе З 1992 па 1996 год – старшыня пастаяннай камісіі Мінгарсавета па адукацыі і выхаванні. З 1996 па 2011 год – загадчык кафедры беларускай мовы БДТУ, потым дацэнт гэтай кафедры, кіраўнік студэнцкага гуртка "Памяць" – зараз знаходзіцца на заслужаным адпачынку, але цікавіцца сучасным літаратурным жыццём Рэспублікі Беларусь і БДТУ у прыватнасці.*

## Паэзія – гэта гаючыя лекі

*Эсэ*

Паэзія існуе для таго, каб уздзейнічаць на душу і сэрца чалавека, прымусіць яго задумацца аб існасці жыцця, яго маральных вытокаў і светаадчування. Сапраўдны верш – гэта гаючыя лекі для тых, хто знаходзіцца ў адчаі і скрусе, бальзам для ўпэўненых у сабе людзей, падтрымка для тых, хто яшчэ не вызначыўся ў сваім стаўленні да жыцця, ў сваіх пачуццях.

Чытаючы вершы Валерыя Пазняка (зборнік "Родны бераг", Мінск: "МІНКОПРЫНТ", 2017), адчуваю сваю еднасць з аўтарам – узроставую, само сабой, і духоўную. Кожны радок верша як бы твой, створаны для цябе, але ж і іншыя так адчуваюць. Балюча і шчымліва згадваеш родны дом, бацькоў, матуліны смех і слёзы, і матуліны пірагі, і родныя сцежкі, якія вялі то ў лес, то ў поле, то да возера. Успамінаеш добрыя вочы бабулі, строгі бацькоўскі пагляд. Чуеш пах таго ветрыка, насычанага разнатраўем, аерам, бэзам, язмінам (ніхто ў свеце не стварыў духі з пахам малой радзімы, то ў кожнага свой водар, які ніколі не адпусціць). У паэта той жа боль, і тая ж любоў. Толькі на малой радзіме ты сапраўды шчыры і сумленны. Вялікія гарады і іншыя краіны выхалоджваюць тваю душу, прымушаюць пры стасоўвацца да абставін, быць няшчырым і нават кахаць тую, якая не варта тваіх пачуццяў. Гэта жыццё, і яно ў яго рэальнае, шчырае. І пакаянне таксама шчырае, бо чалавек ніколі не хлусіў сам сабе. "Патрэбен шчыры дыялог з самім сабою", – і гэта праўда.

Сціпласць – ці не асноўная рыса характару аўтара, як, дарэчы, і ўсяго беларускага народа ("Не люблю я гучных слоў", "не прагну я ўлады"). Як бы такія людзі спатрэбіліся тым, хто пры ўладзе! Ці не праўда?

І як змяняецца сумота на пяшчоту, замілаванне, калі размова вядзецца пра найвялікшае пачуццё – каханне. І хоць у свой час яно было страчана аўтарам (магчыма па прычыне сціпласці), яно вярнулася, каб жыць, даваць надзею адчуць сябе тым жа шчаслівым, толькі яшчэ больш у сталым узросце. Любая жанчына хацела б пачуць такія цёплыя словы "Скажу ўсяму я свету, што даражу табой адной", "каханне з Божае мілосці прыходзіць у любым узросце". Цудоўна, хай яно так і будзе. Хай жыве яно, каханне, хай доўга жыве сам аўтар. Гэта ж чароўны зборнік з яго светлай, чыстай душой. І заўсёды знойдзецца той, хто з задавальненнем прачытае радкі вершаў паэта Валерыя Пазняка.

# *ДА 150-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯДВІГІНА Ш.*

*Надзея САВІЦКАЯ*



*Савіцкая Надзея Яўсееўна – старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі да кастрычніка 2019 года. Зараз працуе педагогам-арганізатарам у студэнцкім гарадку БДТУ. У 1975 годзе скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, спецыяльнасць «Беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура», пазней аспірантуру ў Мінскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Горкага. У БДТУ працуе з 1976 года. Стваральнік і нязменны кіраўнік літаратурнага клуба "Ветліца", якому ў 2019 годзе спаўняецца 22 гады, і заснавальнік і кіраўнік-арганізатар вакальнага ансамбля выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДТУ "Акавіта", якому спаўняецца 25 гадоў. З 2003 года выдае літаратурна-мастацкі альманах "AVE" (Адраджэнне. Вера. Еднасць). Гэта маштабнае і ўнікальнае выданне ў Рэспубліцы Беларусь па многіх параметрах. Выйшла з друку 8 нумароў, зараз выдаецца № 9 і збіраецца матэрыял у № 10.*

## *Вялікі Беларус Ядвігін Ш.*

*(1868 – 1922)*



Ядзвігін Ш. (Лявіцкі Антон Іванавіч) нарадзіўся ў маёнтку Добасна Рагачоўскага павета Магілеўскай губерii (зараз Рагачоўскі раён Гомельскай вобласці), дзе бацька служыў ўпраўляючым.

Вучыўся ў прыватнай школе В. Дуніна-Марцінкевіча, дзе выкладала дачка пісьменніка Каміла. Скончыў Мінскую гімназію, паступіў у Маскоўскі ўніверсітэт на медыцынскі факультэт. удзельнічаў у студэнцкіх хваляваннях, за што быў зняволены ў Бутыркі. Пасля вызвалення ўжо не мог вучыцца ва ўніверсітэце. Здаў экзамен на аптэкара, стаў працаваць памочнікам правізара ў мястэчку Радашковічы, недалёка ад Карпілаўкі – фальварка Лявіцкіх. Спачатку Ядвігін Ш. піша апавяданні і публіцыстычныя артыкулы пра Беларусь на рускай мове. У газеце "Наша доля" (1906, №3) было надрукавана першае апавяданне Ядвігіна Ш. на беларускай мове "Суд". Самы плённы творчы перыяду жыцця пісьменніка з 1906 па 1914 год. У 1920 годзе ён друкуе раман "Золата", у 1921 годзе "Успаміны". З 1914 года жыве ў Мінску.

Творчасць Ядвігіна Ш. аказала ўплыў на многіх беларускіх пісьменнікаў. Янка Купала ўспамінае: "У перыяд 1904–1906 гг. ... я пазнаёміўся з Ядвігіным Ш. Гэта была для мяне вялікая падзея, бо я ўпершыню сутыкнуўся з чалавекам, які не толькі пісьменнік, якога друкуюць, але і піша па-беларуску".

Ядвігін Ш. выступіў у літаратуры ў той час, калі беларуская мастацкая проза рабіла свае першыя крокі. Пісьменнік-рэаліст, ён у сваіх творах праўдзіва адлюстраваў пэўны перыяд гістарычнага жыцця беларускага народа, узбагаціў беларускую прозу новымі жанрамі, унёс стылёвую разнастайнасць у розныя віды апавядання, быў адным з пачынальнікаў буйнога эпічнага палатна і мастацкай публіцыстыкі.

Вельмі цікава сённяшнім беларусам любога ўзросту прачытаць творы Ядвігіна Ш. праз сто гадоў пасля іх напісання. Гэта дапаможа ўбачыць як на яве жыццё беларусаў пачатку XX стагоддзя. Мінула сто гадоў – і як змянілася наша жыццё, колькі мы зрабілі, здзейснілі! Але, на жаль, засталіся нявырашанымі многія пытанні, якія хвалявалі беларусаў у той час, і перш за ўсё – гэта пытанні беларускай ментальнасці і беларускай мовы.

### *Іван ЛЯВІЦКІ*



*Лявіцкі Іван Адамавіч – заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, доктар тэхнічных навук, прафесар. Працуе ў БДТУ з 1990 года, доўгі час з'яўляўся загадчыкам кафедры тэхналогіі шкла і керамікі. Падрыхтаваў 11 кандыдатаў навук. Апублікаваў больш за 390 навуковых прац, больш за 110 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў, 28 сведчанняў на прамысловыя ўзоры.*

*Родны пляменнік Ядвігіна Ш. – Лявіцкага Антона Іванавіча.*

### *Успаміны*

Гэта ўспаміны – аповеды маіх бацькоў.

Дзядька Антось найчасцей наведваў нашу сям'ю – тады зусім маладых маіх бацькоў, якія жылі ў доме дзеда. Гэта быў час працы Антона Лявіцкага ў Вільні.

Да нашай вёсачкі, што знаходзілася на адлегласці каля 80 кілометраў ад Вільні, ён наведваўся часта. Як казалі бацькі, родныя сустракаліся вельмі часта, святы не абыходзіліся без шматлікіх гасцей. Да трэцяга калена мелі вельмі цесныя зносіны, і ў радасці і ў горы дапамагалі як маглі адно аднаму.

Дык вось, мой тата заўсёды пад'язжаў да станцыі, каб сустрэць госця. Іншы раз ехалі доўга, дзядзя захапляўся краявідамі, лясамі і асабліва раслінамі, "кветкамі-краскамі", як ён называў іх. Вельмі любіў вясну з першацветамі – пралескамі, калужніцай і ветраніцай. Багатварыў сон-траву, незабудкі і валошкі – васількі. Пасля ён напіша: "У красе нашага жыцця мы любім, як красуюць васількі. А калі паблекнуць васількі – паблекне неба, паблекне на душы, а на сэрца ляжа холад..." (Ядвігін Ш. "Васількі").

Летам дзядзя Антось заахвочваў усіх і сам збіраў лекавыя травы, тлумачыў іх прызначэнне. Асабліва любіў пахучыя расліны. З яго прыездам хата бацькоў напаўнялася пахамі, спалучэнне якіх рабіла незвычайнае ўздзеянне і на госця і на ўсіх дамачадцаў: панаваў супакой і быў вельмі добрым сон. Рыхтавалі адвары і гарбату, вельмі доўга сядзелі за ўрачыстым сталом і спявалі, спявалі, іншы раз да ранку. Спевы былі розныя: найчасцей народныя, працяжныя беларускія, польскія, рускія песні... Перад застоллем была малітва. Дзядзя шмат адпавядаў, расказваў вельмі

трапна байкі, неверагодныя гісторыі, здарэнні. Мой тата вельмі шмат памятаў гэтых аповедаў, вельмі добра нагадваў іх.

З сабою з Вільні дзядзя прывозіў шмат насення, асабліва кветак. Каля дому заўжды былі квітнеючыя клумбы, якія захаплялі неверагоднай прыгажосцю, але патрабавалі нямала працы. Мы з дзяцінства ўдзельнічалі ў стварэнні гэтай прыгажосці.

А яшчэ дзядзя Антось прывёз і пасадзіў каля дома маіх бацькоў сад. Гэта быў "Антосеў сад" – так яго называлі ў сям'і. 5 яблынь і адну грушу. Але што гэта былі за цудоўныя дрэвы! Я памятаю іх, гэта былі сапраўдныя гіганты і прыносілі неверагодныя ўраджаі. Усё гарышча ў доме засыпалася яблыкамі. У доме стаяў незвычайны водар спелай садавіны. Чамусьці цяпер яблыкі зусім не пахнуць, што сталася?

Дзядзя вучыў маіх родных, як трэба даглядаць сад. Казалі, што сам любіў абразаць лішнія сукі, бяліў ствалы, збіраў садавіну… Прывіў майму бацьку і яго брату – майму дзядзю, які жыў з маімі бацькамі, любоў да садаводства. Пазней яны пасадзілі яшчэ 20 яблынь. Уяўляеце, што гэта быў за сад! Кіпень квітнеючых вясною дрэў на фоне ўзаранай чорнай зямлі – чым не рай! "Блішчаць садочкі" – вось менавіта пра гэта (Ядвігін Ш. "Лісты з дарогі").

Няма зараз Антосевага саду і саду майго бацькі. Пасля смерці бацькоў адзін вельмі "дбайны гаспадар" – кіраўнік калгаса загадаў бульдозерамі зруйнаваць сад, хату і ўсё іншае, што было на месцы майго радавога гнязда. Зараз там расце хмызняк, лаза і малiннік – памятка пустэчы сэрцаў. Але ж дзе-нідзе каля дарогі бачны кветкі рознакаляровага маку і незабудак… Гэта адтуль, з мінулага. Не ўсё знішчыш.

Мінула паўтара стагоддзя, як нарадзіўся дзядзька Антон. Толькі цяпер разумею, чаму іншы раз мае бацькі, а асабліва родныя, нагадвалі пра дзядзю Антося як дзівака, чалавека, непадобнага да людзей яго свету.

Сапраўды дзівак – вельмі таленавіты вясковы хлапчук, які становіцца студэнтам-медыкам Маскоўскага ўніверсітэта. За студэнцкія хваляванні трапляе ў Бутырскі астрог-турму для палітычных вязняў. Менавіта тут усведамляе сябе беларусам і становіцца носьбітам беларушчыны. Пасля адлічэння з універсітэта за ўдзел у хваляваннях прыязджае на Беларусь у Карпілаўку, што каля Радашковічаў…

Складае байкі, апавяданні, лечыць у наваколлі бедны люд, сябруе з яўрэямі, выступае супраць варажбы, гадання, невуцтва. Піша на "мужыцкай мове", вельмі добра валодаючы шляхетнай польскай і распаўсюджанай расейскай. А пасля пакідае сельскі побыт і пераязджае ў Вільню, каб пісаць. І што пісаць? Сялянскія байкі ды аповесці пра гэты ж бедны люд. Гэта супярэчыла агульнаму жыццёваму ладу амаль усіх родных і блізкіх. Яго асуджалі…

Родныя адзначалі, што дзякуючы жонцы пісьменніка, цёці Люцыі, дзядзя зайсёды быў "франтам". Апрануты па апошняй модзе, акуратны, статны, з палаючым позіркам, які заўсёды ўсё бачыць і ўсё заўважае. Востры на слова, агульна любімы і паважаны простым людам за "пранікненне ўглыб сялянскай псіхалогіі" (Ядвігін Ш. "Золата"), але ж таму вельмі дзіўны.

Апошнія гады жыцця А.І. Лявіцкі шмат хварэе. У гэты час мой тата наведвае яго ў Вільні, ідзе туды пешшу, як гэта калісьці рабіў яго стрыечны брат – Ядвігін Ш., які ішоў па Ашмянскім тракце "каб пацягацца па родным краі, знаёмых адведаць, незнаёмых спазнаць" (Ядвігін Ш. "Лісты з дарогі"). Дзядзьку Антося напаткала ў гэты час яшчэ адна страта – згарае яго дом ў Карпілаўцы, каля Радашковічаў са скончанымі і нясконачанымі творамі.

24 лютага 1922 года ў шпіталі ў Вільні дзядзя адыходзіць у вечнасць. У касцёле святой Ганны і бернардынцаў маліліся аб яго вечным супакоі родныя і блізкія.

Пахаваны пісьменнік на могілках Роса ў Вільні. Яго магілу даглядаюць шматлікія незнаёмыя нам віленскія беларусы і мая пляменніца Ірэна Іванаўна Лук'яненка (у дзявоцтве Валуевіч), якая там жыве.

І яшчэ пра псеўданім. Тут больш успаміны маёй сястры Ядвігі. Ёй зараз 89-ы год. Яна памятае, што ў сям'і вялі аб гэтым размову. І па іх думцы, псеўданім звязаны менавіта з адной з унучак В. Дудзіна-Марцінкевіча, якую звалі Ядвігай. Дзяўчына была сакавітай, мажнай… А Антось закахаўся ў яе, быў шчупленькім і значна маладзейшым, адным словам – "Ядзвігін шкет". Гэта і з гумарам і сакавіта і … праўдзіва. Але ж крыху абразліва. Таму можа і Ядвігін Ш.? А пасля спадабалася, бо сапраўды неяк па-нашаму – самакрытычна (гэта наша – сямейнае). І мне асабіста падабаецца таксама.

На жаль, ніхто не можа ўдакладніць сапраўднасць гэтага меркавання. Мае страечныя браты – сыны А. І. Лявіцкага былі раскулачаныя і расстраляныя. Спробы адшукаць родных у Радашковічах таксама не далі плёну...

Вось амаль і ўсё. На заканчэнне хачу ад імя маіх шматлікіх родных падзякаваць усім добрым людзям, якія спрычыніліся да жыцця і творчасці Антона Лявіцкага – Ядвігіна Ш.

*Іван Адамавіч Лявіцкі 28 сакавіка 2019 года*

## *Вікторыя ФІЛІПОВІЧ*



*Філіповіч Вікторыя Сяргееўна нарадзілася 6 лютага 2000 года ў горадзе над Дняпром (Магілёве). Скончыла ліцэй ў 2017 годзе і ў тым жа годзе паступіла ў БДТУ. Зараз з'яўляецца студэнткай першага курса факультэта інфармацыйных тэхналогій. Акрамя гэтага з'яўляецца членам літаратурнага клуба "Ветліца" БГТУ, выступала на канферэнцыях, удзельнічала ў конкурсах, канцэртах і акцыях «Чытаем разам!»*

### *Радзіма – ты назаўсёды ў сэрцы маім*

*Эсэ*

*Яшчэ прамовіць: "Зразумей,*
*"Глаголом жечь сердца людей"*
*Слабо цяперашнім…"*
*Валерый Пазняк*

Я павінна не згадзіцца з гэтымі радкамі Валерыя Пазняка. Вершы з яго зборніка "Родны бераг", які выдадзены ў 2017 годзе ў выдавецтве "МІНКОПРЫНТ", закранулі нешта трапяткое ў маёй душы, прымусілі ўспомніць штосьці дарагое для майго сэрца.

Аўтар у сваіх творах закранае вельмі важныя і, мабыць, падчас балючыя для нас тэмы роднага краю, роднай мовы, нашых бацькоў і продкаў, сардэчных успамінаў.

У час чытання вершаў з частак "Адзін ён родны!" і "Штосьці адбудзецца добрае, светлае" міжволі ўяўляеш усе карціны, што малюе аўтар, а таксама пераносішся да тых мясцін, дзе праходзіла маё дзяцінства і юнацтва, да тых мясцін, з якімі звязаны лепшыя ўспаміны ў жыцці: першае каханне, сапраў-

днае сяброўства, радасць перамогі. І адразу хочацца вярнуцца назад , адчуць усё гэта яшчэ раз, падзякаваць жыццю і людзям за ўсе яскравыя моманты.

Аўтар дзеліцца не толькі асалодай успамінаў, але і іх горыччу. Дзеліцца з намі перажываннямі пра сваю працу і вайсковую службу савецкіх воінаў у замежных краінах, пра продкаў, і нашу адмоўленасць ад роднай мовы і каранёў, непапулярнасць паэтычнай творчасці. Вершы на гэтыя тэмы змешчаны ў раздзелах “На краі бяздоння”, “Не пераплыць раку журбы” і “Пачуюць гэты голас” Частка вершаў вельмі добра перадае сучаснасць. Аб гэтым цяжка гаварыць, але яшчэ цяжэй маўчаць, таму некаторыя радкі ўразаюцца ў памяць ледзь не навечна:

*Можна думкай ахапіць паўсвету,*
*Жыць высокай мэтаю адной –*
*І не ведаць, як завуць суседа,*
*І не чуць, як хтось рыдае за сцяной.*

Але ўсё ж такі галоўнай тэмай вершаў з’яўляецца Радзіма. Далёкая і блізкая, малая і вялікая, яна заўсёды павінна быць у нашым сэрцы. Яе вобраз праходзіць праз усе вершы Валерыя Пазняка, як адна з самых вялікіх каштоўнасцей, як тое, чым мы павінны ганарыцца і што павінны берагаць. Таму і збонік мае назву “Родны бераг”. І верш Айчына, з якога пачынаецца кніга паэта, мае вельмі цудоўныя радкі, якія раскрываюць адну з прычын з’яўлення гэтага зборніка:

*Я не люблю высокіх слоў,*
*Але сказаць павінен,*
*Каб выказаць сваю любоў*
*К сваёй Айчыне.*

І не менш цудоўныя радкі, якія перадаюць усю глыбіню аўтарскіх пачуццяў да радзімы:

*Я добра ведаю здаўна:*
*Вялікі свет, сусвет бясконцы –*
*Яна адна, яна адна –*
*Як маці, як жыццё, як сонца.*

Пасля такіх слоў нельга застацца абыякавым, трэба ўзяць зборнік, прачытаць яго і знайсці тыя радкі, што захопяць менавіта вас.

УДК 82-2(476)

*Студ. Філіповіч В. С.*
*Навук. кір. ст. выкл. Савіцкая Н. Я.*
*(кафедра беларускай філалогіі, БДТУ)*

## *Сучасная беларуская драматургія – брэнд постсавецкай прасторы*

Сучасная беларуская драматургія даўно стала брэндам постсавецкай прасторы. Без нашых імёнаў сёння не абыходзіцца, бадай, ніводны шортліст флагманскіх фестываляў ды конкурсаў. [1]

Аднак у самой Беларусі сітуацыя іншая. Сучасны беларускі тэатр сутыкнуўся з шэрагам цяжкасцей такіх, як невысокая аплата працы і адсутнасць добрага фінансавання, неадпаведнасць памяшканняў і рэквізіта тэатраў сучасным патрабаванням, адсутнасць цікавасці гледачоў да чагонебудзь новага, страх аўтараў і кіраўнікоў тэатраў, што іх п'есы не ацэняць,

застой і традыцыйнасць беларускага тэатра, няўвага да “сваіх” маладых і не толькі маладых талентаў.

На кожную з гэтых праблем можна дыскутаваць вельмі доўга, прыводзіць шмат прыкладаў, але ватра закрануць найбольш важную, на мой погляд, праблему – праблему чалавечага фактару.

Перш за ўсё да чалавечага фактару адносіцца няўвага да ўласнай драматургіі і непавага да яе як ад гледачоў, так і ад работнікаў культуры. П'есы Андрэя Курэйчыка, Паўла Пражко, Андрэя Іванова, Дзмітрыя Багаслаўскага, Мікалая Халезіна і іншых іх таленавітых калег (нашых сучаснікаў) ставяць у лепшых тэатрах Расіі, Еўропы і Амерыкі. Яны вядомыя і паспяховыя. Іх п’есы ставяць, чытаюць і любяць.Але для нас кожны зварот да іх творчасці – гэта рэдкая падзея.

Адна з прычын гэтага: нежаданне пускаць на сцэну свайго тэатра канкурэнтаў.

Рэпертуар большасці дзяржкалектываў звычайна складаецца са спектакляў мастацкага кіраўніка і – у лепшым выпадку – другога рэжысёра. Усе астатнія сваёй чаргі чакаюць гадамі. Напрыклад, у верасні 2015 года рэжысёр Яўген Карняг паставіў у сталічным Тэатры лялек суперкасавы спектакль «Інтэрв'ю з ведзьмамі». Наступная пастаноўка Карнягі ў дзяржтэатры – «Бетон» у РТБД адбылася аж праз два гады.

Другая прычына – несупадзенне эстэтычных поглядаў рэжысёра і мастацкага кіраўніка.

Напрыклад, на спектакль «Войцэк», пастаўлены Юрыем Дзіваковым ў Купалаўскім тэатры, гледачы ішлі ахвотна. Але вынік расчараваў мастацкага кіраўніка тэатра, і спектакль быў зняты з рэпертуару. Усе спробы выратаваць яго і перанесці на іншыя пляцоўкі поспеху не мелі. Зразумела, кіраўнік меў на гэта поўнае права. Але, мабыць, не зусім правільна ператвараць нацыянальны тэатр у пляцоўку, дзе ёсць месца для спектакляў, пастаўленых толькі ў адной традыцыі. [2]

Пасля усяго раней адзначанага можа здацца, што беларускі тэатр знаходзіца ў вельмі дрэнным становішчы, але гэта не зусім так. Сапраўды, тэатру патрэбны рэформы, тэатру патрэбны свежыя погляды і новыя гледачы.

Але тэатр жыве, тэатр развіваецца, ідзе наперад, хай і маленькімі крокамі, тэатр прыкоўвае да сябе погляды.

У сучаснай Беларусі існуюць шмат цікавых міжнародных і рэспубліканскіх тэатральных фестываляў і форумаў такіх як: “М.@ртКонтакт”, “ТЕАРТ”, “WightBox”, “Белая Вежа”.

Яны карыстаюцца папулярнасцю як у тэатральных крытыкаў, так і ў звычайных гледачоў. Імі зацікаўлена моладзь. Апошні фестываль “М.@рт-Контакт” ярка асвячаўся і абмяркоўваўся ў інтэрнеце. Было маладёжнае журы, якое выбірала свой лепшы спектакль.

Усё гэта дае надзею, што ў беларускага тэатра ёсць будучыня. Але яму патрэбна наша дапамога: гледачы павінны быць зацікаўлены тым новым, што прапануе тэатр, рэжысёры і акцёры павінны не баяцца спрабаваць, развівацца і адкрываць новыя гарызонты. І тады беларускі тэатр зможа пакарыць увесь свет.

## *Літаратура*

1. Мальчэўская, Алена. Беларуская драматургія: Шклянка напалову поўная / Алена Мальчэўская // Газ. “Звязда”, 3 чэрвеня 2017.

2. Марціновіч, Дзяніс / Мала грошай, занадта шмат смеху і ігнараванне сваіх зорак. Што не так у беларускім тэатры [Электронны рэсурс] / Дзяніс Марціновіч – TUT.BY. – 27 сакавіка 2018 у 12: 25. Рэжым доступу: https://news.tut.by/culture/586502.html

# *ХРОНІКА (2015 – 2019)*

## *КОНКУРСЫ*
## *Удзел у міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах*

### *Рэспубліканскі конкурс літаратурнай творчасці "Аўтограф-2018"*

У рэспубліканскім конкурсе літаратурнай творчасці "Аўтогфар-2018" прынялі ўдзел 6 студэнтаў клуба і кіраўнік. Вынікі конкурсу – 9 дыпломаў.

З іх тры Дыпломы I ступені ў намінацыях:

«Паэзія» і «Публіцыстыка» — Савіцкая Надзея Яўсееўна, кіраўнік клуба.

«Проза» — Скок Інэса (4 курс, ПіМ).

Дыплом II ступені ў намінацыі «Паэзія» — Скок Інэса (4 курс, ПіМ).

Дыпломы II ступені ў намінацыі «Публіцыстыка»:

Міцкевіч Арцемій (2 курс, ТАР), Сымонка Марыя (2 курс,ТАР).

Дыпломы III ступені ў намінацыях

«Паэзія» — Данілевіч Вольга (3 курс, ТАР);

«Проза» — Данілевіч Вольга (3 курс, ТАР);

«Публіцыстыка» — Уласенка Дзмітрый (2 курс, ПіМ).

### *Мы – адны з лепшых у рэспубліцы*

20 – 21 лютага 2019 года ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна па выніках рэспубліканскага конкурсу літаратурнай творчасці студэнтаў вну "Аўтограф" адбылося заключнае мерапрыемства пад агульнай назвай "Выхаваўчыя магчымасці літаратурнай творчасці для рэалізацыі творчага патэнцыялу студэнтаў".

Мэта Рэспуліканскага метадычнага мерапрыемства і творчай сустрэчы – папулярызацыя літаратурна-мастацкай творчасці, накіраванай на рэалізацыю выхаваўчых задач і фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў студэнцкай моладзі, вывучэнне і абагульненне прадуктыўных практык і ўкараненне інавацыйных падыходаў у арганізацыю літаратурна-мастацкай торчасці студэнтаў, павышэнне прафесійнага ўзроўню кіраўнікоў калектываў.

Кіраўнік літаратурнага клуба "Ветліца" Савіцкая Н. Я. выступіла на метадычнай пляцоўцы "Палітра педагагічнага і творчага вопыту" з дакладам "Формы і метады працы ў літаратурным клубе БДТУ "Ветліца" (з вопыту 22-гадовай працы) і адказала на шматлікія пытанні.



*Урачыстае адкрыццё мерапрыемства*

На гэтым форуме была паказана дзейнасць 7 літаратурных клубаў Беларусі. Былі прадстаўлены Брэст, Віцебск, Гродна, Горкі, Магілёў, Мінск – БДТУ і БНТУ.

На творчым паказе “Літ-чытка” шыкоўна выступілі нашы студэнты: Уласенка Дзмітрый (2ПіМ-2), Чубараў Арсеній (2ХтіТ-6), Міцкевіч Арцемій (2ТАР-3), – якія ў форме стэндапа прэзентавалі свае творы ў вялікай актавай зале.



*Усім удзельнікам заключнага мерапрыемства “Аўтограф-18” былі ўручаны сертыфікаты*

## *Рэспубліканскі конкурс навукова-даследчых і творчых работ “Памяць роду: мінулае вачыма сучаснікаў”*

На конкурс пададзены творчая праца Значонак Д. А. (4ФПіМ-4) і літаратурна-мастацкі альманах “AVE – 6” (26.09.2016).

Атрымалі ўзнагароды: (Значонак Д. А. – Дыплом Ш ступені і каштоўны падарунак; Савіцкая Н. Я. – Грамату і каштоўны падарунак. (7.12.2010, Музей Вялікай Айчыннай вайны). Адзін экземпляр літаратурна-мастацкага альманаха “AVE – 6 ” музей папрасіў для экспазіцыі .

## *Рэспубліканскі конкурс маладых літаратараў “Першацвет”*

Пададзены творы Значонак Дар’я – апавяданне “Леся”, Скок Інэса – верш “Ангелы” (15.12.2016).



*Урачыстае ўручэнне Дыплома пераможцы Рэспубліканскага конкурсу маладых літаратараў “Першацвет” на ХХ1У Мінскай міжнароднай выставе на БелЭкспа. Дыплом атрымала Значонак Дар’я (8.02.2017)*

У рэспубліканскім зборніку “Першацвет” надрукавана апавяданне “Леся” (Значонак Д. А., люты, 2017 ).

*У Рэспубліканскім конкурсе аратарскага майстэрства “Златоуст”* (Ваенная Акадэмія) прымалі ўдзел Кузьмічова Настасся (Дыплом за эмацыйнасць выступлення, 2016), Папеня Наталля (2017), Тарасенка Дзіяна (2018).

*За ўдзел у Рэспубліканскім літаратурным конкурсе БрамаМар* Значонак Дар’я атрымала Дыплом фіналіста ў намінацыі “Проза”. (2017)

*I Міжнародны і IV Рэспубліканскі конкурс чытальнікаў вершаў “Диалог языков и культур”* – секцыя “Стихи как музыка души” (старшыня журы Савіцкая Н. Я.) (На базе Медуніверсітэта). Бралі ўдзел 15 беларускіх і 3 замежныя студэнты, атрымалі: **Дыплом 2** ступені Уласенка Дзмітрый, **дзве Граматы**: Данілевіч Вольга – за лепшы аўтарскі верш і Тарасенка Дзіяна – за эмацыйнасць выступлення. (20 – 21.11.2017)



*Правядзенне конкурсаў вершаў у БДТУ*

**Літаратурна-мастацкі конкурс уласных твораў студэнтаў.**

Бралі ўдзел 24 канкурсанты. (16 .05.2018)

**Каласавіны. Конкурс чытальнікаў вершаў Якуба Коласа**, аўтарскіх перакладаў і ўласных вершаў, разам з замежнікамі. Бралі ўдзел 19 студэнтаў. (3.11. 2017)








## *ФЕСТЫВАЛІ*

1. Мерапрыемствы, праведзеныя ў рамках рэспубліканскага фестываля творчасці замежных студэнтаў "F.-ART.by" "Моладзь свету: самабытнасць, салідарнасць, супрацоўніцтва":

Адкрыццё фестываля ў Нацыянальнай бібліятэцы:

**– удзел з экспазіцыяй "Ветліцы", чытаннем вершаў і прэзентацыяй бангладэшскай кухні ў Нацыянальнай бібліятэцы; атрыманы *рэспубліканскія* узнагароды: *калектыўны Дыплом, Вымпел, два Дыпломы* – Савіцкая Н. Я. і замежныя студэнты і *5 Грамат БДТУ* студэнтам; *2*2.11.17.**

**Працяг фестываля ў БДТУ, 7.12.2017:**
– выстава творчасці замежных студэнтаў і літаратурнага клуба “Ветліца”;
– майстар-клас па каліграфіі (графікі народаў свету);
– інтэрнацыянальная вечарына “Мой родны кут, як ты мне мілы…”;




*Заключнае мерапрыемства фестываля “F.-ART.by”*
*(Мастацкі музей, 19.12.2017)*

На цырымоніі ўзнагароджання атрымалі вымпел і 2 Граматы.

**1. Свята Вясны ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце**. (замежныя навучэнцы – чытальнікі і спевакі). Сакавік 2018.

**2. Выступленне ў заключных канцэртах фестываля “Студэнцкая вясна-2016, 2017, 2018”** членаў клуба: Кузьмічовай Анастасіі з уласным вершам і нігерыйскага студэнта Акпе Джошуа з уласнай песняй; бангладэшскіх студэнтаў з песняй “Купалінка”, чытаннем вершаў.

## *ВЫСТАВЫ*

Дэманстрацыя экспанатаў літаратурнага клуба “Ветліца” і ансамбля “Акавіта” на выязным семінары-практыкуме Мінгарвыканкама “Шляхі павышэння ролі органаў дзяржаўнага кіравання ў вырашэнні пытанняў жыццядзейнасці сталіцы”. (26.02.2016, Мінгарвыканкам, 23 экспанаты)



Удзел у выставе на VI Рэспубліканскім фестывалі замежных навучэнцаў "Дни русского языка и белорусской культуры" з экспанатам "Слова і музыку голас яднае". (18.05.2016, Ліцэй БДУ)

Удзел у ХУІІ Рэспубліканскай выставе навукова-метадычнай літаратуры, педагагічнага вопыту і творчасці навучэнцаў "Правільны прафесійны выбар – упэўненае будучае маладога пакалення". Прадстаўлены 7 экспанатаў (27.04 – 29.04.17).

Удзел у адкрыцці рэспубліканскага фестываля творчасці замежных студэнтаў "F.-ART.by" "Моладзь свету: самабытнасць, салідарнасць, супрацоўніцтва" ў Нацыянальнай бібліятэцы. Прадстаўлены стэнд клуба, прысвечаны 20-годдзю творчай дзейнасці. 22.11.17.

Удзел у выставе ў рамках Фестываля моладзевай вузаўскай навукі "Молодёжь в науке и производстве". Пададзены матэрыялы літаратурнага клуба, 1 стэнд (20 – 21.10.2016).

Удзел экспанатаў клуба у выставах БДТУ (16.06.17) і прымеркаванай да дня адчыненых дзвярэй (19.03.17) і інш.

## *НАВУКОВЫЯ ПРАЦЫ (ДАКЛАДЫ НА КАНФЕРЭНЦЫЯХ, ПУБЛІКАЦЫІ АРТЫКУЛАЎ І ТЭЗІСАЎ ДАКЛАДАЎ У ЗБОРНІКАХ КАНФЕРЭНЦЫЙ)*

Члены клуба прынялі ўдзел у Міжнароднай, пяці Рэспубліканскіх і пяці канферэнцыях БДТУ. З дакладамі выступілі 27 студэнтаў. Разам выступілі: міжнародныя – 1; рэспубліканскія – 5; БДТУ – 21 з дакладамі, на 6 канферэнцыях выступілі 12 студэнтаў з вершамі і песнямі.

Публікацыі ў зборніках артыкулаў: міжнародныя – 1; рэспубліканскія – 5; БДТУ – 5.

1. Міжнародная студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя (Медуніверсітэт). Выступіла Тарасенка Дзіяна. Атрымала Дыплом. Публікацыя ў зборніку. 21.11.2017.

2. XIX Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя (Медуніверсітэт). Выступіла Савіцкая Н. Я. Публікацыя ў зборніку. 21.11.2017.

З дакладамі на Рэспубліканскай студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі ў Ваеннай акадэміі выступілі члены клуба Губанава Наталля і Значонак Дар'я. Публікацыі ў зборніку.(18.03.2016)

Удзел у Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі ў Ваеннай Акадэміі. З дакладам "Возрождение слуцкого пояса" выступіла Папеня Наталля, Савіцкая Н. Я. – удзел у складзе журы. Публікацыя. (21.03.2017).

### *Студэнцкія навукова-практычныя канферэнцыі БДТУ*

***"О мой нязводны род, ён моцны духам".*** Выступленне аб дзейнасці клуба і выданні альманаха. Уручэнне альманахаў у якасці прызоў лепшым выступоўцам. (19.094.2016, аўд. 335 -4);

***"Праз горы страт да Перамогі".*** Выступленне пра дзейнасць клуба і выданне альманаха. Прэзентацыя творчасці членаў клуба Значонак Дар'і, Кузьмічовай Анастасіі, Вако Жуніёра. (22.04.2014, аўд. 334);

***"Русский язык в системе языкового и культурного разнообразия"*** Даклад Кузьмічовай А. "Субкультура в современном мире". (23.04.2016);

***"Русский язык в поликультурном мире"*** з замежнымі навучэнцамі. Выступілі з дакладамі 6 студэнтаў, 1 з вершам, 1 з песняй. (27.04.2016);

***"Няхай гучаць у кожным слове і нашы продкі, і вякі".*** З дакладамі выступілі студэнты 1 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій,

9-й групы: Папеня Наталля "Загадкі слуцкага пояса"; Шчуплянкоў Ільля "Якуб Колас – вялікі пясняр беларускага народа"; Стэндавыя даклады падрыхтавалі: Крупенька Аляксандра "Спецыфічныя рысы беларускай міфалогіі"; Марчанка Аляксандра "Каранаваныя і некаранаваныя прадстаўніцы сям'і Радзівілаў"; Грышаева Яўгенія "Беларусь і космас" Папеня Наталля "Роль фронтовых писем для солдат". Надрукаваны два артыкулы Папені Наталлі. (19.04.2017) і інш.;



*На чатырох канферэнцыях БДТУ у лютым – красавіку 2018 года выступілі 12 членаў клуба*



## *КАНЦЭРТНА-ПРАФАРЫЕНТАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ*

Сумеснае выступленне ансамбля "Акавіта" і літаратурнага клуба "Ветліца" з канцэртнай праграмай і прафарыентацыяй:

– у Лошыцкім парку (у гонар 65-годдзя Ленінскага раёна г.Мінска, 16.04.2016, Лошыцкі парк);

– на навукова-метадычным семінары для настаўнікаў (27.09.2016, канферэнц-зала БДТУ). Ад клуба выступалі Значонак Дар'я і Савіцкая Н. Я.;

– на навукова-метадычным семінары для настаўнікаў (30.09.2016, канферэнц-зала БДТУ). Ад клуба выступілі Губанава Наталля і Савіцкая Н. Я.;

– у бібліятэцы № 7 г. Мінска (22.11.2018). Ад клуба выступілі Наскавец М. Т. і Савіцкая Н. Я.;

– у бібліятэцы № 12 г.Мінска (15.12.2018). Ад клуба выступілі Наскавец М. Т. і Савіцкая Н. Я.;

***Прэзентацыя творчай асобы.*** Выступленне Кузьмічовай Анастаіі (4 ВСіП-4) з уласнымі вершамі ў групе замежных навучэнцаў. (12.04.2016, аўд. 427-4)

## *МІЖНАРОДНЫЯ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІЯ СУВЯЗІ*

### *Беларусь - Кітай*
### *Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт – Цяньцзіньскі ўніверсітэт замежных моў*

Актыўны міжкультурны дыялог паміж Беларуссю і Кітаем адбываецца не толькі ў сферы эканомікі і прамысловасці, але і ў сферы адукацыі, культуры і мастацтва. Узаемнае імкненне народаў глыбей даведацца пра сучасную культуру і літаратуру нараджае новыя творчыя і навуковыя кантакты, аб'ядноўвае выкладчыкаў і студэнтаў з розных універсітэтаў, далучаючы нас да сусветнай мастацка-літаратурнай скарбонкі.

У 2017 годзе ў Цяньцзіньскім універсітэце замежных моў (Кітайская Народная Рэспубліка) упершыню ў Кітаі адбыўся набор студэнтаў на спецыяльнасць бакалаўрыяту "беларуская мова". Адкрыты Цэнтр вывучэння беларускай культуры імя Я. Коласа і кафедра беларускай мовы. Выкладчыкі і выпускнікі ўніверсітэта ўжо працуюць у накірунку міжкультурнага абмену.

Зімой 2018 годы была зроблена прапанова кіраўніка клуба наладзіць супрацоўніцтва паміж літаратурным клубам БДТУ "Ветліца" і кафедрай замежных моў Цяньцзінскага ўніверсітэта, якая адразу была прынята. Сышліся на тым, што выкладчыкамі кафедры будуць зроблены пераклады некалькіх апавяданняў вядомых кітайскіх пісьменнікаў. І ўжо вясной матэрыялы былі пададзены да друку ў альманах. Мы выражаем падзяку Шахаб Вользе Васільеўне за падтрымку ідэі і пасрэдніцтва паміж клубам і кафедрай.

### *Беларусь – Польшча*

Па просьбе прарэктара Універсітэта Марыі Складоўскай-Кюры ў Любліне Аліны Арлоўскай ёй былі прэзентаваны 9 кніг "AVE" (выпускі 1–8), буклеты "Літаратурны клуб "Ветліца" і "Акавіта". Яна планавала выкарыстоўваць матэрыялы альманахаў у працы са студэнтамі падчас заняткаў і ў пазааўдыторны час.

З замежнымі студэнтамі БДТУ ажыццяўляюцца пераклады з нацыянальных моў на рускую мову, з беларускай мовы на нацыянальныя; публікацыі ў альманаху; удзел у вечарынах, канцэртах, АРТ-вакацыях, акцыях "Чытаем разам!" і інш.

### *Міжуніверсітэцкія сувязі (БДЭУ – БДТУ)*

Літаратурныя сустрэчы. Удзел у сумесным выступленні літаратурнага клуба "Ветліца" з творчай групай студэнтаў пад кіраўніцтвам дац. кафедры міжнароднай эканомкі паэта Гаравенка Аксаны Валянцінаўны па тэме "Лаўрэаты Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры". Выступленне з паведамленнямі пра Нобелеўскіх лаўрэатаў, прэзентацыя дзейнасці літаратурнага клуба, уручэнне альманахаў "AVE – 6,7,8" бібліятэцы. Выступілі Значонак Дар'я, Савіцкая Н. Я. (22.04.2016, бібліятэка БДЭУ, прысутнічалі 3 члены клуба).

## *Літаратурная гасцёўня*

Сустрэча з галоўным дырэктарам замежнага вяшчання беларускага радыё, паэтам Навумам Гальпяровічам. (31.05.2016)

Сустрэча з паэтам Фёдарам Баравым і скульптарам Паўлам Міско ў музеі-студыі паэта. (29.08.2016).

Удзел у прафесійна-арыентаванай сустрэчы з галоўным рэдактарам выдавецтва "Тэхналогія" Зміцерам Санько (1ФІТ-9, аўд. 103-4, 2017).

Літаратурная гасцёўня. Удел у сутрэчы з паэтам Аксанай Спрынчан. Выступленне аб дзейнасці клуба (24.03.2018).



*Сустрэча з Валерыяй Куставай*

На працягу 2018 года адбыліся сустрэчы з беларускімі паэтамі Міхасём Башлаковым, Валерыем Пазняком, Любоўю Чаркасавай і Аксанай Гаравенка.

У снежні 2018 года "Гасцёўня" прымала замежных навучэнцаў, віншавала з Новым Годам і Калядамі.

***Удзел у вечарынах-прэзентацыях:***

– 3-га зборніка паэзіі Аксаны Гаравенка "Шанс"(Гасцініца "Еўропа", 17.12.2015);

– зборніка паэзіі Сяргея Маціна "Мары хмар" (пасмяротна) (Музей Петруся Броўкі, 10.12.2015);

– 4-га зборніка паэзіі Аксаны Гаравенка (25.10.2016, гасцініца "Кроўн Плаза");

– 6-га зборніка паэзіі "Про свет" Аксаны Гаравенка. Дар'я. (18.12.2018, "Кніжны салон", вул.Тураўская, 20).

## *Акцыі: "Чытаем разам!"*

Першая акцыя была праведзена 9.12.2015 года.

Акцыі: "Чытаем разам!"

1."Мудрэць і харашэць душою". Да дня нараджэння Максіма Багдановіча. 9 снежня 2016.

2."Чытаем Купалу на розных мовах свету". Да 135-годдзя Янкі Купалы. 17 мая 2017 г.







3. "Мой родны кут, як ты мне мілы…" Да 135-годдзя Якуба Коласа.
3 лістапада 2017 г.









4. “Я кніжку маю…”. Да дня нараджэння Максіма Багдановіча.
8 снежня 2017 г.

5. “Святыні нашы: Айчына, Мова”. (Да Міжнароднага дня роднай мовы).
21 лютага 2018 г.







6. “Непрыручаная птушка Палеся”. Да 70-годдзя з дня нараджэння Яўгеніі Янішчыц. 20 лістапада 2018 г.





7. Нязгасная зорка беларускай зямлі”. Да дня нараджэння Максіма Багдановіча. 7 снежня 2018 г.









8. “Вялікі пясняр Беларусі”. Да 220-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча. 20 снежня 2018 г.





### *Алімпіяда па беларускай мове*

Праведена алімпіяда па беларускай мове, прысвечаная М. Багдановічу. Дэвіз: “Думкі з розуму ліюцца, Пачуццё з душы бяжыць”. Пераможцы: студэнты 1ФІТ-9 Грузд Вадзім, Папеня Наталля, Марчанка Арына (16.12.2016, аўд. 427-4).

### *Універсітэцкія вечарыны*

### *Да Міжнароднага дня роднай мовы ”Гучы, роднае слова!..”*






Удзел у арганізацыі і правядзенні ўніверсітэцкай вечарыны, прысвечанай Міжнароднаму дню роднай мовы ”Роднай мовы гук чароўны” (напісанне сцэнарыя, арганізацыя выступленняў беларускіх і замежных навучэнцаў, вакальнага ансамбля выкладчыкаў “Акавіта”. Ад літ. клуба выступілі: Значонак Дар’я, Грузд Вадзім, Ганчарык Дар’я, Ліхтар Марк, Скок Інэса) ( 21.02. 2017).

***Святочная вечарына «Мой родны кут, як ты мне мілы…»,*** якая праводзілася ў рамках рэспубліканскага фестываля творчасці замежных студэнтаў “F.-ART.by” “Моладзь свету: самабытнасць, салідарнасць, супрацоўніцтва” (напісанне сцэнарыя, арганізацыя выступленняў беларускіх і замежных навучэнцаў, вакальнага ансамбля выкладчыкаў “Акавіта”, студэнцкага клуба). Ад літ.клуба выступілі: Варанецкая Алеся, Гушчын Сяргей, Дэгіс Лізавета, Жураўлёва Алена, Канашэвіч Дзіяна, Караленя Карына, Уласенка Дзмітрый, Тарасенка Дзіяна, Філіповіч Вікторыя, Эджума Гай Роберт Дэланей (Камерун), Іслам Мохамед Мазедул (Бангладэш), Ахмед Абдэль Салам Махамед Мостафа (Егіпет), Кавак Неждзет (Турцыя), Актун Керым Алкер (Турцыя), Чэлебі Орхан (Турцыя), Хапі Вака Жуніёр (Камерун), Шумул Мушудул Хасан (Бангладэш), выкладчыкі Міксюк Р. В., Савіцкая Н. Е. Прагучалі вершы і песні на беларускай, рускай, англійскай, арабскай, бенгальскай, іспанскай, кітайскай, турэцкай, французскай мовах. 7.12.2017

***Вечарына “Студэнцкі дэбют”***, кастрычнік 2018 г.

### *“Рождественские встречи”*

Традыцыйна кожны год літаратурны клуб прымае ўдзел ў правядзенні вечарын з замежнымі навучэнцамі “Рождественские встречи”: чыталі вершы Бахед Хайдэр і Хапі Вако Жуніёр (2015, 2016, 22.12.2017) і інш.



***“Нязгасная зорка зямлі беларускай”***, прысвечаны творчасці Максіма Багдановіча (Літаратурна-музычны). Актавая зала інтэрната № 4 (12.12.2018).



***“Паэзіі кахання гук чароўны”***, прысвечаны Дню закаханых. (Літаратурна-музычны). Кабінет літ.клуба, інтэрнат № 5. (13.02.2019)

***Рэспубліканскае мерапрыемства “Ноч бібліятэк”***

6 студэнтаў наведалі бібліятэку БНТУ (21.04).

## *ПАСЯДЖЭННІ ЛІТАРАТУРНАГА КЛУБА “ВЕТЛІЦА”, ПРЫСВЕЧАНЫЯ ДНЮ ЗАКАХАНЫХ*
### *(ПРАВЕДЗЕНЫЯ Ў 2019, 2018 І 2017 ГАДАХ)*

***Пасяджэнні***

*14.02.2017. аўд. 408-а*



*14.02.2018, аўд 408-а*



***«Не аслабеюць рукі-крылы Каханне нашае трымаць»***
***(Святаслаў Філатаў, член літ.клуба "Ветліца").***

Пад такім дэвізам напярэдадні Дня Святога Валянціна – Дня закаханых – 13 лютага 2019 было праведзена пасяджэнне ў кабінеце літаратурнага клуба.







## *Публікацыі*

1. Па выніках III Рэспубліканскага конкурсу літаратурнай творчасці студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі “АВТОГРАФ” у зборніку работ пераможцаў і прызёраў “Эпоха талантливых – диалог времени и творчества” надрукаваны творы 13 членаў клуба. Гэта творы Адамовіч Вольгі, Астапчыка Аляксандра, Вілавай Паліны, Ганчаровай Анастасіі, Казарскай Ліліі, Крукавай Валерыі, Мяняйлавай Таццяны, Страковіч Веранікі, Усовіч Вольгі, Філатава Святаслава, Цітовай Кацярыны, Шаркель Ірыны, Шкурат Аляксандры.

2. У рэспубліканскім зборніку: Першацвет: проза і паэзія маладых / Мінск: Мастацкая літаратура, 2017. – С. 15 – 42, – надрукавана апавяданне Значонак Дар’і “Леся”. Тут надрукаваны творы 10 лепшых маладых беларускіх празаікаў і 10 паэтаў.

3. У часопісе “Маладосць” № 7 за 2018 надрукаваны 2 апавяданні Значонак Дар’і.

## *Рознае*

Праведзена 19 пасяджэнняў літаратурнага клуба, вялікая індывідуальная праца з аўтарамі, студэнтамі-рэдактарамі, карэктарская і рэдактарская праўка тэкстаў, друкаванне многіх матэрыялаў для альманаха, напісанне артыкулаў у альманах, фарматаванне альманаха, вычытванне пасля вёрсткі і інш.

# ПАСЛЯСЛОЎЕ

**Шаноўныя чытачы!**

Спадзяёмся, што Вы прачыталі ўсе творы, змешчаныя ў дзявятым выпуску літаратурна-мастацкага альманаха “AVE”, што гэтыя творы пакінулі па сабе добрае ўражанне, прымусілі задумацца над многімі пытаннямі сённяшняга жыцця, закранулі глыбінныя светлыя струны душы, стварылі творчы настрой, падбавілі аптымізму і веры ў нашу моладзь, паказалі сувязь пакаленняў, пераемнасць традыцый, наладзілі полікультурны дыялог ды і ўвогуле “пазнаёмілі” з даўно знаёмымі калегамі па сумеснай працы, аднакурснікамі.

Зацікаўленым творчасцю клуба просьба звяртацца да Савіцкай Надзеі Яўсееўны, педагога-арганізатара, кабінет клуба знаходзіцца ў пятым інтэрнаце на шостым паверсе (Vel +375 29 606 53 57).

Бягучую інфармацыю пра дзейнасць клуба можна прачытаць на старонцы літаратурнага клуба “Ветліца” на сайце БДТУ www.vetlica.belstu.by. За 22 гады дзейнасці клуба выдадзена 9 альманахаў, у якіх надрукаваны творы соцень студэнтаў і выкладчыкаў, пададзена хроніка асноўных падзей, звязаных са шматграннай дзейнасцю клуба. Альманахі “AVE” можна ўзяць і пачытаць у бібліятэцы БДТУ і Нацыянальнай бібліятэцы, а таксама на сайце БДТУ.

У наступным годзе плануецца выпусціць дзясяты нумар альманаха “AVE”, які будзе прысвечаны 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і 90-годдзю ўніверсітэта, але таксама знойдзецца месца і творам іншай тэматыкі. Пачаўся збор матэрыялаў, калі Вы жадаеце надрукавацца, то неабходна падаць творы ў раздрукаваным выглядзе, фармат А4, і на электронным носьбіце ( на флэшцы). Творы прымаюцца да канца кастрычніка 2019 года.

Шаноўныя будучыя аўтары,звярніце асаблівую ўвагу на ўніверсітэцкую тэму. Напішыце вершы, эсэ, успаміны, замалёўкі, нарысы пра ўніверсітэцкае жыццё, пра студэнтаў, калег, сяброў, адагрупнікаў, выкладчыкаў,пра дысцыпліны, цікавыя падзеі і выпадкі і інш. І такім чынам складзецца своеасаблвы летапіс БДТУ.



*Выступленне «Акавіты» і «Ветліцы» ў бібліятэцы на вул. Пляханава, 2018*



*Надзея Савіцкая – старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі, а з кастрычніка 2018 педагог-арганізатар. У БДТУ працуе з 1976 года. Філолаг па адукацыі, выкладчык беларускай і рускай мовы і літаратуры.*

*Ініцыятар стварэння гімна БДТУ; арганізатар і кіраўнік вакальнага ансамбля выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДТУ "Акавіта"; стваральнік і кіраўнік літаратурнага клуба "Ветліца"; ініцыятар выдання літаратурна-мастацкага альманаха "AVE" (Адраджэнне. Вера. Еднасць.), яго складальнік і адказная за выпуск.*

*Выкладала беларускую і рускую мову і літаратуру на падрыхтоўчым факультэце, беларускую мову студэнтам I курса, спецкурс "Службовы этыкет і справаводства" студэнтам I–V курсаў, методыку выкладання рускай мовы як замежнай замежным студэнтам; рускую мову як замежную на падрыхтоўчым аддзяленнні, магістрантам, на курсах рускай мовы як замежнай  розных узроўняў.*

*У 90-я гады была адным з ініцыятараў стварэння Універсітэта беларускай мовы, гісторыі і культуры для выкладчыкаў БДТУ, дзе выкладала беларускую мову, адказвала за арганізацыйныя пытанні вучэбнага працэсу і методыку выкладання.*

*Працяглы час была праформгам кафедры. Адказвала за развіццё самадзейных талентаў замежных навучэнцаў, была старшынёй культурна-масавай камісіі факультэта ВСіП.*

*Аўтар праектаў «Літаратурна-мастацкі альманах "AVE"», "І песню родную люблю я", "Беларусь и Туркменистан. Грани сотрудничества", "Літаратурны клуб "Ветліца" як сродак творчай свмарэалізацыі студэнтаў".*

*Кіраўнік студэнцкіх навуковых прац, якія атрымалі дыпломы I–III ступені: "Беларуская міфалогія", "Беларуская духоўная паэзія", "Беларуская літаратура Падляшша" і інш.*

*Навуковыя інтарэсы: беларуская мова і літаратура, лексікалогія, тэрміналогія; методыка выкладання рускай мовы як замежнай; полікультурная камунікацыя; экалогія слова; грамадзянска-патрыятычнае, духоўна-маральнае і эстэтычнае выхаванне.*



*Выступленне «Акавіты» і «Ветліцы» ў бібліятэцы
на вул. Пляханава, 2018*

Адраджэнне Вера Еднасць

**ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ АЛЬМАНАХ**

**Выпуск 9**

Дызайн вокладкі *Я. А. Залатар*
Камп'ютарная вёрстка *А. А. Селіванава*

Падпісана да друку 15.04.2019. Фармат $70 \times 108^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Гарнітура Школьная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 23,62. Ул.-выд. арк. 23,71.
Тыраж 100 экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюдніка друкаванай прадукцыі
№ 1/227 ад 20.03.2014.
Вул. Свярдлова, 13а, 220006, г. Мінск.